WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

14 СТУДЗЕНЯ 2010 г.
ЧАЦВЕР
№ 5
(26613)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

НАПРЫКАНЦЫ СНЕЖНЯ БЕЛАРУСЫ «КІНУЛІСЯ» ПА ВАЛЮТУ. ЦЯПЕР — МЯНЯЮЦЬ ЦВЁРДАКАНВЕРСОЎНУЮ НА РУБЛІ

У снежні мінулага года беларусы, як вынікае з апошніх звестак Нацыянальнага банка, істотна менш размясцілі сваіх грашовых сродкаў у банках на валютныя ўклады: прырост апошніх за месяц склаў усяго 7,5 мільёна долараў, ці 0,2 працэнта. Напрыклад, у параўнанні з тым жа папярэднім месяцам, які таксама не вызначаўся значным папаўненнем валютных дэпазітаў, прырост зменшыўся прыкладна на 32 мільёны долараў.

А вось рублёвыя дэпазіты ў снежні папоўніліся амаль на 176 мільярдаў рублёў, павялічыўшыся за месяц на 2,2 працэнта. Гэта значыць, тэндэнцыя, што назіралася з другога паўгоддзя 2009-га, калі насельніцтва пачало аддаваць перавагу рублёвым укладам, захавалася. Зрэшты, тут прыярытэты людзей цалкам зразумелыя: пакуль захоўваюцца высокія працэнтныя стаўкі па дэпазітах у рублях, і ўкладчыкі атрымліваюць істотныя даходы, сітуацыя наўрад ці зменіцца. Улічваючы, што вера беларусаў у нацыянальную валюту на працягу мінулага года была ўзноўлена: у тым жа снежні курс беларускага рубля да кошыка валют практычна не змяняўся, а сёлета яго хістанні зацверджаныя ў межах калідора плюс-мінус 10 працэнтаў. Прычым, запэўніваюць у галоўным банку краіны, у першым квартале гэтага года курс нацыянальнай валюты нават будзе захоўвацца на ўзроўні, блізкім да мінулагодняга снежаньскага.

Разам з тым, што цікава, у канцы снежня беларусы зноў «кінуліся» ў банкі, каб запасціся наяўнай валютай. Гэта пры тым, што пачынаючы з ліпеня прадавалі яе больш, чым куплялі. Так, толькі 31 снежня людзі купілі цвёрдаканверсоўнай на 12,3 мільёна долараў больш, чым прадалі банкам, а чысты попыт на валюту ў папярэдні дзень склаў 7,6 мільёна долараў. Мабыць, напрыканцы года асцярожныя беларусы такім чынам перастрахоўваліся ад магчымай істотнай дэвальвацыі рубля, азіраючыся на леташні вопыт. Аднак, калі стала зразумела, што непрыемных сюрпрызаў чакаць не трэба, сітуацыя кардынальна змянілася: толькі з 1 па 6 студзеня насельніцтва здала ў банкі на 17,7 мільёна долараў больш, чым купіла.

Як зазначыў у гутарцы з карэспандэнтам «Звязды» намеснік начальніка Упраўлення інфармацыі Нацыянальнага банка Міхаіл Журавовіч, прырост дэпазітаў фізічных асобаў у банках летась перавысіў ніжнюю мяжу прагнозу на год і ўшчыльную падабраўся да верхняй: Асноўнымі напрамкамі грашова-крэдытнай палітыкі на 2009 год ён прадугледжваўся ў памеры 4,2 — 5,2 трыльёна рублёў. Фактычна за мінулы год рублёвыя і валютныя ўклады насельніцтва павялічыліся амаль на 4,9 трыльёна рублёў, ці на 36,9 працэнта, і на пачатак студзеня гэтага года дасягнулі 18,15 трыльёна рублёў. Дэпазіты ў нацыянальнай валюце склалі больш за 8 трыльёнаў рублёў, а ў замежнай — звыш 3,5 мільярда долараў ЗША. У разліку на аднаго жыхара краіны за мінулы год збаражэнні, што трымаюць людзі ва ўкладах і ашчадных сертыфікатах, папоўніліся на 537 тысяч 900 рублёў: на 1 студзеня 2010 года на аднаго беларуса прыпадала 1 мільён 939 тысяч 500 рублёў збаражэнняў (у доларавым эквіваленце — 677,48 долара), размешчаных у дэпазітах і сертыфікатах. На пачатак 2009 года адпаведная лічба была роўная 1 мільёну 401 тысячы 600 рублям (637,1 долара).

Паводле слоў Міхаіла Журавовіча, у нашай краіне, у параўнанні з іншымі, створаныя найбольш выгадныя для ўкладчыкаў умовы захавання збаражэнняў у банкаўскай сістэме, асабліва з працяглымі тэрмінамі захоўвання. У прыватнасці, наш суразмоўца згадаў укараненне новых відаў дэпазітаў, якія прадугледжваюць магчымасць датэрміновага зняцця сродкаў з рахункаў без страты працэнтаў, папаўненне ўкладаў, штомесячнае зняцце працэнтаў, налічэнне дадатковага даходу па дасягненні абумоўленага тэрміну.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

Беларускія НПЗ забяспечаны запасамі нафты на два тыдні наперад

Аб гэтым паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў «Белнафтахіме».

Пастаўкі расійскай нафты ў Беларусі працягваюцца ў штатным рэжыме. Беларускімі прадпрыемствамі вядзецца заключэнне новых кантрактаў з расійскімі нафтавымі кампаніямі. «Кантракты заключаліся ўчора і сёння, будуць заключацца і заўтра», — адзначылі ў «Белнафтахіме». У канцэрне падкрэслілі, што запасы нафты на беларускіх нафтаперапрацоўчых заводах не зніжаюцца.

Грамадзяне Беларусі з 2010 года пры продажы аўтамабіля масай больш за 3,5 т абавязаны выплаціць падаходны падатак

Пра гэта паведамілі БЕЛТА ў Міністэрстве па падатках і зборах.

З 1 студзеня 2010 года вызваляецца ад падаходнага падатку толькі даход, атрыманы на працягу каляндарнага года ад продажу аднаго аўтамабіля, тэхнічна дапушчальная агульная маса якога не перавышае 3,5 т, а колькасць месяцаў для сядзення, акрамя месца вадзіцеля, не перавышае васьмі. Гэта, як правіла, легкавыя аўтамабілі.

БЕЛТА.

«Мароз, Беражыся!»

Фота Анатоля КІПІШЧУКА.

У найбліжэйшыя суткі будзе пераважаць воблачнае з прасяненнямі, пераважна без ападкаў надвор'е. У паўднёвых раёнах месцамі галалёд, на асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ноччу складзе 10-16 градусаў марозу, пры прасяненнях — мінус 17-22. Днём чакаецца ад 7 да 12 градусаў ніжэй за нуль.

КАНОПЛІ Ў ВАЗОНАХ

Быхаўская міліцыя выкрыла ў прыватным доме лабараторыю для вырошчвання канапель.

Жыхар раённага цэнтра з дапамогай лямпаў і матэрыялаў, якія адбіваюць цяпло і святло, зрабіў у доме куток для наркатычных раслінаў. Пяць вазонаў з канопляй, якія знайшлі аператыўнікі, далі 1,2 кілаграма жывой масы. Таксама канфіскаваны амаль 40 грамаў гатовай для ўжывання марыхуаны. Гаспадару гэтага багацця — 27 гадоў, ён ужо прыцягваўся да крымінальнай адказнасці.

Алена КАЗЛОВА.

ПРАЗ 5 МЕСЯЦАЎ ПАСЛЯ КАЙФУ...

23-гадовы жыхар Гомеля выкарыстаў падроблены рэцэпт, каб атрымаць у адной з аптэк абласнога цэнтра прэпарат «Трамадол». Сінтэтычны апіоід прымяняецца для абязбольвання. Між іншым, з-за вялікай колькасці людзей, якія «падселі» на яго, ва Украіне гэтае рэчыва ўведзена ў пералік наркатычных і забаронена. Праз пяць месяцаў пасля падачы рэцэпта міліцыя знайшла друкара і прыхільніка цікавых адчуванняў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

ГАЛОЎБУХ АБАКРАЛА СУПРАЦОЎНІКАЎ

Галоўны бухгалтар аднаго з замежных транспартных прадпрыемстваў Брэста прысвоіла больш за $10000 аплаты працы работнікаў, паведаміла оперупаўнаважаны па асоба важных справах ГУБЭЗ МУС Беларусі Вераніка Пасмецьева.

Пасля аператыўнага сігналу аператыўнікі высветлілі, што зарплата работнікам аднаго з прадпрыемстваў Брэста, якое займаецца міжнароднымі грузаперавозкамі, выплачвалася мізэрная, нягледзячы на тое, што прадпрыемства рэнтабельнае і атрымлівае немалы прыбытак. Былы галоўбух павінна была выплачваць штомесяц аванс і зарплату, акрамя гэтага — кампенсацыю за камандзіроўкі. Аднак, атрымліваючы грошы ў банку, яна не выдавала работнікам аванс і камандзіровачныя выдаткі, падрабляла іх подпісы ў ведамасцях і прысвойвала грошы. Работнікі атрымлівалі толькі зарплату. Такім чынам, падазроная, злоўжываючы службовымі паўнамоцтвамі, выкрала амаль $10000. Больш за тое, у аператыўнікаў ёсць падстава лічыць, што аналагічным чынам яна выкрала яшчэ каля $5000. Узбуджана крымінальная справа, падазроная затрыманая, на яе маёмасць накладзены арышт.

ЗБІЎ ПЕШАХОДА І ЎЦЁК

Невядомы кіроўца збіў пешахода ў Капыльскім раёне і збег з месца здарэння, паведамілі ў ДАІ Мінскай вобласці.

ДТЗ адбылося 12 студзеня на 388-м кіламетры дарогі Крычаў—Бабруйск—Івацэвічы. Невядомы кіроўца на аўтамабілі, марка якога таксама невядомая, рухаўся ў кірунку Слуцка і здзейсніў наезд на пешахода 1951 года нараджэння, жыхара Капыльскага раёна, які знаходзіўся на праезнай частцы. Вядома, што пасля наезду на чалавека, які зваліўся ў кювет, аўтамашына затрымалася на заснежанай абочыне. Выехаць самастойна кіроўцу не ўдалося, і ён стаў спыняць аўтамашыны з просьбай аказаць дапамогу. Як адзначылі ў ДАІ, відавочна, у выніку на дапамогу прыйшоў кіроўца нейкага грузавіка. Такім чынам, не аказаўшы дапамогі пацярпеламу, кіроўца з месца здарэння збег, а пешаход памёр. Пацярпелага не маглі заўважыць і тыя, хто дапамагаў буксіраваць машыну, бо раніцай было яшчэ цёмна.

ДАІ Мінскай вобласці просіць усіх, хто мае якую-небудзь інфармацыю аб ДТЗ або стаў сведкам аказання дапамогі буксіроўкай ва ўказаны час на гэтай дарозе, паведаміць пра гэта па тэлефонах 204 71 01, 204 78 11 у Мінску або патэлефанаваць па тэлефоне 102.

БЕЛТА.

Купляй сваё — жыві лепш!

БЕЛАРУСКІЯ ПАКУПНІКІ АД СПАКУСЫ НЕ ЎСТРЫМАЛІСЯ...

...але каб іх завабіць, гандлю давялося злаўчыцца

У 2009 годзе аб'ём рознічнага тавараабароту ў Беларусі склаў каля 55,9 трлн рублёў і павялічыўся ў параўнанні з папярэднім годам на 3 працэнты. Пры гэтым у снежні 2009 года рост тавараабароту склаў 104,7 працэнта, а найбольшыя тэмпы росту былі дасягнутыя ў Мінскай (106,3 працэнта) і Гродзенскай (103,1 працэнта) абласцях.

Як прызналася на сустрэчы з журналістамі **намеснік міністра гандлю Ірына НАРКЕВІЧ,** 2009 год быў для сферы гандлю вельмі нялёгкім: «Не сакрэт, што крывая росту тавараабароту напрамую залежыць ад фінансавых магчымасцяў пакупніка, а паколькі нашы даходы за гэты год не павялічыліся, то гандлёвым арганізацыям давялося задзейнічаць шмат заахвочвальных мерапрыемстваў, каб прывабіць пакупніка: задзейнічаць сакрэты мерчэндайзінгу, наладжваць распродажы тавараў па зніжаных цэнах, праводзіць рэкламныя акцыі і паказы мадэляў адзення, стымуляваць разлікі за пакупкі з выкарыстаннем пластыкавых картак. Чаго хаваць: развіваецца з грашыма на пластыкавай картцы значна прасцей, чым даставаць іх з кашалька, асабліва калі пры такіх разліках табе даецца скідка...»

Самым прыбытковым для гандлю традыцыйна быў апошні месяц года. Прычым у перадсвяточныя дні актыўным попытам у спажыўцоў карысталіся не толькі прадукты для навагоднягa стала, але і мэбля, складаная бытавая тэхніка, адзенне ад беларускіх вытворцаў. Для прыкладу, толькі ёлачных цацак і ўпрыгажэнняў, карнавальных касцюмаў і тавараў з навагодняй тэматыкай было рэалізавана на суму 18,8 млрд рублёў.

Шэраг беларускіх вытворцаў пайшоў на істотнае зніжэнне адпускных цэнаў на асобныя віды сваёй прадукцыі, у тым ліку Мінскі завод гадзіннікаў (на 15 працэнтаў), ААТ «Гарызонт» (на 10 працэнтаў), РУВП «Віцязь» (на 15 працэнтаў), ТАА «Серж» (да 50 працэнтаў), Навагрудская швейная фабрыка (да 15 працэнтаў), ЗАТ «Вяснянка» (да 25 працэнтаў), ААТ «Рэчыцкі тэкстыль» (да 30 працэнтаў), ААТ «Эліз» (на 7 працэнтаў), Пінскі завод штучнай скуры (да 20 працэнтаў), ЗАТ «Сівельга» і ЗП «ЛеГранд» (да 30 працэнтаў). На зніжэнне гандлёвых надбавак (у сярэднім на 15 працэнтаў) пайшлі і многія гандлёвыя арганізацыі: зніжэнне гандлёвых надбавак распаўсюдзілася на беларускія халадзільнікі і пральныя машыны, абутак, швейныя вырабы, веласіпеды, ювелірныя вырабы, асобныя мадэлі мэблі і г.д.

З прадуктаў харчавання найбольшы рост аб'ёмаў продажу назіраўся ў снежні на вінаградныя віны — у 1,8 раза, на піва — у 1,3 раза, кандытарскія вырабы — у 1,3 раза, і на яйкі — у 1,4 раза ў параўнанні з лістападам.

Усяго ў снежні гандлёвымі арганізацыямі і айчыннымі вытворцамі было праведзена больш як 1,5 тысячы рэкламных акцый, што на 50 працэнтаў перавышае аналагічны паказчык папярэдняга года. У перадсвяточны час быў падоўжаны час працы 9,2 тысячы аб'ектаў рознічнага гандлю і грамадскага харчавання. Да таго ж за 2009 год 317 гандлёвых аб'ектаў перайшлі на кругласутачны рэжым працы, таму цяпер па краіне налічваецца ўжо 456 крамаў, якія працуюць кругласутачна.

Асобна Ірына Наркевіч спынілася на Канцэпцыі развіцця рэкламнага рынку ў Рэспубліцы Беларусь да 2014 года, якая была зацверджана беларускім урадам у першыя дні новага года.

— Рэкламная галіна — дастаткова маладая галіна, але яна вельмі імкліва развіваецца. Так, на пачатак 2009 года на рынку рэкламных паслуг у Беларусі дзейнічалі 440 рэкламных арганізацый, а тэмпы росту аб'ёму рэкламных паслуг склалі 125 працэнтаў да ўзроўню папярэдняга года. Рэкламная дзейнасць не падлягае ў нашай краіне ліцэнзаванню, сертыфікацыі, а спецыялістам у галіне рэкламы не трэба праходзіць атэстацыю. Аднак, на маю думку, на рэкламным рынку павінны працаваць прафесіяналы ў сваёй справе, — дадала Ірына Наркевіч. — Новы дакумент якраз скіраваны на павышэнне як якасці, так і эфектыўнасці айчыннай рэкламы, а таксама на стварэнне спрыяльных умоў для развіцця рэкламнага бізнэсу і на стымуляванне прадпрыемстваў і арганізацый да максімальнага выкарыстання рэкламнага рэсурсу.

Канцэпцыя вызначае асноўныя напрамкі развіцця рэкламнага рынку, у прыватнасці, далейшую лібералізацыю ўмоў размяшчэння рэкламы праз спрашчэнне адміністрацыйных працэдур па ўсталяванні рэкламных канструкцый, павышэнне якасці вонкавай рэкламы ўздоўж аўтадарог і ўзмацненне кантролю за яе эстэтычным выкананнем (асабліва ўвага — Мінскай кальцавой аўтадарозе і дарозе ў Нацыянальны аэрапорт), зніжэнне кошту размяшчэння рэкламы для аб'ектаў прыдарожнага сэрвісу, скідкі пры размяшчэнні рэкламы для айчынных вытворцаў, арганізацыю фестываляў рэкламы для павышэння ўзроўню прафесійнага майстэрства работнікаў рэкламных арганізацый.

Ірына Наркевіч падкрэсліла важнасць павелічэння аб'ёмаў і павышэння якасці сацыяльнай рэкламы. Для гэтага плануецца стварыць прававы механізм фінансавання вытворчасці сацыяльнай рэкламы і прыцягнуць да гэтага працэсу вытворцаў алкагольнай прадукцыі, тытунёвых вырабаў, піва і рэкламныя арганізацыі. Задзейнічаць у стварэнні сацыяльных ролікаў плануецца таксама вядомых спартсменаў, акцёраў, музыкантаў, навукоўцаў, каб павысіць значнасць такой рэкламы.

Многія спажыўцы справядліва скардзяцца на празмерна высокі гук у тэлевізійных рэкламных роліках, таму Міністэрства гандлю збіраецца ўшчыльную занятца гэтым пытаннем.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ІНВЕСТАРАЎ ШМАТ НЕ БЫВАЕ

Свае думкі

Надзённыя задачы для Магілёўскага абласнога тэрытарыяльнага фонду дзяржаўнай маёмасці — навядзенне парадку з нерухомасцю, якая не выкарыстоўваецца, і продаж інвестарам акцый прадпрыемстваў, якія належаць дзяржаве. Пра гэта расказвае дырэктар фонду Ірына КУЧЫНСКАЯ.

Фота Ірыны САВОСІНАЙ.

МІЛЬЁНЫ І МІЛЬЯРДЫ

— Людзям заўсёды хочацца ведаць, што прадалі і за якія грошы. Давайце і мы з гэтага пачнём. Якая летась была самая буйная здзелка з нерухомасцю?

— Прададзены Дом быту ў цэнтры Магілёва: гэты ўзор савецкай архітэктуры будзе рэканструяваны ў сучасны адміністрацыйна-гандлёвы цэнтр. Грошы ўжо паступілі ў бюджэт: інвестар заплаціў 4,5 мільярда рублёў.

Астатнія здзелкі вагаліся ад адной базавай велічыні да 600 мільёнаў рублёў. Найбольш з гэтага шэрагу каштавалі вытворчыя памяшканні, якія пуставалі. Месціліся яны прынамсі ў Магілёўскім раёне. Увогуле ў продажы маёмасці задзейнічаны ўсе сельскія раёны, акрамя Клічаўскага. Там летась не адбылося ніводнай здзелкі: аб'екты яшчэ рыхтуюць да продажу.

— А якая была самая буйная здзелка за ўвесь час працы ў абласным фондзе дзяржаўнай маёмасці?

— Гэта быў продаж акцый, якія належалі дзяржаве. Размова ідзе пра ААТ «Дзеднава» ў Бабруйску. Пакет акцый каштаваў 25 мільярдаў рублёў.

Сходы акцыянераў за тым часам былі бурныя: даводзілася актыўна пераконваць, што трэба ратаваць завод. Але і справа каштавала таго. Сёння завод працуе па новых тэхналогіях, а бабруйскае піва ведае ўся Беларусь. Па сутнасці, выратавалі прадпрыемства ад банкруцтва.

Прадпрымальныя людзі, спяшайцеся набываць! Сёлета ў Магілёўскай вобласці мяркуецца завяршыць навядзенне парадку з нерухомасцю, якая не выкарыстоўваецца.

— Падаецца, што апошнім часам мала чутныя некалі вельмі актуальныя для грамадскасці словы — раздзяржаўліванне, прыватызацыя, акцыянаванне. Знік ажыятаж альбо гэтыя працэсы прыпыніліся?

— Не, ідуць. Урад паставіў задачу — сёлета максімальна акцыянаваць усе прадпрыемствы, якія падлягаюць раздзяржаўліванню. Гэта шмат: у нашым рэгіёне больш за 150. Спачатку будуць створаны акцыянерныя таварыствы, а потым акцыі дзяржавы прададзены. На гэта і разлік — прыцягнуць на прадпрыемствы сродкі інвестараў.

— Ці складаюцца з патэнцыяльных інвестараў і пакупнікоў чэргі ў вашай прыёмнай?

— Не чэргі, але зацікаўленых людзей шмат. Многія чакаюць зніжэння коштаў: заканадаўства гэта дазваляе і мы выкарыстоўваем такую магчымасць. Але пры ўсім гэтым болей за 170 аб'ектаў нерухомасці мы летась прадалі. Большасць інвестараў — нашы айчынныя, за ўвесь год толькі дзве здзелкі з расіянамі.

Вялікую колькасць аб'ектаў прадалі ў снежні, бо менавіта на канец года прыходзіцца пік актыўнасці пакупнікоў. На працягу года працэс ішоў вяла, але аўкцыёны пад Новы год далі плён.

— Відаць, і інвестары ў святы гатовы траціць грошы?

— Так, кінуць лішнія капіталы ў патрэбным кірунку.

— Але крызіс усё ж адбіўся на вашай працы?

— Так. Трэба прызнаць: болей за палову аб'ектаў прададзены ўсё ж за 1 базавую велічыню. Але, тым не менш, пры плане 12 мільярдаў рублёў болей за 10 мільярдаў ад продажу і арэнды нерухомасці бюджэт атрымаў.

БУДЫНАК ЗА 35 ТЫСЯЧ

— На вашым інтэрнэт-сайце ёсць паведамленне пра тое, што сёлета на продаж будзе выстаўлены паўтысячы аб'ектаў нерухомасці.

— Так, яшчэ багата будынкаў, якія не ўцягнуты ў гаспадарчы абарот. Праўда, у Магілёве і Бабруйску пасля 18 гадоў прыватызацыі ўжо не засталося буйных аб'ектаў. Бадай што толькі Дом культуры, які калісьці належаў заводу штучнага валакна імя Куйбышава. Шмат інвестараў хацела з ім пазнаёміцца, але ніхто не вырашыўся яго набыць.

Цяпер націск — на раёны, дзе па патрабаванні ўрада і Прэзідэнта павярнуліся да гэтага працэсу. За апошнія 3 гады мы ўцягнулі ў гаспадарчы абарот амаль 3 тысячы аб'ектаў. Такога раней ніколі не было.

Дарэчы, сёлета дзве сотні аб'ектаў нерухомасці будуць прапанаваныя за 1 базавую велічыню.

СТАР. 2

Ад чаго будзе залежаць «сцэнарый» эпідэміі грыпу?

На сённяшні дзень эпідсітуацыя з прастуднымі захворваннямі, якая складваецца ў Беларусі, не выклікае ў медыкаў трывогі. Як паведамляе прэс-служба Міністэрства аховы здароўя, захваральнасць насельніцтва на грып і ВРВІ знаходзіцца на неэпідэмічным узроўні. Праўда, трэба мець на ўвазе тое, што ў навагоднія святы і школьныя канікулы колькасць зваротаў у медыцынскія ўстановы традыцыйна зніжаецца. Так, за тыдзень з 4 па 10 студзеня захваральнасць была на 6,8 працэнта ніжэйшая ў параўнанні з папярэднім тыднем.

Калі распачнецца чарговы пад'ём захваральнасці на грып і ВРВІ, эпідэміёлагі прагназаваць не адважваюцца.

Сталічныя эпідэміёлагі вырашылі даследаваць імунны статус мінчан, каб вызначыць праслойку гараджан, у якіх выпрацаваўся імунітэт да цыркулюючых вірусаў грыпу, у тым ліку і да пандэмічнага вірусу A/H1N1. У грамадзян, якія ўжо перахварэлі на ВРВІ і грып або хварэюць зараз, выбарачна бярэцца кроў на аналіз. З дапамогай спецыяльных тэст-сістэм будзе вызначана наяўнасць у крыві чалавека антыцелаў да вірусаў грыпу. Адной з адметнасцяў першай грыпознай хвалі стала адносна невялікая колькасць сярод захваральных дзяцей і падлеткаў, асабліва дзяцей школьнага ўзросту, хоць звычайна менавіта гэты кантынгент самы ўразлівы да прастудных захворванняў. Эпідэміёлагі не сумняваюцца, што свой плён прынеслі дадатковыя школьныя канікулы, якія медыкі «падаравалі» юным мінчанам у самы разгар эпідэміі.

Другая адметнасць — даволі вялікая колькасць захворванняў мінчан на пнеўманію (да 8 працэнтаў ад агульнай колькасці захваральных на грып) і высокая патрэба ў шпіталізацыі хворых у стацыянары. Ёсць меркаванне, што чарговая хваля прастудных захворванняў можа быць больш слабай па інтэнсіўнасці, аднак больш працяглай. Звычайна эпідэміі доўжацца ў сталіцы да 6—8 тыдняў. А на грып у гэтым эпідсезоне рызыкуе захварэць кожны пяты мінчанін.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Спорт-тайм

Вікторыя Азаранка тройчы перамагла ў Сіднэі

Самая вядомая беларуская тэнісістка выступае зараз на турніры ў Аўстраліі, прызавы фонд якога складае 600 тысяч долараў. Учора ў чвэрцьфінальным паядынку Вікторыя перайграла славачку Дамініку Цыбулкаву — 2:6, 6:2, 7:5. У паўфінале беларуска сустрэнецца з расіянкай Аленай Дзяменцьевай.

Да гэтага наша суайчынніца перайграла амбіцыйную немку Сабін Лісіцкі (22-я ў рэйтынгу) і 39-гадовую японку Датэ Крум. Турнір у Сіднэі скончыцца 15 студзеня. А праз тыдзень стартуе Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі па тэнісе, дзе адной з фаварытак і будзе 7-я ракетка свету Вікторыя Азаранка — такое меркаванне выказаў вядомы расійскі тэнісіст Андрэй Часнакоў. Трэба адзначыць, што ў пачатку сезона беларуска змяніла трэнера, дакладней «абмянялася» з расіянкай Верай Звонаровай. Цяпер нашу суайчынніцу трэніруе Сэм Сюмік. Сезон Азаранка пачала з турніру ў Ганконгу, дзе выступалі каманды Еўропы, Расіі, Азіі і Амерыкі. Вікторыя гуляла за каманду Еўропы і ў першым матчы перамагла аргенцінку Гізэлу Дулко. Далей з-за праблем са здароўем беларуска выступіць не змагла. Будзем спадзявацца, што яны засталіся ў мінулым, і хварэць за тэнісістку.

Алена КРАВЕЦ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ПОЛЬСКІЯ АХВЯРЫ НАЦЫЗМУ ЗАПАТРАБАВАЛІ КАМПЕНСАЦЫЮ АД НЯМЕЦКАЙ ЧЫГУНКІ

Прадстаўнікі аб'яднання польскіх ахвяраў нацыянал-сацыялізму запатрабавалі ад найбуйнейшага чыгуначнага канцэрна ФРГ Deutsche Bahn кампенсацыю ў рахунак прыбытку, які яго папярэднік Deutsche Reichsbahn атрымаў падчас Другой сусветнай вайны за перавозку вязняў канцлагераў, паведамляе DW-WORLD.

Адзначаецца, што падставай запатрабаваць кампенсацыю стаў намер Нямецкай чыгункі пачаць пасажырскія перавозкі ў Польшчы. «Канцэрн Deutsche Bahn хоча зарабляць у нас грошы, але ён ужо вельмі шмат зарабіў падчас акупацыі Польшчы», — заявіў старшыня аб'яднання польскіх ахвяраў нацыянал-сацыялізму Станіслаў Залеўскі.

Таксама ён адзначыў, што разлічвае не на буйныя кампенсацыі, а, хутчэй, на гуманітарную дапамогу: «грошы на лекі, медыцынскае абслугоўванне або ацяпленне».

УКРАІНСКІЯ ВЫБАРШЧЫКІ ВЫСТАВІЛІ СВАЕ ГАЛАСЫ НА ПРОДАЖ

Напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў украінскія выбаршчыкі пачалі выстаўляць свае галасы на продаж. За некалькі дзён да старту першага тура галасавання ў Сецівае з'явіўся сайт, дзе любы ахвотны жыхар краіны можа афарміць заяўку на продаж свайго голасу.

Паводле інфармацыі рэсурсу, сярэдні кошт аднаго голасу складае 862 грыўні (крыху больш за сто долараў).

Украінцы, якія выставілі свае галасы на продаж, тлумачаць сваё рашэнне адсутнасцю цікавасці да ходу і вынікаў прэзідэнцкіх выбараў. «У палітыкаў даўно ўсё схоплена. Не разумна не браць з іх прыклад і самім не зарабляць. Думаю, 300—400 грыўняў за адзін голас заплацяць», — цытуе TCH.ua аднаго з аўтараў падобнай аб'явы, нейкага Івана з Львова.

Аналітыкі адзначаюць, што ў дзень выбараў 17 студзеня, а таксама незадоўга да пачатку другога тура попыт на галасы ўкраінскіх выбаршчыкаў значна ўзрасце.

У МУС Украіны паведамілі, што бакі дзейнічаюць па наступнай схеме: выбаршчык, які прадаў свой голас, ідзе на ўчастак і ставіць у атрыманым бюлетэні «галачку» за кандыдата, якому аддае перавагу пакупнік. Пасля гэтага прадавец фатаграфуе свой бюлетэнь, адсылае здымак пакупніку і прыходзіць па грошы. У гутарцы з газетай «Ведамасці» дырэктар Кіеўскага інстытута глабальных стратэгій Вадзім Карасёў выказаў меркаванне, што за арганізацыяй продажу галасоў, хутчэй за ўсё, стаіць адзін з кандыдатаў на пасаду прэзідэнта Украіны. ЦВК сітуацыю з продажам галасоў выбаршчыкаў не пракаментавала.

ЗЕМЛЯТРУС СІЛАЙ 7 БАЛАЎ НА ГАІЦІ: ТЫСЯЧЫ ЛЮДЗЕЙ ПАД ЗАВАЛАМІ

Учора марадзёры пачалі рабаваць пацярпелыя ад землятрусу крамы ў сталіцы Гаіці Порт-а-Прэнсе, паведамляе AFP са спасылкай на ўласнага карэспандэнта на месцы падзей.

Эпіцэнтр землятрусу магнітудай 7 балаў быў зафіксаваны за 16 кіламетраў да паўднёвага захаду ад Порт-а-Прэнса. Пасля асноўнага падземнага штуршка, зафіксаванага ў аўторак каля 17.00 па мясцовым часе, на працягу трох гадзін адбылося яшчэ каля 20 паўторных землятрусаў, магнітуда якіх перавышала 5 балаў. Афіцыйных звестак аб колькасці загінулых і пацярпелых няма, аднак мясцовыя ўлады чакаюць вялікай колькасці ахвяраў землятрусу, які ў СМІ ўжо назвалі наймацнейшым для рэгіёна за апошнія 200 гадоў і самым разбуральным у гісторыі Гаіці. Відавочцы паведамляюць аб целах загінулых, якія ляжаць на вуліцах.

Пра маштаб разбурэнняў паступаюць абрывачныя звесткі. Вядома, што ў Порт-а-Прэнсе разбураны шпіталь, будынак міратворчай місіі ААН і мноства іншых дамоў. Вядома таксама аб разбурэнні прэзідэнцкага палаца, аднак сам прэзідэнт Рэнэ Прэваль і яго жонка не пацярпелі.

У сувязі з моцным землятрусам на Гаіці, якое прывяло да шматлікіх чалавечых ахвяраў, кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста выказаў спачуванні прэзідэнту Рэспублікі Гаіці Рэнэ Гарсія Прэвалю, а таксама родным і блізкім загінулых.

ЯРУЗЭЛЬСКАМУ ЎДВАЯ ЗРЭЗАЛІ ПЕНСІЮ

У студзені гэтага года генерал Войцэх Ярузэльскі атрымаў пенсію амаль у два разы меншую, чым у снежні 2009 года. Пра гэта, як перадае ІТАР-ТАСС, паведаміў прадстаўнік міністэрства нацыянальнай абароны Польшчы палкоўнік Веслаў Гжэгажэўскі.

Пенсія генерала Ярузэльскага была зменшаная з 8,5 тыс. злотых (звыш 2,8 тыс. долараў) да 4,5 тыс. злотых (каля 1,6 тыс. долараў) з 1 студзеня. Гэта звязана з тым, што ў новым годзе ўвайшоў у сілу закон аб адмене прывілеяў для супрацоўнікаў былых спецслужбаў сацыялістычнай Польшчы і афіцэраў, якія служылі на камандных пасадах ва ўзброеных сілах Польскай Народнай Рэспублікі. Адначасова прыкладна на 500 злотых (170 долараў) былі зменшаныя месячныя пенсіі для 24 тыс. адстаўных афіцэраў Войска Польскага, якія трапілі пад дзеянне новага закона.

Раней Войцэх Ярузэльскі заяўляў, што ў выпадку, калі міністэрства абароны панізіць яго генеральскую пенсію, ён скарыстаецца сваім правам атрымліваць пенсію як былы прэзідэнт Польшчы, чаго ён дагэтуль не рабіў.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.01.2010 г. (для б/н разлікаў)

▲ 1 долар ЗША	2 841,00
▼ 1 еўра	4 115,55
1 латвійскі лат	5 800,92
1 літоўскі літ	1 192,09
1 чэшская крона	157,36
1 польскі злоты	1012,92
▼ 1 расійскі рубель	95,85
1 украінская грыўня	349,27

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	29,6409
UAH	36,4407
1000 BYR	10,4627
EUR	42,9497

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2010 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

Тэмп росту вытворчасці прамысловай прадукцыі ў Беларусі ў 2009 годзе склаў 97,2 працэнта

Аб выніках работы эканомікі Беларусі ў 2009 годзе Прэзідэнту краіны Аляксандру Лукашэнку 12 студзеня далажыў прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі.

Па выніках 2009 года тэмп росту валавога ўнутранага прадукту склаў 100,2 працэнта. Урад вырашыў усе пытанні з улікам дзеяння антыкрызіснай праграмы, поўнасцю апраўдала сябе прынятая сістэма мераў, і ўзровень ВУП выйшаў на паказчыкі дакрызіснага года. Як адзначыў Сяргей Сідорскі, гэта вынік работы ўсёй эканомікі.

Перапрацоўчая галіна эканомікі, прадпрыемствы «Белнафтахіма» і «Белдзяржхарчпрама» ва ўмовах мінулага года павялічылі паказчыкі работы. Найбольш складаны сектар эканомікі — прадпрыемствы Мінпрама, якія спрацавалі на ўзроўні 77,3 працэнта да 2008 года. У цэлым у прамысловасці ўдалося знізіць астаткі гатовай прадукцыі з максімальных 95 працэнтаў у сярэдзіне года да 68 працэнтаў на 1 студзеня 2010 года. Як падкрэсліў прэм'ер-міністр, ёсць усе магчымасці для таго, каб у гэтым годзе дабіцца значнага паляпшэння гэтага паказчыка.

Важным фактарам з'яўляецца тое, што ў прамысловасці дасягнута рэнтабельнасць у 10 працэнтаў, пры гэтым энергаёмістасць ВУП зніжана амаль на 6 працэнтаў да ўзроўню 2008 года.

Найбольш паспяхова працавала сельскагаспадарчая вытворчасць, якая дэманстравала на працягу ўсяго года даволі высокія тэмпы эканамічнага развіцця: тэмп росту вытворчасці сельгаспрадукцыі склаў 101,3 працэнта. Значна павялічыўся экспарт, пры гэтым, акрамя традыцыйных рынкаў, сельскагаспадарчая прадукцыя актыўна пастаўлялася ў краіны Лацінскай Амерыкі, Паўднёва-Усходняй Азіі, Блізкага Усходу.

Выканана ў 2009 годзе праграма будаўніцтва. У эксплуатацыю ўведзена каля 6 млн кв.м жылля.

У няпростых эканамічных умовах удалося прыняць дастатковыя меры, каб збалансаваць экспартна-імпартныя аперацыі. Аб'ём экспарту ў 2009 годзе склаў больш як 60 працэнтаў да ўзроўню 2008 года. Прыкладзены максімальныя намаганні, каб мінімізаваць расходы на імпарт на працягу года. Выкананы ўсе паказчыкі сацыяльнай сферы: у поўным аб'ёме ажыццяўляліся выплаты пенсій, стыпендый і сацыяльных дапамог, прафінансаваны ўсе дзяржаўныя праграмы. Выкананы бюджэт мінулага года.

Важнай задачай на 2010 год застаецца захаванне высокіх тэмпаў эканамічнага развіцця. Урад сумесна з Нацыянальным банкам прыняў праграму, у якой прапісаны не толькі макраэканамічныя, але і паказчыкі развіцця кожнага прадпрыемства, а таксама інвестыцыйны складнік.

Кіраўніку дзяржавы было даложана аб прыцягненні інвестыцыйных рэсурсаў у краіну, у 2010 годзе іх плануецца значна павялічыць. У снежні мінулага года ўрад падпісаў рамачнае пагадненне з Эксімбанкам Кітая, якое дае магчымасць Беларусі ў 2010 годзе выйсці на максімальны ўзровень інвестыцыйнага супрацоўніцтва з гэтай краінай. Аб'ём плануемых кітайскіх інвестыцый складзе $5,7 млрд.

Прэзідэнт чарговы раз нагадаў пра неабходнасць асваювання новых, нетрадыцыйных рынкаў збыту беларускай прадукцыі, што дасць магчымасць эканоміцы краіны актыўна развівацца. Ужо цяпер ідзе актыўная работа на лацінаамерыканскім рынку, разглядаецца магчымасць выхаду на афрыканскі рынак.

Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Іва Ёсіпавіча з выбраннем Прэзідэнтам Харватыі

Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што Беларусь і Харватыя маюць вялікі патэнцыял для далейшага пашырэння ўсебаковага ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва на карысць народаў дзвюх краін.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Ва Урадзе

2010 — 175,3 ТЫСЯЧЫ НОВЫХ ПРАЦОЎНЫХ МЕСЦАЎ

ПРАЕКТ плана мерапрыемстваў па выкананні дзяржаўнай праграмы занятасці на гэты год дапрацаваны Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны сумесна з зацікаўленымі ўстановамі, паведаміла на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў Беларусі, якое прайшло пад старшынствам прэм'ер-міністра Сяргея Сідорскага, міністр Марыяна Шчоткіна. У выніку праведзенага аналізу сітуацыі ў сферы занятасці насельніцтва ў рэгіянальным разрэзе колькасць малых гарадоў, якія ўключаныя ў праект, павялічана з 11 да 25. Акрамя таго, у праграму ўключана дадаткова 9 раёнаў, што маюць праблемы ў сферы занятасці.

Улічвалася наяўнасць напружанасці на рынку працы, якая перавышае агульнаабласную, узровень зарплаты, наяўнасць і характар вакансій, дынаміка ўзроўню беспрацоўя на працягу трох гадоў. Марыяна Шчоткіна адзначыла, што ў праграме вызначана максімальна напружанае заданне па стварэнні працоўных месцаў. У цэлым па краіне яно павялічана да 175,3 тысячы, у тым ліку рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання запланавана стварыць 7 215 працоўных месцаў. Паводле звестак міністра, у малых гарадах неабходна стварыць 25,5 тысячы працоўных месцаў, у сельскай мясцовасці — 17,5 тысячы. Каб забяспечыць занятасць жыхароў малых гарадоў, сёлета прадугледжваецца, напрыклад, пасадзейнічаць у працаўладкаванні 31,1 тысячы беспрацоўных, арганізаваць аплатныя грамадскія работы для 20,6 тысячы беспрацоўных. Рэалізацыя падобных захадаў дазволіць утрымаць беспрацоўе ў малых гарадах краіны ў межах 1 працэнта, па Мінскай вобласці — 0,8 працэнта, як гэта і прадугледжана ўказам кіраўніка краіны па праграме развіцця малых гарадоў.

Як зазначыла Марыяна Шчоткіна, Міністэрства працы і сацыяльнай абароны будзе працягваць манітарынг выкарыстання працоўнага часу на вытворчасці. Да 1 лютага будзе ўдакладнены пералік арганізацый, якія маюць страты працоўнага часу, а таксама тых, што маюць цяжкасці з выхадам на бясстратную працу.

Прыгадаўшы, што гэты год — год якасці, Марыяна Шчоткіна мяркуе, што ў сувязі з гэтым акцэнт павінен быць зроблены не столькі на захаванні занятасці на прадпрыемствах, якія неэфектыўна працуюць, колькі на іх мадэрнізацыі, перападрыхтоўцы работнікаў і стварэнні альтэрнатыўных працоўных месцаў. Заданне па арганізацыі аплатных грамадскіх работ, у тым ліку для грамадзян, якія знаходзяцца ў вымушаных адпачынках па ініцыятыве наймальнікаў без захавання зарплаты, павялічана да 90,5 тысячы чалавек, у тым ліку для беспрацоўных — да 49,2 тысячы чалавек. Запланавана пасадзейнічаць 2850 беспрацоўным у арганізацыі прадпрымальніцкай дзейнасці.

На рэалізацыю праграм занятасці насельніцтва плануецца накіраваць 154 мільярды рублёў без уліку ўласных сродкаў наймальнікаў. Прычым, як падкрэсліла Марыяна Шчоткіна, кантроль за рацыянальным выкарыстаннем фінансавых рэсурсаў будзе жорсткім, да таго ж асабліва ўвага будзе надавацца вяртанню раней выдадзеных бюджэтных пазык і скарачэнню запазычанасці.

У міністэрстве ўпэўненыя, што рэалізацыя намечаных падыходаў дазволіць забяспечыць выкананне прагнозных паказчыкаў па ўзроўні беспрацоўя да канца года — 1,2-1,5 працэнта, а колькасць занятых у эканоміцы павінна скласці 4740 тысяч чалавек. Марыяна Шчоткіна таксама паведаміла, што плануецца павысіць памеры дапамог па беспрацоўі і стыпендый на перападрыхтоўку грамадзян.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

«КАРДЫНАЛЕ, НЕ...»

— СКАЗАЎ КСЁНДЗ ЮЗАФ БУЛЬКА КАРДЫНАЛУ КАЗІМІРУ СВЁНТАКУ НЕЗАДОЎГА ДА СМЕРЦІ

Паважаны калега Уладзімір Багданаў, з якім мы ехалі разам у Мосар на пахаванне ксяндза Юзафа Булькі, згадаў у дарозе сваю размову са святаром у 2004 годзе. Тады адзначалася 490-годдзе Мосара, і Булька паставіў пры касцёле памятны крыж. Спадар Уладзімір запытаўся ў святара, што той мяркуе зрабіць да 500-годдзя Мосара. І Булька адказаў:

— Да 500-годдзя Мосара я буду ляжаць вось у гэтым куточку, — паказаўшы на вугал пры касцельнай агароджы, пад сценамі Вострабрамскай капліцы.

Так і сталася — першае, што мы пабачылі ля касцёла — магільную яму, засланую ўнізе ялінкамі, а па баках абцягнутую белай тканінай. У касцёле людзі стаялі нават на хорах. Не сказаць, што людзей было зусім ужо шмат — бажніца змясціла ўсіх, на вуліцы не чакалі. Аднак для мяне было шчырасцю, што адпраўляць імшу прыехаў за 500 кілометраў з Пінска сам кардынал Казімір Свёнтак — асоба, найбольш паважаная і аўтарытэтная ў беларускім касцёле. У кастрычніку «Звязда» віншавала кардынала з 95-годдзем. Гэта чалавек, які ўсё жыццё аддана служыў Госпаду і веру якога не пахіснулі нават 10 гадоў у сталінскіх лагерах, якія ён правёў там за гэтую самую веру. Быў таксама шаноўны мітрапаліт Тадэвуш Кандрусевіч — цяперашні галава беларускага касцёла. Мітрапаліт прамаўляў вельмі эмацыйна — святар не хаваў слёз і горычы, якая перапаўняла яго пры труне ксяндза Булькі.

Кардынал казаў ціха. Усіх кранула ягоная асабістая згадка: апошні раз яны бачыліся з Булькам усяго некалькі месяцаў таму, бо добра сябравалі, і кардынал прыехаў у госці. Я хачу прывесці частку кардыналавай казані на развітальнай імшы.

— Мы размаўлялі доўга, і ксёндз Юзаф дзяліўся радасцю зробленай справы — святарскай, духоўнай. А ў вачах — бляск радасці, весялосці, унясення... Я не стамляўся здзіўляцца: як можа адзін чалавек столькі зрабіць?! І гэта ў радасці, не з прымусу, не за выгоды. Ён аддаў сябе без рэшты. І Богу, і касцёлу, і людзям... Мы размаўлялі, ён паказаў мне зробленае тут, у Мосары, а потым мы селі на машыну, і ксёндз паказаў мне ўсе мясціны, дзе нешта зрабіў. І гэта не было выхваленне. Не! Ён дзяліўся радасцю, што пашырылася хвала Божая. Там зроблена, там дароблена, гэта папраўлена, гэта адноўлена, гэта збудавана. Ён вельмі здзівіў мяне, я схіліў галаву. І так мне захацелася — я ўзяў яго за руку, каб яго руку пацалаваць. Не даў. «Кардынале, не. На ўсё згодны з рук кардынала, але гэта — прашу прабачыць — не». Згадзіўся, бо бачыў ягоныя матывы, надзвычай шляхетныя, прыўкрасныя, цудоўныя. Развіваліся мы. І я заўважыў у ягоных вачах, што ён развіваўся неяк... Можа, адчуваў, што гэтае спатканне — з тым, з якім пражыў разам 16 гадоў як святар са святаром — апошняе...

Дарагі ксёндзу пралаце. Хацеў бы, калі мне гэта вольна, падзякаваць за ўсё, што ты зрабіў. У табе я пабачыў гэтую моц Божую, гарт духа — і гэта давала табе сілы наперакор хваробе, насуперак пераследу, насуперак цяжкасцям... Ты ствараў... Дзень і ноч.

Дарагі ксёндзу пралаце... Няхай мне будзе вольна, не толькі ў імя прысутных, але ў імя ўсіх, да якіх дайшло тваё імя, а з тым імем твая справа, падзякаваць за тваю працу святарскую, за ўсё, што зрабіў для людзей. Для іх душаў і для іх справаў. І мяркую, што зараз можаш ляжаць спакойна. Бо зрабіў напраўду цуд. Заслужыў тое, каб адпачыць. Адпачыць вечна. Бо на зямлі ты не меў ані хвіліны спакою. А цяпер адпачывай, ойча. Адпачывай, пралаце. Адпачывай, святару.

І яшчэ адно. Прабач нам. Не толькі нам. Але і тым — і зблізка, і здалёку, якія ў той ці іншы спосаб рабілі табе прыкрасць, даканаліі несправядлівасцю, пакрыўдзілі цябе. Даруй ім гэтую злосць і нікчэмнасць людскую. Ты заўжды выбачаў усім. Тым больш цяпер. Прабач нам усім, якія рабілі табе злосць. Прабач і мне, калі часам троху, можа, так ці іначай неўласціва зрабіў. Нас яднаў Бог, блізкае яднанне духоўнае, святарскае. Я спадзяюся на тваё разуменне. А зараз адпачывай у хвале Божай навекі, і хай гэта будзе тая зямля, якой ты аддаў сябе, сваё цела, хай яна будзе лёгкаю, матчынай, не мачахавай. На тым развітаюся з табой.

...Я шчыра зычу новаму пробашчу мосарскага касцёла, ксяндзу Уладзіміру, захоўваць і памнажаць той цуд, які стварыў у Мосары ксёндз Юзаф Булька.

Глеб ЛАБАДЗЕНКА.

ІНВЕСТАРАЎ ШМАТ НЕ БЫВАЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Гэта папулярная здзелка? Даводзілася назіраць, як прадпрымальнікі літаральна з руінаў падымалі сваю справу.

— За гэтую сімвалічную суму будынкі прадавалі ў асноўным у раённых цэнтрах і невялікіх паселішчах. Можа, і раней трэба было пачаць гэта. Людзі актыўна аднаўляюць аб'екты, якія не выкарыстоўваліся гадамі, разбураліся, трухлявелі. Цяпер жа яны задзейнічаны. Больш за 400 працоўных месцаў створаны на іх аснове.

— А вы сочыце за эфектыўнасцю выкарыстання прададзенай маёмасці?

— Мы вядзём маніторынг выканання ўмоў дагавораў па куплі-продажы. Гэта, можа, і не зусім наша праца, але мы ўзялі ініцыятыву ў свае рукі. Выканаўчая ўлада на месцах адсочвае, а мы аналізуем інфармацыю. А ўмовы ў дагаворах такія: аднаўленне будынка, ажыццяўленне прадпрымальніцкай дзейнасці, стварэнне новых працоўных месцаў.

— А калі гэтыя ўмовы не будуць выкананы?

— Ёсць адказнасць: вялікія штрафныя санкцыі. Яны прыблізна роўныя ацэначнаму кошту будынка — гэта можа быць некалькі соцень мільёнаў рублёў. Пры гэтым будынак набыты за 35 тысяч рублёў.

— Такіх выпадкаў у Магілёўскай вобласці не было?

— Не. Усе ж разумеюць, што яны падпісваюць. Хоць, зразумела, рэканструкцыя — гэта складаная і доўгая справа, патрабуецца праект і шмат сродкаў. Карацей, працэс доўгі, але гэта лепей, чым руйнаваць будынак.

— Хоць, напэўна, ёсць і такія аб'екты, якія лягчэй зруйнаваць? Я нядаўна чула, што адзін біятлонны стадыён у Еўропе, не такі ўжо трухлявы, збіраюцца цалкам зруйнаваць, і на яго месцы пабудаваць новы і самы сучасны.

— На жаль, у нас шмат аб'ектаў, якія падлягаюць ліквідацыі ў сувязі з непрыдатнасцю. Іх многа, і на руйнаванне патрабуюцца вялікія сродкі. Калі будынак вышэй за два паверхі — рыхтуй праект на знос, грошай каштуе разборка і ўтылізацыя. Гэта працаёміста і дорага, але працэс ідзе. У ліквідацыі аб'ектаў дапамагае і рэспубліканскі бюджэт. Так што наводзім парадак на зямлі і ў гэтым плане.

АЎКЦЫЁНЫ ЯК У КІНО

— А што з маёмасцю былых ваенных гарадкоў? Цяпер, падаецца, яны ўсе запоўненыя прадпрымальнымі людзьмі. Напрыклад, у Быхаве.

— Не, там яшчэ хапае месца і будынкаў на продаж. Леташняя праграма ў вобласці выканана: болей за 340 аб'ектаў мы ўцягнулі ў гаспадарчы абарот, 135 спісалі. Сёлета выстаўляем на продаж усё, што засталося.

Напрыклад, на тэрыторыі былога ваеннага гарадка ў Магілёве будзе будавацца жылы мікрараён: там нешта пойдзе пад ліквідацыю, нешта пад продаж. Будуць прадавацца і аб'екты гісторыка-культурнай каштоўнасці, якія там ёсць.

— Усё прадаецца з аўкцыёнаў, ці не так? Раскажыце, як яны праходзяць.

— Праз аўкцыёны прадаюцца і акцыі, і будынкі. Гэта працэдура апісана ў нарматыўных дакументах. Уся інфармацыя пра аўкцыён выкладаецца ў СМІ. Наш аддзел дапускае да аўкцыёну ўдзельнікаў, за працэсам сочыць аўтарытэтная камісія.

У зале збіраюцца ўдзельнікі, і аўкцыяніст абвяшчае пачатковы кошт аб'екта, які прадаецца. Хто хоча набыць — падымае нумар. Аўкцыяніст называе крок, ад 5 да 15 % вышэй за пачатковы кошт. Калі з сумай пагаджаюцца 2 і болей удзельнікі, ідзе далейшае павышэнне. Пакуль не застанецца толькі 1 нумар. Тады тройчы грукае малаток — і ўсё!

— А хто прайграў — расстройваюцца?

— Часам і так. У нас здараюцца такія бурныя аўкцыёны, дзе 4-5 актыўных удзельнікаў змагаюцца і часам разганяюць кошт да вышыняў. Напрыклад, у Шклове была мэблевая фабрыка, якая на момант аўкцыёну ўжо не працавала гадоў пяць. Мы яе прадавалі за базавую велічыню, але купілі інвестары амаль за 400 мільёнаў рублёў. Тры ўдзельнікі таргоў вельмі хацелі атрымаць фабрыку ва ўласнасць. Цяпер там людзі працуюць на швейнай вытворчасці, а нам заплацілі грошы ў бюджэт.

— Ці так жа добра прадаюцца аб'екты прыдарожнага сэрвісу, на якія звяртаюць увагу?

— Мы працуем над даручэннем урада навесці там парадак і спраўляемся. Нам удалося ўцягнуць у гаспадарчы абарот 37 аб'ектаў абапал аўтамабільных дарог вобласці. Яны прададзены і там працуюць: арганізаваны аўтасэрвіс, гандаль і грамадскае харчаванне, нават мэблевая вытворчасць у адной сталоўцы.

Засталіся 9 аб'ектаў, некалькі з якіх давядзецца ўжо руйнаваць. Адзін з самых значных аб'ектаў — былы сэрвісны цэнтр абслугоўвання ў вёсцы Звянчанка Клімавіцкага раёна, на беларуска-расійскім памежжы. Аднак каштуе ён шмат — каля 1,5 мільярда рублёў. Выдатказваць у глыбінцы такія грошы наўрад ці хто рызыкне, таму мяркуем панізіць кошт напалову. Тут сапраўды патрэбен гаспадар.

РУКА ДАПАМОГІ ІНВЕСТАРУ

— У дэтэктыўных кнігах звычайна асноўная інтрыга развіваецца якраз вакол акцый альбо нерухомасці. А ў рэальнасці?

— Абсалютна не. Гэта спакойная праца, з дакладным механізмам, рытмам, сістэмай. Ніякіх шуміх і інтрыг у нас няма, у нас яны не прыжываюцца.

— Ірына Сяргееўна, а дзве вы атрымалі адукацыю, а таксама і цвёрдасць характару, каб трымаць у руках усю дзяржаўную маёмасць рэгіёна?

— Па прафесіі я — эканаміст, скончыла інстытут народнай гаспадаркі. Характар атрымала ў спадчыну ад маці, якая прайшла ўсю вайну доктарам. Мне шанцавала з начальнікамі: лепшым настаўнікам быў Уладзімір Іванавіч Крэз, разумны і сумленны чалавек, з жалезнай воляй.

— А што самае цяжкае ў вашай працы?

— Ужо не нарматыўна-прававая база: яна ўрэгуляваная, і пераважная большасць нашых прапаноў адлюстраваныя ў законах. Складана з рэкламай, якая каштуе дорага. Тым не менш менавіта рэклама дае штуршок да ажыўлення на рынку нерухомасці і акцый. Убачылі, прачыталі — пайшлі хадакі і тэлефанаванні.

— Якія планы ў фонду дзяржаўнай маёмасці на гэты год?

— Хацелася б канчаткова вырашыць праблему з аб'ектамі, якія не выкарыстоўваюцца. Мне падаецца, што 3 гады — гэта дастатковы тэрмін для навядзення парадку. І трэба заняцца галоўнай справай: прыцягваць інвестыцыі шляхам продажу дзяржаўных пакетаў акцый для развіцця і мадэрнізацыі дзейных вытворчасцяў.

— Якія будуць вашы пажаданні патэнцыйным інвестарам?

— Мы гатовыя выслухаць любую прапанову і вырашыць праблему ў адпаведнасці з заканадаўствам. Рады дапамагчы кожнаму інвестару, падказаць і літаральна за руку правесці да ажыццяўлення праекта.

Гутарыла Ілона ІВАНОВА.

КРЫМІНАЛЬНАЯ СПРАВА РАСПАЧАТА

па факце падпалу храма Міколы Цудатворца ля вёскі Стары Крыўск Рагачоўскага раёна. Маленькая царква была пабудаваная ў 1815 годзе. Як паведамілі ў прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама, ўзгаранне адбылося невыпадкова. Раніцай 5 студзеня невядомы падпаліў і поўнасцю знішчыў храм з бярвення, які пражыў часы ганенняў на царкву. Нагадаем, што менавіта ў гэтай царкве знаходзілася шмат рэчаў, зробленых рукамі святой Манефы Гомельскай. Ручнікі для абразоў, як і іншае гістарычнае начынне царквы, засталіся полымю.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

«ДЫК ЧАМУ Б НЕ СКАЗАЦЬ ПРОСТА?»

Ліст у нумар

«Звязда» — гэта і сапраўды родная газета на роднай мове. Дык куды ж яшчэ звяртацца, калі яе, гэтую мову, хочаш абараніць?

Ад каго?

Як ні крыўдна — ад тых, хто як быццам стараецца, спрыяе яе захаванню. Прынамсі, у сталічным грамадскім транспарце ў апошні час сталі гучаць запісаныя на магнітафонную стужку аб'явы. Найчасцейшая — «Хто не мае праязных білетаў шматразовага карыстання, набывайце білеты аднаразовага выкарыстання...»

Атрымліваецца нейкая гульня слоў — вельмі падобных паміж сабой, але ж не сказаць, каб прыгожых і не сказаць, каб... зразумелых. А тым больш адразу. Трэба задумацца, трэба змякціць яшчэ, што «праязны білет шматразовага карыстання» гэта звычайны праязны — на дэкаду, на месяц. Адпаведна білет аднаразовага выкарыстання — талончык на адну паездку. Дык чаму б тады так і не сказаць: «Калі ласка, хто не мае праязнога білета, купляйце талоны».

Другая аб'ява. Нас, пасажыраў, заклікаюць загадзя набываць праязныя дакументы і (цытую) «у поўным аб'ёме аплачваць праезд». Але кошт таго ж білета на адну паездку складае 600 рублёў. Сумленныя людзі іх аддаюць, несумленныя — могуць «эканоміць». Трэцяга не дадзена. Дык навошта гэта фраза пра поўны аб'ём? Хіба можа ён быць няпоўным?

Далей. Рамантуюцца трамвайныя пуці. Уведзены аўтобусны маршрут № 150. На праезд у ім, гучыць па гучнай сувязі, «сапраўдныя праязныя білеты на трамвай на верасень месяц...». Потым быў кастрычнік, лістапад, а мы ўсё гаварылі пра верасень? Навошта? Калі можна сказаць проста, што «...сапраўдныя білеты на трамвай».

І апошняе. Бягучым радком у тым самым трамваі пішуць (умоўна) «След. Будзённага». А па-беларуску ж трэба пісаць не следующая (остановка), а наступны (прыпынак)...

Вось так забіваюць нашы вушы. Што робім мы? Крывімся, шкадуем, што так непрыгожа гучыць наша мова, але ж маўчым. Ці правільна гэта?

В. КРАСОЎСКІ, пасажыр, *г. Мінск*

Абзац

◢ Каля 200 чалавек былі эвакуяваныя пры пажары 12 студзеня ў дзіцячым садку ў Маладзечне. Пажар адбыўся на другім паверсе ясляў-садка «Сонейка», у кабінеце псіхолага. Адміністрацыяй дзіцячага садка да прыбыцця падраздзялення МНС былі эвакуяваныя 187 чалавек — 139 дзяцей і 48 работнікаў. Аўтаматычная пажарная сігналізацыя дазволіла выявіць пажар на пачатковай стадыі і прадухіліць трагічныя наступствы. Пацярпелых няма, агнём пашкоджана маёмасць у кабінеце. Як мяркуецца, прычына пажару — кароткае замыканне ў электраправодцы.

◢ У будынку Інстытута фізіка-арганічнай хіміі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, размешчаным у Мінску на вуліцы Сурганава, у ноч на 13 студзеня адбыўся пажар. Загарэлася ў адным з кабінетаў на першым паверсе. Прыкладна ў 23.30 да будынка пад'ехалі каля дзесяці пажарных разлікаў. З-за вялікай колькасці тэхнікі, што сабралася на праезнай частцы, на паўгадзіны быў прыпынены рух тралейбусаў у бок вуліцы Сталетава. Пажар ліквідавалі за 25 хвілін. Кабінет, дзе загарэлася, займаюць арандатары, у ім знаходзілася камп'ютарная тэхніка. Прычынай узгарання лічаць кароткае замыканне праводкі.

◢ Жыхар Магілёва пасля бурнага застолля «замініраваў» бар і трапіў у псіхіятрычную клініку. Інфармацыю п'яны чалавек паведаміў ахоўніку бара. І хоць асаблівых падставаў верыць у паведамленне выпівакі не было, на ўсякі выпадак інфармацыю вырашылі праверыць. У бар прыбыла група размініравання, але бомбу не знайшла. Падазронага ў ілжывым мініраванні змясцілі ў псіхіятрычную клініку. Вядзецца праверка.

◢ Пракуратурай Мінска распачата справа аб махлярстве ў асабліва буйным памеры ў дачыненні да дзвюх жыхарак сталіцы. Абедзве займаліся прадпрымальніцкай дзейнасцю на Чэрвеньскім рынку і рынку ў Ждановічах. 35-гадовая індывідуальная прадпрымальніца і 60-гадовая непрацуючая мінчанка ад імя іншых ІП і прыватнага ўнітарнага прадпрыемства заключылі дагаворы з 12 юрыдычнымі асобамі на пастаўку мясной прадукцыі і не разлічыліся. Нанесены прадпрыемствам урон ацэньваецца ў 71,5 млн. рублёў.

◢ Мужчыны, якія на працы вымушаныя стрымліваць свой гнеў і раздражненне, удвая рызыкуюць памерці ад інфаркту ці захворванняў сэрца. Да такой высновы прыйшлі навукоўцы са Стакгольмскага ўніверсітэта, назіраючы на працягу больш як 10 гадоў за здароўем 2755 працаўнікоў. Высветлілася, што мужчыны, якія выказвалі сваё негатыўнае стаўленне адразу, мелі менш праблемаў са здароўем, чым тыя, хто пераносіў несправядлівае абыходжанне з сабой моўчкі. У перыяд правядзення даследавання памерлі ад хваробаў сэрца 47 даследуемых. Кіраўнікі даследавання раяць не крычаць на начальніка. Аднак заўсёды лепш сказаць, што, на вашу думку, з вамі несправядліва абыходзяцца, і знайсці канструктыўнае рашэнне, раяць медыкі.

Поўны абзац

◢ У Індыі матацыкліст, які моцна пацярпеў у ДТЗ, быў накіраваны ў морг як загінулы, аднак на стале патолагаанатама пачаў падаваць прыкметы жыцця. 30-гадовы Сусанта Дэа ехаў на матацыкле і ўрэзаўся ў трактарны прычэп. Ён атрымаў сур'ёзную траўму галавы і іншыя раненні і быў дастаўлены ў бальніцу. Дзяжурны ўрач вырашыў, што мужчына загінуў, і адправіў цела ў морг. Патолагаанатам прыгатаваў свае інструменты для ўскрыцця, і тут «нябожчык» пачаў падаваць прыкметы жыцця. Сусанту тэрмінова перавялі ў іншую бальніцу, дзе ён перанёс аперацыю на галаве і праз пэўны час пачаў нават размаўляць. Паліцыя завяла крымінальную справу на ўрача за халатнасць.

◢ Жыхар чарнагорскай вёскі знайшоў у сваім двары двухтонную бегемоціху. 11-гадовая жывёліна па мянушцы Нікіца змагла выплысці са свайго загона пасля таго, як падчас наваднення вада ўзнялася на ўзровень агароджы. Нікіцу знайшоў на сваім участку жыхар вёскі Плаўніца Мікола Радавіч. «Калі я выйшаў з хаты, каб пакарміць сваю карову, я ўбачыў бегемота, што стаяў насупраць хлява. Я думаў, што з'язджаю з глузду», — расказаў Мікола. Уладальнік заапарка запэўніў мясцовае насельніцтва, што Нікіца — міралюбівая жывёліна, якая не прычыніла клопату персаналу заапарка за ўсе 9 гадоў, што там жыла. У заапарку чакаюць, пакуль спадзе вада і можна будзе вярнуць уцякачку ў загон.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ОАО «ЛИФТСЕРВИС»

ИЗВЕЩАЕТ О СОЗЫВЕ ГОДОВОГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ

Собрание состоится 19 февраля 2010 г. по адресу: г. Минск, 1-й Велосипедный пер., 5, 4 этаж, актовый зал.

Регистрация участников собрания с 12.45 до 13.45. Начало работы собрания в 14.00.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2009 г. и основных показателях производственной программы и финансового плана на 2010 год.
2. Отчет Наблюдательного совета Общества.
3. Отчет Ревизионной комиссии Общества.
4. О выборах Наблюдательного совета Общества.
5. О выборах Ревизионной комиссии Общества.
6. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.
7. Об утверждении Регламента работы акционерного общества с реестром владельцев ценных бумаг.
8. Об утверждении Положения о порядке учета аффилированных лиц Общества и согласования сделок, в совершении которых имеется заинтересованность аффилированных лиц.
9. О внесении дополнений в Устав ОАО «Лифтсервис».
10. О вступлении в ассоциацию лифтовых предприятий.

Акционер ОАО «Лифтсервис» принимает участие в работе собрания лично или через своего представителя, действующего на основании доверенности.

Для регистрации на собрании необходимо при себе иметь паспорт и доверенность.

С материалами собрания акционеры могут ознакомиться по месту нахождения Общества.

УНП 100088852

Наблюдательный совет.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ ОБЪЕКТА ДОЛЕВОГО СТРОИТЕЛЬСТВА

Комплекс жилой застройки неповышенной комфортности в квартале улиц ул. Шафарнянская – Гинтовта – Ложинская – Городецкая в г. Минске
1-я очередь строительства
2-й пусковой комплекс (Жилой дом по г/п № 1, секции в осях 5–10)

Совместное общество с ограниченной ответственностью «БЕЛИНТЕ-РОБА» информирует физических и юридических лиц о создании объекта долевого строительства.

Информация о Застройщике

Застройщик (Заказчик) – СООО «БЕЛИНТЕ-РОБА».

Зарегистрировано решением № 653 Минского городского исполнительного комитета от 31 марта 2004 года в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190527399.

Генпроектировщик: СООО «БЕЛИНТЕ-РОБА». Лицензия Министерства архитектуры и строительства Республики Беларусь № 02250/0463108 действительна до 03 марта 2013 года.

Генподрядчик: ООО «АСТРА ИНВЕСТ» имеет специальное разрешение (лицензия) № 02250/0004737 на право осуществления деятельности «Проектирование и строительство зданий и сооружений I и II уровней ответственности и проведение инженерных изысканий для этих целей», действительно до 09.02.2014 г., выданное Министерством архитектуры и строительства Республики Беларусь.

ООО «АСТРА ИНВЕСТ» имеет разрешение на открытие представительства общества с ограниченной ответственностью «АСТРА ИНВЕСТ» (Российская Федерация), выданное Министерством иностранных дел 03.11.2008 г. Разрешение действительно до 30 октября 2013 г.

Адрес Застройщика: 220103, г. Минск, ул. Калиновского, 77а, ком. 320, телефон/факс: 281 41 15, 281 21 98.

Режим работы: понедельник – пятница: с 8.30 до 17.30, обед: 13.30 –14.30, выходные дни: суббота, воскресенье.

Информация о проекте

Цель строительства – выполнение инвестиционного проекта «Комплекс жилой застройки неповышенной комфортности в квартале ул. Шафарнянская – Гинтовта – Ложинская – Городецкая» в соответствии с утвержденным Председателем Минского горисполкома протоколом от 22 мая 2007 года.

1-я очередь, 2-й пусковой комплекс: жилой дом по г/п № 1, секции в осях 5–10.

Начало строительства – январь 2010 г. Срок окончания строительства – 3 квартал 2011 г.

Информация об объекте долевого строительства:

Объект долевого строительства – строительство четырех секций (12, 14, 16 и 18-этажные 9-секционного многоквартирного жилого дома № 1 (по генплану)) в осях 5–10, со встроенными административными помещениями в подвальном этаже в составе 2-го пускового комплекса 1-й очереди строительства «Комплекса жилой застройки неповышенной комфортности в квартале ул. Шафарнянская – Гинтовта – Ложинская – Городецкая».

12–18-этажная часть жилого дома на 210 квартир.

Площадь жилого здания – 14 912 кв.м.

Общая площадь квартир (проектная) – 11 598,8 кв.м.

Полезная площадь встроенных помещений в подвале: 360,2 кв.м.

Высота этажей (от пола до пола вышележащего этажа) – 3 м, высота встроенных помещений в подвале: 2,5 м.

Состав квартир на этажах принят:

В 12-этажной секции в осях 9–10 – 3 – 2 - 2.

В 14-этажной секции в осях 8–9 – 3 – 2 – 2.

В 16-этажной секции в осях 6–7 – 2 – 1 – 1 - 2.

В 18-этажной секции в осях 5–6 – 2 – 1 – 1 - 2.

Секции оборудованы мусоропроводом и пассажирскими лифтами грузоподъемностью 630 кг и 400 кг со скоростью 1 м/с (в 18-этажной секции – 1,6 м/с).

Конструктивная схема жилого дома – монолитный каркас с монолитными диафрагмами жесткости и монолитными перекрытиями, наружные стены – самонесущие из блоков ячеистого бетона, перегородки из блоков ячеистого бетона и кирпича керамического. Подземная часть здания решена с подвальным этажом с монолитными стенами.

Внутренняя отделка здания (места общего пользования) – декоративная штукатурка, покраска акриловой и масляной краской, облицовка глазурованной керамической плиткой, покрытие полов керамической плиткой Грес. Отделка квартир: подготовка поверхности стен под отделку, конструкция пола без покрытия (звукоизоляция и цементно-песчаная стяжка). Наружная отделка здания – покраска фасадной краской, облицовка декоративной плиткой на основе органических вяжущих преимущественно из минерального сырья (1…3 этажи главного фасада). Окна – из ПВХ профиля, стеклопакет. Лоджия – ПВХ профиль, остекление. Двери квартир (только входные) – деревянные щитовые. Сантехническое оборудование – унитаз, счетчики холодной и горячей воды, внутренняя разводка системы водопровода и канализации. Система отопления и вентиляции – приборы отопления, естественная вентиляция. Наличие в доме: техподполья и чердака, помещения товарищества собственников, лифтов.

Объект долевого строительства расположен в Первомайском районе в г. Минске в границах улиц Шафарнянская – Гинтов

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

14 студзеня 2010 г.
№ 2 (196)

ІНІЦЫЯТЫВА ВІТАЕЦЦА

УКЛАСЦІ ГРОШЫ... У ГІСТОРЫЮ

Сёння ў Полацку амаль 2 дзясяткі помнікаў і гарадскіх скульптур, большая частка якіх з'явілася тут у апошнія гады (помнікі Ефрасінні Полацкай, Сімяону Полацкаму, князю Андрэю Альгердавічу, Мікалаю Цудатворцу, скульптуры «Полацкі купец», «Шалі», «Крывічы», знак «Цэнтр Еўропы», бюст генерала Кандраценкі, помнік героям вайны 1812 года і інш.) Гэта сапраўдныя творы манументальнага мастацтва, але галоўная іх адметнасць у тым, што ні на адзін з іх не былі зрасходаваны бюджэтныя сродкі.

Старшыня Полацкага гарадскога Савета дэпутатаў Вольга ЖДАНОВІЧ гаворыць, што актыўная работа па ўсталяванні помнікаў распачалася тут 10 гадоў таму. «Мы паставілі перад сабой такую мэту — штогод адкрываць хоць бы па адным помніку ці музеі. І ў прынцыпе, гэтага прытрымліваемся. Першы помнік, які мы адкрылі з таго часу, быў помнік святой заступніцы беларускай зямлі, нашай славутай зямлячцы Ефрасінні Полацкай. Сродкі на яго збіралі ўсім горадам — удзел у дабрачыннай акцыі ўзялі і арганізацыі, і асобныя жыхары».

Такім жа чынам былі сабраны грошы на помнікі Усяславу Брачыслававічу, пры якім горад дасягнуў найвышэйшага росквіту (менавіта Усяслаў загадаў пабудаваць у Полацку Сафійскі сабор), і Сімяону Полацкаму, славутаму вучонаму і асветніку. Для збору сродкаў мясцовыя ўлады нават арганізавалі тэматычны тэлемарафон, у які актыўна «ўключыліся» гараджане. Асноўную долю сабраных тады сродкаў склалі асабістыя ахвяраванні асобных грамадзян.

— У нас жывуць людзі, якія любяць гісторыю, цікавяцца спадчынай, мінуўшчынай роднага краю, — патлумачыў **галоўны спецыяліст Полацкага гарвыканкама Станіслаў КРАСОЎСКІ**. — Напрыклад, наш мясцовы прадпрымальнік Аляксандр Лукашоў захапляецца гісторыяй горада, асабліва яго цікавіць перыяд праўлення апошняга Полацкага князя Андрэя Альгердавіча (які вадзіў полацкую дружыну на Кулікова поле, узначальваў «полк правай рукі»). Прадпрымальнік Лукашоў выступіў з ініцыятывай стварэння ў горадзе помніка князю Андрэю Полацкаму і прафінансаваў праект.

Бронзавы бюст яшчэ аднаго славутага земляка — генерала Рамана Кандраценкі — быў усталяваны па прапанове і за сродкі полацкага прадпрымальніка Андрэя Супрановіча (Раман Кандраценка быў выпускніком Полацкага кадэцкага корпуса, кіраваў абаронай Порт-Артура падчас вайны з Японіяй у 1905 годзе).

Не трэба толькі думаць, што кожны грамадзянін можа ўсталяваць на тэрыторыі горада якую заўгодна скульптуру ці помнік. Існуе адпаведная працэдура, зацверджаная Саветам Міністраў, аб парадку стварэння твораў манументальнага мастацтва. Спачатку грамадзянін ці арганізацыя звяртаюцца да мясцовых уладаў з адпаведнай ініцыятывай. Атрымаўшы дазвол, прадстаўляюць праект, які павінен атрымаць «дабро» экспертнага савета па манументальным мастацтве.

Апошнім часам у Полацку пачала ўкараняцца добрая традыцыя — другі год запар да свайго прафесійнага свята гарадскія арганізацыі гандлю ўсталёўваюць новую тэматычную паркавую скульптуру. Летась дзякуючы ім у горадзе з'явіўся «Полацкі купец», сёлета — скульптура «Шалі». Арганізацыі гандлю такім чынам адзначаюць сваё свята і адначасова ўпрыгожваюць Полацк.

Помнік Мікалаю Цудатворцу горад атрымаў у падарунак ад расійскага дабрачыннага фонду з нагоды леташняга візіту кіраўніка расійскай праваслаўнай царквы мітрапаліта Кірыла.

Зусім нядаўна завяршыліся работы па ўсталяванні адноўленага помніка героям вайны 1812 года. Першыя захады ў гэтым кірунку былі зроблены яшчэ ў 80-х гадах мінулага стагоддзя. Тады паспелі падрыхтаваць праект і зрабіць мадэль, але развал Савецкага Саюза перакрэсліў усе планы. Зноў Полацк вярнуўся да гэтай тэмы летам 2006 года, калі тут праходзіла чарговая парламенцкая сесія Саюзнай дзяржавы. Тады ж было прынята рашэнне ўсталяваць у горадзе помнік героям вайны 1812 года за сродкі саюзнага бюджэту, на месцы будучага помніка заклалі першы памятны камень.

— З гэтага чаму пачалася рэальная падрыхтоўчая работа, — патлумачыў Станіслаў Красоўскі. — Пэўны час заняла дзелавая перапіска паміж Расіяй і Беларуссю. У выніку ў маі 2009 года была падпісана пастанова Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы аб выдаткаванні сродкаў на аднаўленне ў Полацку помніка героям вайны 1812 года. Горад атрымаў 44 мільёны расійскіх рублёў (гэта каля 5 мільярдаў беларускіх). Меркавалася, што на ўзвядзенне спатрэбіцца 1,5-2 гады, але атрымалася, што асноўны аб'ём работ быў завершаны літаральна праз 3 месяцы. Засталося толькі выканаць элементы добраўпарадкавання вакол помніка. Яго афіцыйнае адкрыццё запланавана на май 2010 года.

У адпаведнасці з праектам, помнік вагой у 240 тон трэба было адліць з чыгуну. Паўстала пытанне — хто можа выканаць такі заказ, калі ў Беларусі ўсе помнікі адліваюцца з бронзы. Гарадскія ўлады звярнуліся да дырэктара мясцовага завода «Тэхналіт», дзе ўжо існавала ліцейная вытворчасць. Дырэктар пайшоў насустрач, на прадпрыемстве адкрылі новы ўчастак мастацкага ліцця, дзе і былі адліты помнікі Андрэю Полацкаму, героям вайны 1812 года, знак «Цэнтр Еўропы» і іншыя. Цяпер завод выконвае заказы не толькі Полацкай мэрыі, але і іншых гарадоў.

Заказчыкам усіх помнікаў і паркавых скульптур Полацка з'яўляецца гарадская арганізацыя ЖКГ. Гэта лагічна, бо на баланс яны ўсё адно перадаюцца менавіта камунальнікам.

У найбліжэйшых планах палачан — помнік дойліду Іаану (яго ўсталяванне будзе прымеркаванае да 100-годдзя перанясення мошчаў Ефрасінні Полацкай з Кіева-Пячорскай лаўры ў Полацк, якое будзе адзначацца ў чэрвені 2010 года), скульптура «Полацкі студэнт», якая з'явіцца на тэрыторыі Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта (дзе калісьці існавала першая ў Беларусі вышэйшая навучальная ўстанова — іезуіцкі каледж), і помнік полацкай князёўне Рагнедзе.

Пад Полацкам ёсць вёска Гомель, дзе ў часы Вялікай Айчыннай вайны існаваў Полацкі ўмацаваны раён (ён быў часткай «Лініі Сталіна»). Цяпер там ствараецца гісторыка-культурны комплекс «Поле ратнай славы».

Як любое добрае пачынанне, усталяванне новых помнікаў у Полацку напачатку мела сваіх крытыкаў, у тым ліку і сярод чыноўнікаў. Але калі на практыцы пацвердзілася, што грошы горада на гэта не трацяцца, пратэсты сціхлі.

— Новыя помнікі — гэта новыя заказы для нашага «Тэхналіта», — падсумаваў Красоўскі, — а, значыць, заробак для яго работнікаў, падаткі ў бюджэт. Полацк — адзін з самых старажытных гарадоў Беларусі, чым больш тут будзе помнікаў, тым больш з'явіцца турыстаў, што станоўча адаб'ецца на развіцці сферы паслуг.

У Полацку сёння 14 музеяў. Цяпер з'явілася ініцыятыва стварэння прыватных музеяў. Напрыклад, тут ужо існуе адзіны на тэрыторыі Беларусі прыватны музей эпохі Леніна.

— У нас шмат неабыякавых людзей, гатовых укладваць грошы ў гісторыю. І вельмі важна, каб добрыя ідэі грамадзян знаходзілі падтрымку з боку мясцовых уладаў. Толькі ў гэтых умовах выдатная ідэя можа ўвасобіцца ў нешта рэальнае. Трэба стварыць каманду, ініцыятыўную групу, як у нас пры гарвыканкаме, куды, акрамя членаў выканкама, уваходзяць работнікі культуры, краязнаўцы, актыўныя грамадзяне. Яны рэгулярна збіраюцца разам — абмяркоўваюць планы на перспектыву.

І яшчэ вельмі важна — да таго, як усталяваць новы помнік, неабходна правесці тлумачальна-асветніцкую работу ў мясцовых СМІ, арганізаваць інфармацыйныя групы на прадпрыемствах горада. Кожны жыхар павінен ведаць, каму збіраюцца ўсталяваць помнік, што гэта за гістарычная асоба была і якое дачыненне яна мае да горада. Тады ідэя будзе падтрыманая грамадскасцю і не ўзнікне супрацьстаяння. Уменне абгрунтаваць неабходнасць усталявання таго ці іншага помніка ці памятнага знака — надзвычай важная якасць для мясцовых уладаў, — падкрэсліў Станіслаў Красоўскі.

Інга МІНДАЛЁВА.

Фота Ганны КАСЦЮЧЭНКІ.

Менавіта Усяслаў Брачыслававіч загадаў пабудаваць у Полацку Сафійскі сабор.

АДКРЫТЫ ФОРУМ

ДОБРАЎПАРАДКАВАННЕ ЦІ ПРЫМУСОВА?

Адна з адметнасцяў гэтага года для першаснага ўзроўню ўлады — адмена пазабюджэтных фондаў і вяртанне самаабкладання (у адпаведнасці з новым Законам «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні»). Добраахвотныя ўзносы грамадзян як крыніца папаўнення сельсавецкай «кішэні» — рэч не новая. І раней жыхары вёсак на падставе рашэння свайго сходу «скідваліся» на вырашэнне той ці іншай мясцовай праблемы. Але з гэтага года ўсе сабраныя такім чынам сродкі грамадзян будуць акумулявацца ў бюджэце сельсавета, што дасць магчымасць забяспечыць строгі кантроль за іх выкарыстаннем.

Пра тое, ці зможа самаабкладанне стаць сапраўды дзейнай крыніцай папаўнення «нізавых» бюджэтаў і ці можна ў сённяшніх умовах спадзявацца на актыўнасць грамадзян у гэтым кірунку, мы распыталі кіраўнікоў першаснага звяна ўлады.

Валянціна БАГАН, старшыня Вялікасельскага сельскага Савета дэпутатаў Пружанскага раёна:

— Па гэтым пытанні, шчыра кажучы, пахваліцца няма чым. Не вельмі ў нас народ актыўны, многія прывыклі, каб ім задарма ўсё рабілі. Праўда, летась у людзей узнікла ініцыятыва абгарадзіць могілкі. Знаходзяцца яны на тэрыторыі суседняга Мокраўскага сельсавета, але шмат хто з нашых хавае там сваякоў. Я патэлефанавала старшыні Мокраўскага сельскага Савета, мы параіліся і вырашылі адкласці гэта пытанне да канца зімы.

Па іншых кірунках ініцыятыў не было. Можа, таму, што насельніцтва наша не вельмі заможнае. Кажаце, самаабкладанне вяртаецца ў бюджэт? Мне падаецца, яно не будзе мець вялікага значэння для нашага сельсавецкага бюджэту, ён ад гэтага не павялічыцца.

У пазамінулым годзе мы вырашылі паставіць уздоўж галоўнай вуліцы цэнтральнай вёскі сельсавета новую сучасную агароджу. 25 працэнтаў ад яе агульнага кошту паабяцаў выдзеліць з бюджэту старшыня райвыканкама, яшчэ столькі ж — гаспадарка. А астатнюю суму — 50 працэнтаў — неабходна было сабраць з насельніцтва... Ідэя добрая. Мы ўзяліся за яе рэалізацыю, паставілі агароджу да паловы вёскі. Надышоў час браць грошы з насельніцтва. І пачалося: «А мы вас не прасілі!..», «А нам і са старой агароджай добра было!» І гэта пры тым, што людзям давалася магчымасць разлічвацца ў растэрміноўку. Што такое 100 тысяч у растэрміноўку (на тры месяцы і болей) за новую жалезабетонную агароджу, якую табе яшчэ і прывезлі на двор, і ўсталявалі?! Аднак незадаволеных была процьма, і да гэтага часу не ўсе разлічыліся, хоць з кожным я гаварыла асабіста.

Я вось што думаю: напачатку гэтага года ў гаспадарцы адбудзецца справаздачны сход. Вазьму слова і даходліва патлумачу людзям, на што пайшлі бюджэтныя грошы, колькі іх увогуле было... А добраахвотныя ахвяраванні прыйшліся б нам вельмі да месца, не трэба было б за кожным разам звяртацца да кіраўніка гаспадаркі. Напрыклад, тую ж ваду адвесці, каб падворкі не затаплівала, ці аварыйныя дрэвы спілаваць... Будзем над гэтым пытаннем працаваць.

Надзея ПАПЯЛКОЎСКАЯ, старшыня Дабрамыслінскага сельскага Савета дэпутатаў Лёзненскага раёна:

— Да гэтага года ў нас існаваў пазабюджэтны фонд, дзе і назапашваліся добраахвотныя ўзносы ад насельніцтва. З кожнага падворка, у адпаведнасці з рашэннем сходу грамадзян, мы збіралі па 0,1 базавай велічыні (або 3500 рублёў) у год. Людзі на сходах вызначалі, на якія патрэбы неабходна накіраваць сабраныя грошы: напрыклад, на ачыстку калодзежаў, на добраўпарадкаванне могілак, на рамонт агароджы.

Але ў нас ёсць і маленькія вёсачкі, дзе ўсяго дзесяць двароў. І паколькі па 3500 рублёў мы збіраем з двара, то з вёскі атрымліваецца толькі 35 000 рублёў. А за гэтыя грошы што пабудуеш? Таму адпрацавалі наступную схему. Узносы з усіх населеных пунктаў збіраем у адзін «кацёл» і закрываем праблемы паступова, мэтанакіравана накіроўваем сродкі на той ці іншы аб'ект у парадку чарговасці.

За мінулы год сабралі такім чынам каля 1,5 мільёна рублёў і накіравалі іх на добраўпарадкаванне могілак у вёсках Барсеева і Дабрамыслі — ставілі новую агароджу. Грошы патрацілі ўсе да капейкі, і людзі ведаюць, на якія мэты яны пайшлі.

У сувязі з увядзеннем самаабкладання нам яшчэ не давалі ніякіх новых рэкамендацый. Але, думаю, цяпер нам будзе лягчэй збіраць узносы з грамадзян, паколькі гэта агаворана Законам «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні». Магчыма, мы нават зможам рабіць нейкія захады ў дачыненні да тых, хто адмаўляецца ўносіць суму, вызначаную сходам грамадзян.

Увогуле ж, у гэтай справе ўсё залежыць ад таго, што гаварыць людзям, як тлумачыць. А тлумачыць неабходна! «Мы збіраем грошы, каб зрабіць канкрэтную справу. За свае 3500 рублёў вы гэтага не зробіце, а вось калі мы аб'яднаем сродкі, будзе вынік!»

Аляксандр РОЗУМ, старшыня Старобінскага сельскага Савета дэпутатаў Салігорскага раёна:

— Узгадаю толькі адзін яскравы прыклад, хоць іх у нас дастаткова. Надзея Іванаўна Гучык, стараста вёскі Паварчыцы, прапанавала сабраць грашовыя сродкі з насельніцтва, каб паставіць на могілках агароджу. Сума патрабавалася вялікая — 12 мільёнаў рублёў. Таму дамовіліся з райвыканкамам: 50 працэнтаў выдзяляйце нам з раённага бюджэту, астатнія 50 працэнтаў збіраем самі. Мы гэтыя «астатнія» грошы размеркавалі на ўсе домаўладанні — і людзі адрэагавалі нармальна.

Увогуле лічу, што самаабкладанне сёння можа прынесці рэальныя вынікі, калі ў населеным пункце налічваецца 1-2 тысячы чалавек. У мяне на сёння некалькі вёсак, дзе жывуць па 15—20 чалавек, ды і тыя старыя. Там грошы збіраць — толькі людзей крыўдзіць. Калі мне трэба вырашыць нейкую праблему маленькай вёскі, звяртаюся па дапамогу да прадпрыемстваў, індывідуальных прадпрымальнікаў. На патрэбы маленькай вёскі Тычыны грошы выдзеліла ААТ «Купалінка». Спонсарам вёскі Крушнікі, дзе ўсяго 15 жыхароў, выступіў яе былы жыхар, сённяшні прадпрымальнік.

Дарэчы, самаабкладанне, якое ўведзена з гэтага года, нічым прынцыпова не адрозніваецца ад ранейшых добраахвотных ахвяраванняў, якія ішлі ў пазабюджэтныя фонды. Яно таксама з'яўляецца добраахвотнай справай, хоць і афармляецца пратаколам на сходзе жыхароў. Калі грамадзянін па нейкай прычыне не захоча здаваць грошы, мы яго не прымусім. Сход для яго — не ўказ. Рашэнне сходу толькі надае законную форму працэсу збірання грошай і накіроўвае іх на тыя ці іншыя мэты.

Сума ж узносаў залежыць ад патрэбаў. У нас максімальная была — 40 тысяч з аднаго двара. Не можаш унесці адразу — аддавай у 2-3 прыёмы. Галоўнае пераканаць людзей. Нашы, ведаеце, таксама спачатку не хацелі даваць — тут і старасты актыўна працавалі, і я па дварах ездзіў, з бабулямі размаўляў. Цяпер, калі сталі бачныя рэальныя вынікі, стала лягчэй.

Марыя КАЧКО, старшыня Нязбодзіцкага сельскага Савета дэпутатаў Свіслацкага раёна:

— Так, у бюджэты сельсаветаў вяртаецца самаабкладанне, але нам, нашаму сельсавету, гэтыя сродкі, можна сказаць, непатрэбныя. Чаму? Пачынаючы з 2003 года тут праводзілася каласальная работа па добраўпарадкаванні. Мы заключалі дагаворы з Белавежскай пушчай, а людзі за ўласныя сродкі закуплялі штыкетнік. Ну а ў 2007—2008 гадах і ўвогуле вялося будаўніцтва аграгарадка, таму ніякіх мерапрыемстваў, на якія звычайна збіраюцца грошы з насельніцтва, мы не планавалі — ні тады, ні пасля. Шчыра кажучы, і патрэбы такой не было. Прычым добраўпарадкаваны ў нас не толькі вялікія населеныя пункты, але і маленькія.

Рыгор ЦЭЙКА, старшыня Падольскага сельскага Савета дэпутатаў Астравецкага раёна:

— Летась людзі здалі 2 мільёны добраахвотных узносаў, а пайшлі грошы на агароджу для могілак у вёсцы Падольцы. У прынцыпе, здаваць грошы ніхто нікога не прымушаў. На сходзе грамадзян была вызначана сума — па 30 тысяч з домаўладання, пасля чаго стараста абышоў людзей. Хто быў згодны з рашэннем сходу — даў грошы, нязгодныя не далі. Сельскі Савет у гэты працэс практычна не ўмешваўся, мы дапамагалі толькі з некаторымі арганізацыйнымі момантамі (знайсці транспарт і г.д.). Але ніякага прымусу, націску з нашага боку не было.

З гэтага года ўводзіцца самаабкладанне. Што гэта азначае? Напэўна, калі мы на сваёй сесіі вырашым, што грамадзяне, жыхары таго ці іншага населенага пункта, павінны ўнесці нейкую суму, то гэта рашэнне трэба будзе выконваць.

Валянціна КІРЫЕНКА, старшыня Жгунскага сельскага Савета дэпутатаў Добрушскага раёна:

— Зразумела, што добраахвотныя ўзносы грамадзян — гэта вялікая падмога для мясцовай улады. Але, на жаль, у нашым сельсавеце да гэтага часу такой практыкі не было.

Ведаю, што ў той жа Віцебскай вобласці насельніцтва ў гэтым плане больш актыўнае. Напэўна, надышоў час узяцца за гэта пытанне і нам, таму што сельсавецкі бюджэт вельмі сціплы, а зрабіць хочацца шмат. І агароджы хацелася б адрамантаваць, і тэрыторыю малымі архітэктурнымі формамі ўпрыгожыць. Гэта могуць зрабіць самі людзі, за ўласныя сродкі — ім жа тут жыць!..

Думаю, у найбліжэйшы час мы правядзём сходы грамадзян менавіта па пытанні добраахвотных узносаў. Будзем расказваць, тлумачыць, што гэта не для старшыні сельскага Савета грошы збіраюцца, а для іх. Бо тое ж вядро для калодзежа каштуе ўсяго 10 тысяч, а мне трэба ламаць галаву, адкуль іх узяць... На нашай тэрыторыі пражывае 1829 чалавек, і той, хто працуе, паверце, далёка не бедны. Галоўнае, каб людзі зразумелі нас правільна.

Наталля КАРПЕНКА.

Паколькі ў разуменні сутнасці самаабкладання падчас гутаркі выявіліся некаторыя разыходжанні — «абкладваць» грамадзян у прымусовым парадку ці ўсё ж пакінуць прынцып добраахвотнасці — мы звярнуліся па ўдакладненні ў галоўнае ўпраўленне бюджэтнай палітыкі Міністэрства фінансаў. Там патлумачылі: прынцып добраахвотнасці ў сувязі з увядзеннем самаабкладання ніхто не адмяняў, таму ніякіх прымусовых рашэнняў мясцовая ўлада прымаць не павінна (а тым больш — прыцягваць нязгодных да адказнасці!). Самаабкладанне напрамую звязанае з самакіраваннем: інакш кажучы, велічыню таго ці іншага ўзносу, як і яго мэтазгоднасць, мае права вызначыць толькі само насельніцтва праз сход. Падпарадкоўвацца ці не падпарадкоўвацца рашэнню сходу — справа грамадзяніна і яго сумленнасці.

НАСТОЛЬНАЯ КНІГА для арганізатараў выбараў

Да абвяшчэння даты чарговай электаральнай падзеі метадычкі ЦВК будуць выпушчаныя

Мы ўсё казалі пра новыя правілы гульні, па якіх пройдуць ужо найбліжэйшыя — мясцовыя — выбары. І цяпер самі гэтыя правілы ды яшчэ з тлумачэннямі атрымаюць увасабленне — метадычныя рэкамендацыі для тэрытарыяльных, акруговых і ўчастковых выбаркамаў зацверджаныя на нядаўнім пасяджэнні ЦВК і будуць надрукаваныя ў найбліжэйшы час. З тым, каб па абвяшчэнні выбараў іх арганізатары на месцах валодалі ўсёй неабходнай для работы інфармацыяй — ад падрыхтоўкі да правядзення выбараў.

«Там яе вельмі чакаюць», — запэўніла **старшыня Цэнтрвыбаркама Лідзія ЯРМОШЫНА**. Паводле яе слоў, Выбарчы кодэкс з усімі змяненнямі і дапаўненнямі ў канчатковым варыянце з'явіцца на прылаўках толькі ў лютым. Да гэтага ж часу адзіным паўнавартасным дакументам па гэтых пытаннях будуць якраз згаданыя метадычныя рэкамендацыі, што даюць «поўную інфармацыйную карціну». Імі ўжо вельмі цікавяцца. «Для выбарчых камісій гэта галоўная літаратура, яны працуюць на падставе гэтых растлумачэнняў». І на час чарговай электаральнай кампаніі, трэба думаць, стануць для выбаркамаў настольнай кнігай. «Для тых, хто не атрымае брашуру, вялікай падмогай паслужыць інтэрнэт», — дадала кіраўнік ЦВК. Зацікаўленыя карыстальнікі сусветнага павуціння змогуць знайсці неабходныя дакументы на сайце Цэнтральнай камісіі (www.rec.gov.by). Па сутнасці, гэта абагульненне навел у выбарчым заканадаўстве з тлумачэннямі. Апроч непасрэдных адрасатаў — выбаркамаў — рэкамендацыі могуць быць карыснымі і для тых, хто плануе ўзяць удзел у выбарах.

Дэпутатаў мясцовых Саветаў беларусы абяруць ужо ўвесну, з афіцыйнага абвяшчэння непасрэднай даты і распачнецца ўвесь палітычны працэс. Метадычныя рэкамендацыі распрацаваныя па ўсіх этапах выбарчай кампаніі. Асаблівая ўвага ў тлумачэннях ЦВК нададзеная палажэнням аб парадку вылучэння і рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты, — падкрэсліла **член Цэнтральнай камісіі Надзея КІСЯЛЁВА**. Менавіта гэтыя моманты былі істотна зменены падчас нядаўняга «капрамонту» Выбарчага кодэкса. «Дэталёва растлумачаны парадак вылучэння кандыдатаў рознымі шляхамі — праз збор подпісаў, вылучэнне палітычнымі партыямі, працоўнымі калектывамі, — зазначыла выступоўца. — Падрабязна выкладзены пералік падстаў для адмовы ў рэгістрацыі і адмены рашэння аб рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты». Член ЦВК звярнула ўвагу і на тое, што значнае месца ў рэкамендацыях адведзенае нюансам правядзення перадвыбарнай агітацыі, а таксама падвядзенню вынікаў выбараў па выбарчых акругах. Немалаважны момант — вызначэнне істотнасці скажэння інфармацыі ў дэкларацыі, якую прадаставіць кандыдат. Асобныя ж моманты знойдуць адлюстраванне ў спецыяльных пастановах Цэнтральнай камісіі.

Намеснік загадчыка прававога аддзела Цэнтрвыбаркама Галіна МКРТЫЧАН зрабіла агляд метадычных рэкамендацый для ўчастковых камісій. Там надаецца вялікая ўвага працэдурным нюансам пры правядзенні датэрміновага галасавання — забеспячэнню захаванасці дакументаў, складанню пратаколаў па выніках кожнага дня датэрміновага галасавання і гэтак далей. Падрабязна выкладзеная паслядоўнасць дзеянняў участковых камісій пры падліку галасоў, патрабаванні да аснашчэння ўчасткаў для галасавання, складання і ўдакладнення спісаў выбаршчыкаў.

Алег СЛІЖЭЎСКІ, член ЦВК, звярнуў увагу калегаў на пашырэнне магчымасцяў назірання за выбарамі. Так, напрыклад, назіральнікамі ад палітычных партый змогуць быць не толькі члены партыі, але і яе прадстаўнікі. Гэта забяспечыць роўныя магчымасці назірання за выбарамі для арганізацый з розным колькасным складам. Як было агучана на пасяджэнні, для ўтварэння рэспубліканскага грамадскага аб'яднання дастаткова ўсяго 50 чалавек. Вядома ж, магчымасць прыцягваць да назірання за выбарамі прадстаўнікоў грамадскіх аб'яднанняў, а не толькі непасрэдных удзельнікаў, дазволіць установам больш поўна карыстацца сваімі паўнамоцтвамі. Спрашчаецца і вылучэнне ад палітпартый: цяпер для гэтага не спатрэбіцца наяўнасць ніжэйшай арганізацыйнай структуры партыі ў выбарчай акрузе. Усё гэта знайшло адлюстраванне ў метадычных рэкамендацыях, і, на думку члена ЦВК, будзе садзейнічаць большай празрыстасці выбарчага працэсу і рэалізацыі выбарчага права грамадзян.

Апроч метадычных рэкамендацый членамі ЦВК былі зацверджаныя і формы дакументаў, якія будуць выкарыстоўвацца падчас найбліжэйшых выбараў (у прыватнасці формы бюлетэняў, спісы выбаршчыкаў, пратаколы камісій). Члены Цэнтральнай камісіі прынялі таксама палажэнне аб парадку размеркавання і выкарыстання грашовых сродкаў з рэспубліканскага бюджэту на падрыхтоўку і правядзенне выбараў. Было зацверджана і палажэнне аб пазабюджэтным фондзе для дадатковага фінансавання мясцовых выбараў. Пазабюджэтны фонд, як было агучана падчас пасяджэння, існуе яшчэ з часоў выбараў 2000 года. Рахунак адкрыты для добраахвотнага ўнясення сродкаў арганізацыямі і фізічнымі асобамі. Сёння ў «скарбонцы» на выбары — «астранамічная» сума ў тры тысячы беларускіх рублёў. Кажуць, іх ахвяраваў чуллівы пенсіянер. Распараджацца ўсімі паступленнямі на рахунак — прэрагатыва ЦВК. Фінансавыя сродкі, калі такія будуць, могуць пайсці на выраб інфармацыйных матэрыялаў, дадатковага матэрыяльна-тэхнічнага аснашчэння ўчасткаў, правядзення перадвыбарнай агітацыі.

У гутарцы з журналістамі Лідзія Ярмошына адзначыла, што пазабюджэтны фонд прадугледжаны Выбарчым кодэксам, па сутнасці ЦВК павінен размяркоўваць гэтыя сродкі пароўну, каб размеркаванне было справядлівым. Аднак «насельніцтва Беларусі гэту ідэю не падтрымлівае». Кіраўнік Цэнтрвыбаркама, тым не менш, зазначыла: «Фонд існуе і мы не хочам ад яго адмаўляцца». Маўляў, цалкам верагодна, што могуць узнікнуць сітуацыі, калі спатрэбіцца пазачарговая выбарчая кампанія. Тады сродкі фонду і спатрэбяцца, пакуль жа на запланаваныя выбарчыя кампаніі прадугледжваюцца сродкі з бюджэту, форс-мажорных абставінаў няма і фонд не выкарыстоўваецца...

Міжнародных назіральнікаў на мясцовыя выбары ЦВК запрашаць не плануе. Паводле тлумачэння Лідзіі Ярмошынай, у гэтым пытанні павінна быць паслядоўнасць. Аднойчы запрасіўшы міжнародных назіральнікаў на мясцовыя выбары, дзяржава ўжо не зможа адмовіцца ад гэтай практыкі надалей. Да таго ж, «у свеце не прымяняецца запрашэнне міжнародных назіральнікаў на мясцовыя выбары», хоць гэта і не забараняецца. «У нас удзельнічаюць пасольствы, мы ніколі не адмаўляем у акрэдытацыі дыпламатам, якія працуюць у Беларусі». Яна не выключае таксама, што прыбудуць замежныя госці па лініі міжпарламенцкіх, рэгіянальных сувязяў. «Аднак гэта будуць кароткатэрміновыя экспертныя місіі, якія будуць запрашацца на дзень выбараў у прыватным парадку». Таму казаць пра міжнароднае назіранне як рысу выбарчай кампаніі, якая мае адбыцца, не даводзіцца, — рэзюмавала старшыня Цэнтральнай камісіі, — гэта будуць выбары чыста нацыянальныя.

Самі ж спецыялісты ЦВК у хуткім часе возьмуць удзел у назіранні за парламенцкімі выбарамі ў Таджыкістане, прызначанымі на 28 лютага. А вось назіраць за прэзідэнцкімі выбарамі ва Украіне, што адбудуцца ўжо зусім хутка, наш Цэнтрвыбаркам не запрасілі. Каментуючы гэту акалічнасць, Лідзія Ярмошына выказала меркаванне, што «хутчэй за ўсё, гэта пазіцыя краіны — не запрашаць назіральнікаў з краін СНД». Аднак гэта ні ў якім разе не азначае разрыву адносінаў: «Нядаўна мы атрымалі цёплае святочнае віншаванне ад украінскага калегі».

Зоя ВАРАНЦОВА.

Прыняты
Палатай прадстаўнікоў *11 снежня 2009 года*
Ухвалены
Саветам Рэспублікі *17 снежня 2009 года*

Закон Рэспублікі Беларусь

АБ МЯСЦОВЫМ КІРАВАННІ І САМАКІРАВАННІ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

Гэты Закон вызначае прававыя і арганізацыйныя асновы мясцовага кіравання і самакіравання ў Рэспубліцы Беларусь.

ГЛАВА 1
АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

Артыкул 1. Паняцце мясцовага самакіравання і сістэма яго органаў

1. Мясцовае самакіраванне — форма арганізацыі і дзейнасці насельніцтва, якое пражывае на адпаведнай тэрыторыі (далей, калі не названа іншае, — грамадзяне), для самастойнага рашэння непасрэдна або праз органы, якія выбіраюцца ім, сацыяльных, эканамічных і палітычных пытанняў мясцовага значэння выходзячы з агульнадзяржаўных інтарэсаў і інтарэсаў грамадзян, асаблівасцяў развіцця адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак на аснове ўласнай матэрыяльна-фінансавай базы і прыцягнутых сродкаў.

Мясцовае самакіраванне ажыццяўляецца праз мясцовыя Саветы дэпутатаў (далей — Саветы), органы тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, мясцовыя сходы, мясцовыя рэферэндумы, ініцыятывы грамадзян па прыняцці рашэнняў Саветаў, удзел грамадзян у фінансаванні і (або) пакрыцці выдаткаў бюджэту на вызначаныя імі мэты і іншыя формы ўдзелу грамадзян у дзяржаўных і грамадскіх справах.

2. Сістэма органаў мясцовага самакіравання ўключае Саветы і органы тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання.

3. Сістэма Саветаў у Рэспубліцы Беларусь складаецца з трох тэрытарыяльных узроўняў: абласнога, базавага і пярвічнага і ўключае абласныя, гарадскія, раённыя, пасялковыя і сельскія Саветы.

Да абласнога тэрытарыяльнага ўзроўню адносяцца абласныя, Мінскі гарадскі Саветы (далей, калі не названа іншае, — Саветы абласнога ўзроўню). Саветы абласнога ўзроўню з'яўляюцца вышэйстаячымі ў дачыненні да Саветаў базавага і пярвічнага тэрытарыяльных узроўняў.

Да базавага тэрытарыяльнага ўзроўню адносяцца гарадскія (гарадоў абласнога падпарадкавання), раённыя Саветы (далей, калі не названа іншае, — Саветы базавага ўзроўню). Саветы базавага ўзроўню з'яўляюцца вышэйстаячымі ў дачыненні да Саветаў пярвічнага тэрытарыяльнага ўзроўню.

Мінскі гарадскі Савет валодае таксама правамі Савета базавага ўзроўню.

Да пярвічнага тэрытарыяльнага ўзроўню адносяцца гарадскія (гарадоў раённага падпарадкавання), пасялковыя, сельскія Саветы (далей, калі не названа іншае, — Саветы пярвічнага ўзроўню).

Артыкул 2. Паняцце мясцовага кіравання і сістэма яго органаў

1. Мясцовае кіраванне — форма арганізацыі і дзейнасці мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў (далей — выканаўчыя і распарадчыя органы) для вырашэння пытанняў мясцовага значэння выходзячы з агульнадзяржаўных інтарэсаў і інтарэсаў грамадзян.

2. Сістэма органаў мясцовага кіравання складаецца з трох тэрытарыяльных узроўняў: абласнога, базавага і пярвічнага і ўключае абласныя, гарадскія, раённыя, пасялковыя і сельскія выканаўчыя камітэты (далей — выканкамы) і мясцовыя адміністрацыі раёнаў у гарадах (далей, калі не названа іншае, — мясцовыя адміністрацыі).

Да абласнога тэрытарыяльнага ўзроўню адносяцца абласныя, Мінскі гарадскі выканкамы (далей, калі не названа іншае, — выканкамы абласнога ўзроўню). Выканкамы абласнога ўзроўню з'яўляюцца вышэйстаячымі ў дачыненні да выканаўчых і распарадчых органаў базавага і пярвічнага тэрытарыяльных узроўняў.

Да базавага тэрытарыяльнага ўзроўню адносяцца гарадскія (гарадоў абласнога падпарадкавання), раённыя выканкамы (далей, калі не названа іншае, — выканкамы базавага ўзроўню). Выканкамы базавага ўзроўню з'яўляюцца вышэйстаячымі ў дачыненні да выканаўчых і распарадчых органаў пярвічнага тэрытарыяльнага ўзроўню.

Мінскі гарадскі выканкам валодае таксама правамі выканкама базавага ўзроўню.

Да пярвічнага тэрытарыяльнага ўзроўню адносяцца гарадскія (гарадоў раённага падпарадкавання), пасялковыя, сельскія выканкамы (далей, калі не названа іншае, — выканкамы пярвічнага ўзроўню), мясцовыя адміністрацыі.

Артыкул 3. Асноўныя прынцыпы мясцовага кіравання і самакіравання

Мясцовае кіраванне і самакіраванне ажыццяўляюцца ў адпаведнасці з наступнымі асноўнымі прынцыпамі:

законнасць;

сацыяльная справядлівасць;

абарона правоў і законных інтарэсаў грамадзян;

спалучэнне агульнадзяржаўных і мясцовых інтарэсаў, удзел органаў мясцовага кіравання і самакіравання ў вырашэнні пытанняў, якія закранаюць правы і законныя інтарэсы грамадзян;

адзінства і цэласнасць сістэмы мясцовага кіравання і самакіравання;

узаемадзеянне органаў мясцовага кіравання і самакіравання;

размежаванне кампетэнцыі органаў мясцовага кіравання і самакіравання;

выбарнасць органаў мясцовага самакіравання, іх падсправаздачнасць грамадзянам;

галоснасць і ўлік грамадскай думкі, пастаяннае інфармаванне грамадзян аб прымаемых рашэннях па найважнейшых пытаннях мясцовага значэння;

адказнасць органаў мясцовага кіравання і самакіравання за законнасць і абгрунтаванасць прымаемых рашэнняў;

абавязковасць выканання на адпаведнай тэрыторыі рашэнняў Саветаў, выканаўчых і распарадчых органаў, прынятых у межах іх кампетэнцыі;

самастойнасць і незалежнасць органаў мясцовага самакіравання ў межах сваёй кампетэнцыі ў вырашэнні пытанняў мясцовага значэння, недапушчэнне абмежавання паўнамоцтваў органаў мясцовага кіравання і самакіравання, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных гэтым Законам і іншымі заканадаўчымі актамі.

Артыкул 4. Прававая аснова мясцовага кіравання і самакіравання

Мясцовае кіраванне і самакіраванне арганізуюцца і ажыццяўляюцца на падставе Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, гэтага Закона і іншых актаў заканадаўства, у тым ліку міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 5. Роля Саветаў, выканаўчых і распарадчых органаў ва ўдасканальванні арганізацыі работы з грамадзянамі і юрыдычнымі асобамі

1. Саветы праводзяць мерапрыемствы па ўдасканальванні арганізацыі работы з грамадзянамі і юрыдычнымі асобамі, у тым ліку па ўкараненні ў дзейнасць дзяржаўных органаў і іншых дзяржаўных арганізацый заяўнага прынцыпу аднаго акна, а таксама ўдзельнічаюць у ажыццяўленні кантролю за правядзенне такіх мерапрыемстваў на адпаведнай тэрыторыі.

2. У мэтах удасканалвання арганізацыі работы з грамадзянамі і юрыдычнымі асобамі Саветы, выканаўчыя і распарадчыя органы ў межах сваёй кампетэнцыі ў парадку, устаноўленым заканадаўствам:

2.1. разглядаюць звароты грамадзян, уключаючы індывідуальных прадпрымальнікаў, і юрыдычных асобаў (далей — звароты грамадзян і юрыдычных асобаў), у тым ліку з выездам на месца, вядуць кнігу заўваг і прапаноў;

2.2. прымаюць неабходныя меры для поўнага, аб'ектыўнага, усебаковага і своечасовага разгляду зваротаў грамадзян і юрыдычных асобаў на адпаведнай тэрыторыі, у тым ліку ўдзельнічаюць у ажыццяўленні кантролю за своечасовым і якасным вырашэннем дзяржаўнымі органамі і іншымі дзяржаўнымі арганізацыямі пытанняў, якія ўтрымліваюцца ў зваротах грамадзян і юрыдычных асобаў;

2.3. арганізуюць асабісты прыём грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, і прадстаўнікоў юрыдычных асобаў (далей — асабісты прыём грамадзян і прадстаўнікоў юрыдычных асобаў);

2.4. ажыццяўляюць адміністрацыйныя працэдуры, на сістэматычнай аснове праводзяць мерапрыемствы па іх спрашчэнні, у тым ліку шляхам скарачэння колькасці дакументаў, неабходных для іх ажыццяўлення, тэрмінаў ажыццяўлення такіх працэдур, накіравання прапаноў у адпаведныя дзяржаўныя органы і іншыя арганізацыі.

Артыкул 6. Роля Саветаў, выканаўчых і распарадчых органаў у забеспячэнні сацыяльнай абароны грамадзян

Саветы, выканаўчыя і распарадчыя органы ў межах сваёй кампетэнцыі ў парадку, устаноўленым заканадаўствам, прымаюць меры па забеспячэнні сацыяльнай абароны грамадзян на адпаведнай тэрыторыі, у тым ліку шляхам прадастаўлення льгот па падатках, зборах (пошлінах), дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі, прызначэння і выплаты пенсій, дапамог, аказання іншых відаў сацыяльнай падтрымкі.

Артыкул 7. Асацыяцыі Саветаў. Нацыянальная асацыяцыя мясцовых Саветаў дэпутатаў

1. Саветы ў мэтах эфектыўнага ажыццяўлення сваіх паўнамоцтваў, абароны агульных інтарэсаў і аказання ўзаемадапамогі ў вырашэнні пытанняў мясцовага значэння, іншага садзейнічання ажыццяўленню функцый мясцовага самакіравання маюць права ствараць аб'яднанні ў форме асацыяцый Саветаў. Асацыяцыі Саветаў, Мінскі гарадскі Савет могуць ствараць Нацыянальную асацыяцыю мясцовых Саветаў дэпутатаў.

Дзяржаўная рэгістрацыя асацыяцый, названых у частцы першай гэтага пункта, ажыццяўляецца ў парадку, устаноўленым заканадаўчымі актамі для асацыяцый (саюзаў) некамерцыйных арганізацый.

2. Асацыяцыі, названыя ў частцы першай пункта 1 гэтага артыкула, з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі, маёмасць якіх фарміруецца за кошт узносаў іх членаў і іншых крыніц у адпаведнасці з заканадаўствам.

Фінансаванне дзейнасці названых асацыяцый ажыццяўляецца за кошт прыналежных ім грашовых сродкаў і іншай маёмасці, у тым ліку атрыманых ад дзейнасці, якая прыносіць даходы, бязвыплатнай (спонсарскай) дапамогі, а таксама іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам.

Артыкул 8. Савет па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь

Для ўзаемадзеяння з органамі мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь можа стварацца Савет па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання. Палажэнне аб гэтым Савеце зацвярджаецца Саветам Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

ГЛАВА 2
САВЕТЫ

Артыкул 9. Саветы

1. Саветы з'яўляюцца прадстаўнічымі дзяржаўнымі органамі, якія ствараюцца ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку на тэрыторыі адпаведных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, і асноўным звяном сістэмы мясцовага самакіравання.

2. Саветы ажыццяўляюць свае паўнамоцтвы ў адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, гэтым Законам і іншымі актамі заканадаўства.

3. Саветы падсправаздачныя ў сваёй дзейнасці грамадзянам, адказныя перад імі.

4. Саветы з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі.

Артыкул 10. Выбранне Савета. Тэрмін паўнамоцтваў Савета

1. Савет выбіраецца грамадзянамі адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі на падставе ўсеагульнага, свабоднага, роўнага і прамога выбарчага права пры тайным галасаванні тэрмінам на чатыры гады ў парадку, устаноўленым Выбарчым кодэксам Рэспублікі Беларусь.

2. Паўнамоцтвы Савета пачынаюцца з дня адкрыцця першай пасля выбараў сесіі Савета і захоўваюцца да адкрыцця першай сесіі Савета новага склікання, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных артыкулам 24 гэтага Закона.

Артыкул 11. Дзейнасць Савета

1. Савет у сваёй дзейнасці па рашэнні пытанняў мясцовага значэння зыходзіць з агульнадзяржаўных інтарэсаў і інтарэсаў грамадзян, удзельнічае ў абмеркаванні пытанняў рэспубліканскага значэння, якія закранаюць інтарэсы адпаведнай тэрыторыі, уносіць па іх свае прапановы ў адпаведныя дзяржаўныя органы і іншыя арганізацыі, выконвае рашэнні вышэйстаячых дзяржаўных органаў.

2. Савет ажыццяўляе сваю дзейнасць у форме сесій і праз дзейнасць органаў Савета, а таксама шляхам рэалізацыі дэпутатамі Савета сваіх паўнамоцтваў, у тым ліку праз стварэнне і дзейнасць дэпутацкіх груп і іншых дэпутацкіх аб'яднанняў.

3. Органамі Савета з'яўляюцца прэзідыум, пастаянныя і часовыя камісіі Савета.

4. Савет арганізуе сваю работу на падставе рэгламенту, які зацвярджаецца Саветам, у якім вызначаюцца парадак падрыхтоўкі, унясення і разгляду пытанняў на сесіях Савета і пасяджэннях яго органаў, галасавання па прымаемых рашэннях, фарміравання і дзейнасці камісій Савета, заслухоўвання справаздач аб іх рабоце, разгляду запытаў дэпутатаў Савета і выражэння іншых пытанняў арганізацыі работы Савета і яго органаў, а таксама адказнасць дэпутатаў Савета за няўдзел у яго рабоце без уважлівых прычын.

5. Вышэйстаячыя Саветы ажыццяўляюць каардынацыю дзейнасці ніжэйстаячых Саветаў і іх органаў, аказваюць ім арганізацыйна-метадычную дапамогу.

6. Арганізацыйна-тэхнічнае і іншае забеспячэнне дзейнасці Савета і створаных ім органаў ажыццяўляецца апаратам Савета і выканкамам за кошт сродкаў адпаведнага мясцовага бюджэту. Колькасць апарату Савета вызначаецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

7. Пытанні, якія закранаюць інтарэсы сумежных тэрыторый, вырашаюцца адпаведнымі Саветамі сумесна.

Артыкул 12. Сесія Савета

1. Асноўнай формай дзейнасці Савета з'яўляецца сесія, якая склікаецца па меры неабходнасці, але не радзей як адзін раз у квартал. Першая сесія нававыбранага Савета склікаецца адпаведнай тэрытарыяльнай выбарчай камісіяй пры выбранні больш як паловы дэпутатаў ад агульнай колькасці, устаноўленай для гэтага Савета, не пазней чым праз 30 дзён пасля выбараў. Сесіі Савета праводзяцца ў форме пасяджэнняў у парадку, вызначаным рэгламентам Савета.

2. Першае пасяджэнне нававыбранага Савета да выбрання старшыні Савета вядзе старшыня тэрытарыяльнай выбарчай камісіі, а ў яго адсутнасць — член названай камісіі, які выконвае абавязкі яе старшыні.

3. Сесіі Савета склікаюцца і праводзяцца ў адпаведнасці з рэгламентам Савета старшынёй Савета, а ў выпадку яго адсутнасці або па яго даручэнні — яго намеснікам. Сесія Савета склікаецца прэзідыумам Савета або старшынёй Савета:

3.1. па ініцыятыве не менш чым адной трэці з ліку выбраных дэпутатаў Савета, старшыні адпаведнага выканкама, а таксама па ініцыятыве не менш як 10 працэнтаў грамадзян, якія валодаюць выбарчым правам і пражываюць на адпаведнай тэрыторыі;

3.2. па патрабаванні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь альбо вышэйстаячага Савета — у выпадку ўшчамлення Саветам правоў і законных інтарэсаў грамадзян, іншага парушэння заканадаўства.

4. Сесія Савета праводзіцца адкрыта і галосна, за выключэннем выпадку, калі па рашэнні Савета неабходна правядзенне закрытага пасяджэння. Сесія правамоцная, калі ў ёй бяруць удзел не менш як дзве трэці ад ліку выбраных дэпутатаў.

5. Прапановы па пытаннях для разгляду на сесіі Савета могуць уносіць старшыня Савета, прэзідыум і іншыя органы Савета, дэпутаты Савета, старшыня выканкама (кіраўнік мясцовай адміністрацыі), выканкам (мясцовая адміністрацыя), органы тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, мясцовыя сходы, а таксама ў адпаведнасці з артыкулам 35 гэтага Закона — грамадзяне.

Артыкул 13. Рашэнні Савета

1. Па пытаннях, разгледжаных на сесіях, Савет прымае рашэнні.

2. Рашэнні Савета прымаюцца на сесіі Савета простай большасцю галасоў ад ліку выбраных дэпутатаў тайным або адкрытым галасаваннем, у тым ліку пайменным. Рашэнне аб самароспуску Савета прымаецца не менш чым дзвюма трэцімі галасоў ад ліку выбраных дэпутатаў. Форма галасавання вызначаецца ў парадку, устаноўленым рэгламентам Савета.

Артыкул 14. Утварэнне органаў Савета

Савет самастойна ўтварае свае органы не пазней чым у двухмесячны тэрмін з дня склікання першай сесіі, вызначае іх структуру і паўнамоцтвы, устанаўлівае выдаткі на іх утрыманне ў адпаведнасці з гэтым Законам і іншымі актамі заканадаўства.

Артыкул 15. Прэзідыум Савета

1. У Саветах абласнога і базавага ўзроўняў ствараюцца прэзідыумы.

У склад прэзідыума Савета ўваходзяць старшыня Савета, яго намеснік (намеснікі), старшыні пастаянных камісій Савета. Па рашэнні Савета ў склад яго прэзідыума могуць уваходзіць іншыя дэпутаты Савета.

2. Пасяджэнні прэзідыума Савета праводзяцца па меры неабходнасці, але не радзей як адзін раз у квартал.

Пасяджэнні прэзідыума Савета склікаюцца і праводзяцца старшынёй Савета, а ў выпадку яго адсутнасці — яго намеснікам. Пасяджэнне прэзідыума Савета правамоцнае, калі на ім прысутнічае не менш як дзве трэці ад яго поўнага складу. Рашэнні прэзідыума Савета прымаюцца простай большасцю галасоў ад яго поўнага складу тайным або адкрытым галасаваннем, у тым ліку пайменным, у парадку, устаноўленым рэгламентам Савета.

3. Прэзідыум Савета ў межах сваёй кампетэнцыі ў парадку, устаноўленым заканадаўствам і рэгламентам Савета:

3.1. арганізуе работу па падрыхтоўцы сесій Савета, паведамляе дэпутатам Савета і даводзіць да ведама грамадзян інфармацыю аб часе і месцы правядзення сесій Савета, а таксама аб пытаннях, якія ўносяцца на разгляд Савета, і прынятых па іх рашэннях;

3.2. забяспечвае кантроль за выкананнем рашэнняў Савета;

3.3. уносіць на разгляд Савета прапановы аб стварэнні пастаянных і часовых камісій Савета, каардынуе дзейнасць пастаянных і часовых камісій, дэпутацкіх груп і іншых дэпутацкіх аб'яднанняў;

3.4. аказвае садзейнічанне дэпутатам Савета ў ажыццяўленні імі дэпутацкай дзейнасці, уключаючы правядзенне імі асабістага прыёму грамадзян і прадстаўнікоў юрыдычных асобаў, падрыхтоўку справаздач перад выбаршчыкамі, забяспечвае іх неабходнай інфармацыяй;

3.5. уносіць на сесіі Савета прапановы па пытаннях, звязаных з ажыццяўленнем паўнамоцтваў дэпутатаў Савета, у тым ліку з вызваленнем дэпутатаў ад выканання працоўных (службовых) абавязкаў на час падрыхтоўкі і правядзення сесій Савета і пасяджэнняў яго органаў;

3.6. арганізуе ўзаемадзеянне Савета з іншымі Саветамі, выканаўчымі і распарадчымі органамі, іншымі арганізацыямі і органамі тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання;

3.7. забяспечвае галоснасць работы Савета;

3.8. арганізуе абмеркаванне грамадзянамі праектаў рашэнняў Савета, іншых важных пытанняў мясцовага значэння, забяспечвае шырокі ўдзел арганізацый і грамадзян у распрацоўцы, прыняцці і рэалізацыі рашэнняў Савета па пытаннях мясцовага значэння;

3.9. уносіць на разгляд сесій Савета пытанне аб датэрміновым спыненні паўнамоцтваў дэпутатаў Савета;

3.10. прымае да разгляду адрасаваныя яму запыты дэпутатаў Савета і дае на іх адказы ў парадку і тэрміны, устаноўленыя заканадаўствам;

3.11. забяспечвае разгляд паступіўшых у Савет зваротаў грамадзян і юрыдычных асобаў. Пры неабходнасці ўносіць прапановы па такіх зваротах на разгляд сесій Савета;

3.12. інфармуе Савет аб сваёй дзейнасці;

3.13. ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы, прадугледжаныя гэтым Законам і іншымі актамі заканадаўства.

Артыкул 16. Пастаянныя камісіі Савета

1. Для папярэдняга разгляду і падрыхтоўкі пытанняў, што адносяцца да распараджэння Савета, а таксама арганізацыі і кантролю за выкананнем рашэнняў Савета і вышэйстаячых у дачыненні да Савета дзяржаўных органаў на сесіях Савета з ліку дэпутатаў Савета выбіраюцца пастаянныя камісіі Савета. У Саветах пярвічнага ўзроўню пастаянныя камісіі, за выключэннем мандатных, могуць не ўтварацца.

2. Пастаянныя камісіі па пытаннях, што адносяцца да іх распараджэння, прымаюць рашэнні ў парадку, устаноўленым рэгламентам Савета.

3. Пастаянныя камісіі Савета ўзначальваюць старшыні пастаянных камісій.

4. У пасяджэнні пастаяннай камісіі Савета могуць браць удзел з правам дарадчага голасу дэпутаты, якія ўваходзяць у склад іншых пастаянных камісій гэтага Савета, запрошаныя старшынёй камісіі эксперты і іншыя спецыялісты, а таксама дэпутаты іншых Саветаў пры прыняцці рашэння, якое закранае інтарэсы грамадзян, якія пражываюць на тэрыторыі адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, у склад Савета якой выбраныя гэтыя дэпутаты.

5. Рэкамендацыі, якія ўтрымліваюцца ў рашэннях пастаянных камісій Савета, падлягаюць разгляду адпаведнымі дзяржаўнымі органамі, іншымі арганізацыямі. Аб выніках разгляду такіх рэкамендацый і прынятых мерах паведамляецца пастаянным камісіям Савета ў месячны тэрмін.

Артыкул 17. Кампетэнцыя Саветаў

1. Саветы ў межах сваёй кампетэнцыі ў парадку, устаноўленым заканадаўствам:

1.1. прадстаўляюць інтарэсы адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі ва ўзаемаадносінах з іншымі дзяржаўнымі органамі, іншымі арганізацыямі і грамадзянамі;

1.2. зацвярджаюць праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, мясцовы бюджэт і справаздачу аб яго выкананні;

1.3. зацвярджаюць прагнозы сацыяльна-эканамічнага развіцця адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі;

1.4. зацвярджаюць рэгіянальныя праграмы, канцэпцыі (Саветы пярвічнага ўзроўню — планы мерапрыемстваў) па пытаннях жыллёвага будаўніцтва, добраўпарадкавання адпаведнай тэрыторыі, дарожнага будаўніцтва, камунальна-бытавога і сацыяльнага абслугоўвання грамадзян, сацыяльнай падтрымкі дзяцей, моладзі, ветэранаў, інвалідаў і пажылых людзей, падтрымкі малога прадпрымальніцтва, аховы здароўя, адукацыі, фізічнай культуры і спорту, аховы навакольнага асяроддзя і рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў, паляпшэння ўмоў і аховы працы, забеспячэння радыяцыйнай бяспекі, аховы гісторыка-культурнай спадчыны і па іншых пытаннях мясцовага значэння, ажыццяўляюць кантроль за выкананнем гэтых праграм, канцэпцый (планаў мерапрыемстваў) і зацвярджаюць справаздачы аб іх выкананні;

1.5. вызначаюць у межах, устаноўленых законам, парадак кіравання і распараджэння ўласнасцю адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі (далей, калі не названа іншае, — камунальная ўласнасць);

1.6. распараджаюцца прыроднымі рэсурсамі ў выпадках, прадугледжаных заканадаўствам аб ахове навакольнага асяроддзя і рацыянальным выкарыстанні прыродных рэсурсаў, а таксама ажыццяўляюць кантроль за іх выкарыстаннем;

1.7. устанаўліваюць у адпаведнасці з законам мясцовыя падаткі і зборы;

1.8. прадастаўляюць або даручаюць выканаўчым і распарадчым органам прадастаўляць у парадку, вызначаным Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь і законамі, ільготы па падатках, зборах (пошлінах), якія цалкам выплачваюцца ў мясцовыя бюджэты;

1.9. вызначаюць стаўкі плацяжоў у выпадках, устаноўленых заканадаўчымі актамі (у тым ліку стаўкі платы за арэнду паляўнічых і рыбалоўных угоддзяў, водных аб'ектаў);

1.10. вырашаюць пытанні адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўпарадкавання;

1.11. прызначаюць мясцовыя рэферэндумы;

1.12. каардынуюць дзейнасць органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання;

1.13. садзейнічаюць развіццю прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці, сферы паслуг, малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, асабістых падсобных гаспадарак;

1.14. удзельнічаюць у ажыццяўленні мерапрыемстваў па захаванні і адраджэнні гісторыка-культурных каштоўнасцяў;

1.15. удзельнічаюць у папярэджанні і ліквідацыі надзвычайных сітуацый, выкананні мерапрыемстваў па грамадзянскай абароне, забеспячэнні пажарнай, прамысловай, ядзернай і радыяцыйнай бяспекі, ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС;

1.16. зацвярджаюць рэгламент і структуру Савета;

1.17. штогод зацвярджаюць каштарыс выдаткаў Савета;

1.18. вырашаюць пытанні прызнання паўнамоцтваў дэпутатаў Савета, датэрміновага спынення іх паўнамоцтваў;

1.19. выбіраюць і датэрмінова вызваляюць ад паўнамоцтваў старшыню Савета і яго намесніка (намеснікаў);

1.20. зацвярджаюць на пасадзе старшыню выканкама;

1.21. утвараюць і ліквідуюць органы Савета, зацвярджаюць і змяняюць іх склад, выбіраюць і вызваляюць ад паўнамоцтваў старшыню і намеснікаў старшыні (пры іх наяўнасці) гэтых органаў;

1.22. вырашаюць пытанні аб удзеле ў стварэнні асацыяцый, названых у частцы першай пункта 1 артыкула 7 гэтага Закона, аб уваходжанні або выхадзе з іх;

1.23. разглядаюць запыты дэпутатаў Савета і прымаюць па іх рашэнні;

1.24. заслухоўваюць справаздачы старшыні Савета, а таксама органаў Савета, службовых асобаў, якія выбіраюцца, прызначаюцца або зацвярджаюцца старшынёй Савета, справаздачы і іншую інфармацыю старшыні і іншых службовых асобаў адпаведнага выканкама па пытаннях, аднесеных да кампетэнцыі Савета;

1.25. вырашаюць пытанні дэлегавання асобных паўнамоцтваў Саветам іншых тэрытарыяльных узроўняў, выканкамам, іх старшыням, органам тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання;

1.26. вызначаюць тэрміны і парадак вызвалення ад выканання працоўных (службовых) абавязкаў дэпутатаў Савета, якія працуюць на падставе працоўных дагавораў (кантрактаў), на час падрыхтоўкі і правядзення сесій Савета і пасяджэнняў яго органаў;

1.27. адмяняюць не адпаведныя заканадаўству распараджэнні старшыні Савета і старшыні адпаведнага выканкама, рашэнні адпаведнага выканкама, рашэнні ніжэйстаячага Савета і распараджэнні яго старшыні;

1.28. выступаюць заснавальнікамі мясцовых сродкаў масавай інфармацыі;

1.29. прымаюць рашэнні аб самароспуску;

1.30. ажыццяўляюць міжнароднае супрацоўніцтва;

1.31. ажыццяўляюць іншыя паўнамоцтвы, прадугледжаныя гэтым Законам і іншымі актамі заканадаўства.

2. Паўнамоцтвы, прадугледжаныя падпунктамі 1.2, 1.5, 1.7, 1.11 пункта 1 гэтага артыкула, адносяцца да выключнай кампетэнцыі Саветаў. Паўнамоцтвы, якія адносяцца да выключнай кампетэнцыі Саветаў, а таксама паўнамоцтвы, прадугледжаныя падпунктамі 1.3, 1.4, 1.8—1.10, 1.16—1.30 пункта 1 гэтага артыкула, ажыццяўляюцца выключна на сесіях Савета.

Артыкул 18. Асаблівасці кампетэнцыі Саветаў абласнога ўзроўню

Саветы абласнога ўзроўню ў межах сваёй кампетэнцыі ў парадку, устаноўленым заканадаўствам:

забяспечваюць збалансаванасць бюджэтаў адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак на адпаведнай тэрыторыі;

рэгулююць парадак ажыццяўлення адміністрацыйных працэдур на адпаведнай тэрыторыі;

аказваюць дзяржаўную падтрымку юрыдычным асобам і індывідуальным прадпрымальнікам індывідуальна ў выглядзе змянення ўстаноўленага заканадаўствам тэрміну выплаты падаткаў і пеняў, якія цалкам выплачваюцца ў мясцовыя бюджэты, выдзялення бюджэтных сродкаў з мясцовых бюджэтаў, вызвалення ад пералічэння ў бюджэт даходаў, атрыманых ад перадачы ў карыстанне маёмасці, якая знаходзіцца ў камунальнай уласнасці, на ўмовах, аналагічных вызначаным Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь;

зацвярджаюць гранічны памер доўгу органаў мясцовага кіравання і самакіравання на чарговы фінансавы год;

вызначаюць меры сацыяльнай падтрымкі дзяцей, моладзі, ветэранаў, інвалідаў і пажылых людзей;

зацвярджаюць прыкладнае палажэнне аб органе тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання;

прысвойваюць званне ганаровага грамадзяніна вобласці (горада Мінска), вызначаюць парадак прысвоення такога звання і асаблівасці статусу ганаровага грамадзяніна;

ажыццяўляюць іншыя паўнамоцтвы, прадугледжаныя гэтым Законам і іншымі актамі заканадаўства.

Артыкул 19. Асаблівасці кампетэнцыі Саветаў базавага ўзроўню

1. Саветы базавага ўзроўню ў межах сваёй кампетэнцыі ў парадку, устаноўленым заканадаўствам:

1.1. зацвярджаюць тэрытарыяльныя планы развіцця раёнаў, генеральныя планы гарадоў раённага падпарадкавання і іншых населеных пунктаў, размешчаныя на адпаведнай тэрыторыі;

1.2. зацвярджаюць гранічны памер доўгу органаў мясцовага кіравання і самакіравання на чарговы фінансавы год;

1.3. прысвойваюць званне ганаровага грамадзяніна адпаведна горада, раёна, вызначаюць парадак прысвоення такога звання і асаблівасці статусу ганаровага грамадзяніна;

1.4. ажыццяўляюць іншыя паўнамоцтвы, прадугледжаныя гэтым Законам і іншымі актамі заканадаўства.

2. Гарадскія Саветы (гарадоў з раённым падзелам) акрамя ажыццяўлення паўнамоцтваў, названых у пункце 1 гэтага артыкула:

2.1. вылучаюць кандыдатаў у члены калегіяльных органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання;

2.2. ажыццяўляюць кантроль за дзейнасцю органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання;

2.3. у выпадку, прадугледжаным абзацам трэцім артыкула 32 гэтага Закона, прымаюць рашэнне аб ліквідацыі калегіяльнага органа тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання.

Артыкул 20. Асаблівасці кампетэнцыі Саветаў пярвічнага ўзроўню

Саветы пярвічнага ўзроўню ў межах сваёй кампетэнцыі ў парадку, устаноўленым заканадаўствам:

уносяць у Савет і выканкам базавага ўзроўню прапановы па сацыяльнай абароне грамадзян;

уносяць у Савет базавага ўзроўню прапановы аб памерах адлічэнняў ад мясцовых падаткаў і збораў, сумах датацый у бюджэты пярвічнага ўзроўню;

вылучаюць кандыдатаў у члены калегіяльных органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання;

зацвярджаюць палажэнне аб аднаасобным органе тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання;

ажыццяўляюць кантроль за дзейнасцю органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання;

у выпадку, прадугледжаным абзацам трэцім артыкула 32 гэтага Закона, прымаюць рашэнне аб ліквідацыі калегіяльнага органа тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання;

ажыццяўляюць іншыя паўнамоцтвы, прадугледжаныя гэтым Законам і іншымі актамі заканадаўства.

Артыкул 21. Старшыня Савета

1. Дзейнасцю Савета кіруе старшыня Савета, падсправаздачны Савету, які яго абраў.

Старшыня Савета з'яўляецца дзяржаўным служачым.

2. Старшыня Савета абіраецца з ліку дэпутатаў на сесіі адпаведнага Савета шляхам тайнага галасавання і выконвае свае абавязкі да адкрыцця першай сесіі Савета новага склікання.

3. Кандыдатуры на пасаду старшыні Савета абласнога ўзроўню ўносяцца дэпутатамі адпаведнага Савета, кандыдатуры на пасаду старшыні Савета базавага ўзроўню — дэпутатамі адпаведнага Савета і старшынёй вышэйстаячага Савета. У тым жа парадку ўносяцца прапановы аб датэрміновым спыненні паўнамоцтваў старшыні Савета.

Старшыня Савета лічыцца абраным, калі за яго кандыдатуру прагаласавала больш за палову ад колькасці абраных дэпутатаў адпаведнага Савета.

4. Старшыня Савета першаснага ўзроўню адначасова па пасадзе з'яўляецца старшынёй адпаведнага выканкама. Асаблівасці парадку абрання старшыні Савета першаснага ўзроўню вызначаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

5. Паўнамоцтвы старшыні Савета датэрмінова спыняюцца па падставах і ў парадку, вызначаным законамі Рэспублікі Беларусь ад 27 сакавіка 1992 года «Аб статусе дэпутата мясцовага Савета дэпутатаў» (Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1992 г., № 13, ст. 217; Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2006 г., № 6, 2/1181) і ад 14 чэрвеня 2003 года «Аб дзяржаўнай службе ў Рэспубліцы Беларусь» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2003 г., № 70, 2/953), і па іншых падставах у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі.

Артыкул 22. Кампетэнцыя старшыні Савета

1. Старшыня Савета ў сваёй дзейнасці кіруецца Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, гэтым Законам і іншымі законамі Рэспублікі Беларусь, актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, пастановамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, нарматыўнымі прававымі актамі рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, а таксама рашэннямі вышэйста

Свидетельство о регистрации Правил рекламной игры № 1605 от 30 ноября 2009 г. выдано Министерством торговли РБ.

Поздравляем победителей рекламной игры

«ЗИМНИЕ ПОДАРКИ ОТ ТМ ПРИНЦЕССА НУРИ, ПРИНЦЕССА ЯВА И ЖОКЕЙ»

Сроки проведения: с 3 декабря 2009 года по 20 января 2010 года

Благодарим за участие всех обладателей призов и желаем удачи в будущих играх!

г. МИНСК

Фильтр для воды

Альхименок В.Н.
Андрушкевич В.И.
Арапов А.В.
Багик А.Л.
Бейманов С.Е.
Беляева Н.А.
Бондарь Е.Д.
Бубен Н.Ю.
Бубнов А.В.
Бурдина Т.И.
Василевский В.И.
Волкова Е.А.
Воронко А.Г.
Воропай Б.И.
Галацевич Е.П.
Гвоздь П.А.
Гиль Н.П.
Головач Л.Т.
Дедовец И.В.
Денисеня Л.А.
Долгая Л.Н.
Долженок Т.Н.
Дурсунов И.Н.
Евсеев Д.Л.
Езерская О.Н.
Есьманович С.П.
Жадинец Ю.Н.
Жарская Н.С.
Забенько Т.Л.
Зеленко В.В.
Зинченко Н.Я.
Ивчиков Ю.П.
Ильковец М.М.
Калиновский И.Н.
Капура Д.В.
Катарушкина А.В.
Ковалевский В.С.
Колесникова Е.В.
Корзун Е.Д.
Красник А.И.
Куница Т.А.
Купревич П.А.
Куркач С.Ф.
Лазарев С.А.
Лобосов А.А.
Малашенко В.В.
Матвеева Н.П.
Машлякевич И.Г.
Николаева С.А.
Паевская Е.А.
Писарик З.А.
Прохоренко О.Е.
Речная О.И.
Романчук М.А.
Рубцкий М.В.
Савосько И.М.
Самович Н.А.
Сущ А.Н.
Талей Ю.М.
Танов Д.А.
Тарасенко В.В.
Тульский А.Н.
Федорович Г.А.
Шевель В.А.
Шерешев С.А.
Шерман А.А.
Шиповчик А.Г.
Шуляк Е.И.
Юшкевич А.А.
Якубовская Н.А.
Яриго О.В.

Салфетка

Аникеева В.А.
Анфимова Т.А.
Арапова О.В.
Афанасенко А.А.
Баранова Л.П.
Беланович О.М.
Бельская Л.В.
Бертош П.В.
Борисова О.Е.
Босько Ю.Г.
Веремейко Ю.В.
Вишнякова Л.В.
Войцеховский В.Е.
Волчек С.В.
Воробей Д.П.
Гаврюшенко А.В.
Галушка А.С.
Гарбарь В.С.
Гиско Л.Г.
Глойскич В.В.
Головач Л.Т.
Гриб Н.Н.
Гричановский В.В.
Гузева О.В.
Гук Е.А.
Густинович И.А.
Гутник К.И.
Денисова В.А.
Евменчик Т.А.
Евтух Т.В.
Жданович И.С.
Жибуль М.С.
Жук В.А.
Зайцева С.В.
Зозон Е.А.
Иванова А.Н.
Иванчиков Ю.П.
Ивашкова Ю.Л.
Камяк Е.Н.
Канапацкий З.И.
Карачева М.С.
Кароль А.В.
Качпирович Е.В.
Кищов С.А.
Князева А.Ф.
Колесникова Е.В.
Колочева Т.С.
Конеский В.И.
Коробов А.М.
Котковец А.В.
Крылова Н.В.
Лельюшиц А.К.
Лобач А.Л.
Лохматова Е.А.
Лукашевич И.В.
Лунанская Т.В.
Ляхова Г.П.
Малец О.И.
Маньчевская Е.И.
Матвеева Н.П.
Миланкквич А.Н.
Милованов М.В.
Минич Г.В.
Мирошкина К.Л.
Мицута Ю.В.
Мороз Т.В.
Мосевич Н.И.
Нагорная Е.Д.
Ованова О.А.
Парамонова Ж.К.
Плескова Н.В.
Полещенков С.А.
Поретская С.В.
Равино А.С.
Рогатко Г.И.
Родовская С.В.
Севашко И.В.
Северина Е.В.
Сивая Г.А.
Сидорович В.П.
Смолонская В.М.
Сокновец А.А.
Соколенко М.Н.
Соколова Т.И.
Спасаева Г.М.
Спригис И.Р.
Старовойтов В.А.
Столпнер Н.И.
Стреж О.В.
Телятицкий А.А.
Тищенко А.В.
Трус С.Н.
Тулач Д.В.
Уртан С.А.
Федорчу М.М.
Федотова А.А.
Филипчук О.В.
Филько Е.П.
Фридман И.В.
Хмелевская Л.В.
Хохлов А.А.
Худовец Р.М.
Чадович Е.С.
Чаный В.В.
Чеканович Р.И.
Черноморец М.Е.
Черняк И.Н.
Чечко Т.Л.
Чуприк И.В.
Шавейко Р.С.
Шароваров А.Г.
Шевцова Л.И.
Шидловская И.В.
Ширшова Л.В.
Шпилевская А.А.
Шульган Е.В.

Кружка

АБД Аль-Маджид А.А.
Андриевсая В.К.
Арсентьев В.Е.
Бабкин А.В.
Баленко Д.Б.
Белявская К.Н.
Божко В.А.
Борискевич З.А.
Босько Ю.Г.
Брагинас Э.А.
Гайлович О.Б.
Ганус А.А.
Гарбуз Д.А.
Герасимчук Т.Д.
Голонцова Е.В.
Грищенко В.Н.
Дворкина А.И.
Дзюбан Д.И.
Дорохович Т.А.
Дорош Д.А.
Дудицкая О.Е.
Евменчик Т.А.
Емельянченко В.С.
Ерей Ю.В.
Ефименко Н.С.
Жалинко К.Б.
Жибуль В.М.
Жук И.И.
Иасабасова Ю.В.
Каленников С.И.
Калиновский И.Н.
Каменов С.И.
Капустинская О.М.
Киселева Е.В.
Кичевский А.А.
Клим Е.В.
Кожевников А.М.
Комар А.Н.
Коротченя Ю.М.
Кудревич А.Н.
Кузнецова Т.И.
Курнушко А.И.
Кфеневич А.А.
Лагацкая Ю.В.
Лагун С.А.
Лажаник М.В.
Лемонтович Н.А.
Липницкая Н.П.
Лобановская Л.А.
Лойко К.Ю.
Лохматова Е.А.
Лунгур В.В.
Макаревич И.В.
Макаров С.Г.
Малашевич Т.В.
Матвеева Н.С.
Мацкевич И.М.
Морозова Т.А.
Мурина Е.В.
Наледько В.А.
Новиков А.В.
Озерова Н.В.
Олейник Д.Ю.
Остроумов В.К.
Пинчук И.В.
Пинчук И.В.
Попало В.И.
Працкевич О.А.
Прохоренко О.Е.
Рубанова Ю.Л.
Рымжа В.Г.
Санько И.В.
Саркисян Е.М.
Семенихин А.А.
Сенюк В.В.
Слонская И.Ф.
Смолич С.В.
Смолова И.В.
Снежко Е.О.
Соколенко М.Н.
Ставер А.Н.
Толкачева Л.В.
Траулько Е.А.
Усик Г.П.
Федорченко Т.М.
Филатов Д.В.
Хованева А.Г.
Хорошко Д.В.
Хотянович И.Л.
Четверин И.И.
Шидловская И.В.
Шляхто О.Е.
Явид Р.А.
Ярош Д.Н.

Подставка под чайный пакетик

Абрамович О.Р.
Андреева Е.А.
Антонович Л.Л.
Афанасенко А.А.
Богдан В.В.
Богдан Е.В.
Бондаренко Е.И.
Борисова В.М.
Борткевич И.А.
Боярчук Ю.М.
Бурец А.В.
Бутринович М.Н.
Быстрова А.Н.
Важин К.А.
Варидова И.Г.
Воропай Б.И.
Галушка А.С.
Гекшин Д.Б.
Герасименко С.Н.
Говако Е.И.
Домбровская Н.В.
Загоренин Я.Г.
Захаревич А.М.
Зверин И.В.
Казакова В.А.
Канецкий Л.З.
Кардава Г.Г.
Кароткина Т.Н.
Киеня Е.Ю.
Ковалевский С.Ю.
Ковальчук Т.И.
Козик М.В.
Коснико А.Г.
Костюкович С.А.
Крук Д.С.
Крысова Н.И.
Кудрявцев В.М.
Кунцевич В.Г.
Курилик А.А.
Курпяк А.Ф.
Ладкова Е.А.
Лохова Г.Ю.
Лукверчик Н.В.
Майсюк Е.И.
Макаревич И.А.
Максимочкина Т.Е.
Маршина В.Т.
Махнач В.С.
Меньшикова В.А.
Мескина В.М.
Микулич Т.А.
Мишина Т.В.
Моисеенко А.М.
Муравейко В.А.
Напреев М.М.
Никонович Ф.А.
Новис С.Л.
Переход И.Ю.
Писанова Н.П.
Погорельская Л.С.
Поляков Д.Г.
Приступа Ю.В.
Протасеня П.В.
Пухтеева М.Н.
Ремкин А.А.
Родовская С.В.
Рубкий А.Н.
Садовский Д.Г.
Салаун О.А.
Санько И.В.
Скребец И.И.
Слесарев А.Г.
Солонник Т.С.
Стаденова Т.А.
Стальная В.А.
Сушко И.В.
Тихонова Е.Л.
Трафимова А.В.
Трус С.Н.
Усоская О.А.
Фёдорова В.Ф.
Хорликов А.А.
Чеховская Н.В.
Чупринев Р.В.
Шахно С.В.
Шип А.А.
Шпилевская А.А.
Щемелев А.А.
Юхневич В.П.
Янучек Е.И.

г. МОГИЛЕВ

Салфетка

Ахмедова Н.Ш.
Бибикова М.М.
Васильков Д.В.
Евтушенко О.А.
Жарикова Т.Т.
Жолудева С.Э.
Казлова А.Л.
Карелина Е.В.
Каунова Т.П.
Кирилова Е.И.
Колягина Н.С.
Коровин А.А.
Куприянова Е.С.
Макаренко М.М.
Михаленко Е.Р.
Никифоров Н.Н.
Новиков П.А.
Новицкая Е.А.
Пантелеева И.В.
Панфилович А.Н.
Парфенова А.В.
Пицукова В.Ю.
Подольских Н.М.
Позднякова И.В.
Русаков Ю.Н.
Рыбалко А.Л.
Рыжков Л.В.
Семенов Д.М
Степанова А.Ю.
Тарасенко Е.П.
Таченок А.В.
Титов О.В.
Фатеева А.В.
Хомченко В.И.
Церковна Е.А.

Кружка

Андрейчик Е.В.
Аринненко Н.В.
Баханович О.О.
Безмен Н.В.
Блюшева Р.А.
Боброва Н.В.
Болынцевич А.Е.
Буглакова О.М.
Горбунова А.В.
Гуслева О.Н.
Дайнеко В.Ф.
Демьянкова Ю.Е.
Загорей Е.А.
Зеленкова Е.Р.
Карамазин А.П.
Клишенкова И.М.
Конопелько Н.Н.
Кутола Н.П.
Липская И.Н.
Логвина Л.М.
Ломаченко С.В.
Манцевич К.А.
Манченко В.О.
Маркова Т.М.
Моисеева Л.В.
Никонова А.Н.
Очкасова О.А.
Павлова А.В.
Пастухова Н.А.
Перепечина Е.Н.
Потапенко Л.А.
Табец И.В.
Таратынко Э.А.
Тимошенко Г.А.
Ткачева Е.Н.
Трегубова А.В.
Увырь К.Н.
Ускова О.В.
Царанкова А.Н.
Чипиченко Е.И.
Шамына Е.А.
Шапиро М.И.
Щербакова О.В.
Юносова В.Д.
Янушевская А.В.

Подставка под чайный пакетик

Абушкевич С.В.
Апалькова Ю.В.
Блюшева Р.А.
Буксанова Е.О.
Вишняк О.В.
Войтова М.В.
Головочев В.Н.
Гриченков С.С.
Дроздовская Н.М.
Жеребов П.А.
Иванова И.М.
Колеснев Д.М.
Кораблева В.В.
Кравцова С.А.
Кундикова Е.М.
Логвин В.И.
Магедов Ю.В.
Маликова Е.А.
Моргунова А.А.
Новосад К.А.
Патапенко Л.А.
Плотникова Т.В.
Рафеева Ю.А.
Стаблецкий Д.В.
Титов О.В.
Тихановская Е.В.
Фирсова Н.М.
Ходырева Е.В.
Черномордова А.Е.
Шевченко И.А.
Шиленко А.Ю.
Юносова В.Д.

г. БРЕСТ

Салфетка

Бондаренко В.С.
Борисюк И.Г.
Ботаева Д.В.
Верешко Н.В.
Гоза М.А.
Грицук Д.И.
Грицук Е.С.
Дольникова З.П.
Казяба С.А.
Киселева И.Е.
Климова Ф.Т.
Климова Ф.Т.
Козачек А.А
Колесникова А.Ф.
Котович В.Ф.
Коток Н.А.
Кудина Д.С.
Лахтюк М.Н.
Лемешев В.А.
Лецкий В.Л.
Лось Л.П.
Лучинович Т.Н.
Лшава С.Я.
Маркевич В.И.
Мармозова В.Т.
Мартынюк В.Г.
Мицевич Н.А.
Мышкович А.Д.
Ничипорук А.Н.
Ничипорук А.Ю.
Оборцева Е.М.
Петренко А.В.
Попов А.В.
Приемко А.В.
Рункер В.М.
Рыбакова Н.И.
Савенков А.А.
Сегенчук Л.М.
Сех О.В.
Скурамова С.В.
Соловьева Л.Г.
Соловьева М.Г.
Сулима В.Н.
Супрунюк В.А.
Талай А.Н.
Тищенко С.М.
Третьяк А.П.
Трифонюк В.И.
Фолитарик Е.А.
Харламова Е.В.
Чипенко Н.П.
Ярмошевич Г.Н.

Кружка

Абакумов А.А.
Авдеева А.К.
Акопян С.С.
Антонюк С.Н.
Болабанова Ю.В.
Бондарук А.И.
Василенко А.М.
Воробьева Л.С.
Гайдаленок С.В.
Горбач В.В.
Давиденко В.А.
Дедчик И.А.
Денищиц В.М.
Диноне Л.Ф.
Дмитроченко И.С.
Журак В.Н.
Захаров П.В.
Калита Е.С.
Карниевская Т.М.
Кастелей М.Н.
Кибирева Е.М.
Кириенков В.В.
Козак А.В.
Колпачук А.П.
Колупаева Е.А.
Колупаева Е.А.
Колядичь Т.И.
Кондратьев В.М.
Кубан Е.С.
Кулай Д.М.
Куц Н.Л.
Малыха Т.И.
Маркевич К.Е.
Мармозова В.Т.
Матвеюк П.В.
Михновец В.В.
Мишевич Л.В.
Невзорова Д.С.
Нестерович И.А.
Нестерук С.Л.
Панасюк А.К.
Пашук Е.В.
Пиконюк М.Н.
Романюк Т.И.
Тарновская В.А.
Томачева Е.О.
Тур Л.М.
Усик А.В.
Шерстобытова А.В.
Штык Н.В.
Щисюк А.М.

Подставка под чайный пакетик

Андриюк Е.Н.
Антонюк Е.С.
Булава Е.М.
Гаврилова Е.Ю.
Гапанович Е.Н.
Герасимик О.Н.
Гончаревич А.Н.
Горун А.С.
Гуко Е.Н.
Дацук В.Н.
Дмитрук О.И.
Добрыянец Р.П.
Дудень Д.А.
Жедик А.А.
Измайлов С.В.
Калчик А.В.
Кастюкевич А.В.
Кендрук Т.И.
Китель И.И.
Ковальчук Е.С.
Ковальчук Н.В.
Коплевич О.П.
Косинкова С.П.
Лукашик Н.Н.
Любчук Д.В.
Мазоко Р.С.
Малунова Н.И.
Мулярчик В.С.
Олексюк Е.Л.
Олиферук М.Т.
Парфинюк Э.В.
Пастерук Л.Н.
Петручик С.В.
Печко С.В.
Прокопчук Л.С.
Савицкая А.В.
Селекова М.С.
Сенюк И.А.
Серафимович Т.С.
Сизова Д.Е.
Супрунюк И.В.
Сыцевич Е.А.
Сыч Н.С.
Сюваткина М.А.
Татаринова Л.П.
Тропик В.Г.
Угляница А.С.
Урбанович В.В.
Хайко М.А.
Харченко О.П.
Цонева И.М.
Шелест Т.И.
Якунина С.П.

г. ГРОДНО

Салфетка

Бабина В.А.
Бороднок А.Э.
Бубнович О.И.
Буслаев А.С.
Валько В.Ю.
Вишневский В.И.
Герасимюк С.А.
Гиль О.Л.
Гребень Т.С.
Гринкевич Е.М.
Гришко В.Ю.
Дешкевич Д.Ю.
Довнар М.И.
Евсеенко В.В.
Зайко Г.В.
Калетинская А.Н.
Кардаш Б.И.
Карпукович Т.В.
Качерга В.В.
Ковалев А.В.
Ковель Л.Л.
Колыванова Д.В.
Котанович Н.Г.
Кощей В.В.
Крапивин С.Г.
Кувялов Д.В.
Куратник О.Н.
Курыла Е.Ю.
Лозовский М.А.
Ляшук Н.В.
Менько Т.Ф.
Можейко Ю.С.
Мукосей А.А.
Никитин К.А.
Николаев В.Н.
Обухович П.И.
Петрович В.Ф.
Петушинская Ж.Л.
Пивоварчик А.С.
Садовский Я.Я.
Сезик А.И.
Соловей В.Ф.
Табала И.И.
Тарсевич Т.Е.
Толочко Д.Е.
Трамбицкая Н.И.
Утлик Е.Н.
Утлик Е.Н.
Федорович П.А.
Фолькут В.А.
Шепетюк М.А.
Шкнай А.А.
Янушкевич А.Ю.
Ярмолов А.А.

Кружка

Адамович Е.Е.
Акатова И.С.
Алещик П.А.
Антончик А.Н.
Атока А.Э.
Багрим А.Н.
Балобан Г.А.
Будько С.П.
Бусько А.О.
Быстров В.Ю.
Валько В.Ю.
Волошина Е.И.
Воропай В.С.
Ганевич А.В.
Гапанович Т.В.
Гончарова Н.В.
Горбач О.В.
Горелик И.З.
Данилович А.Н.
Дейко Ю.И.
Денисик П.А.
Дойлидко А.И.
Дорошин П.В.
Жлобо С.И.
Иванов А.Г.
Кирчук Е.А.
Колбович Н.В.
Колесник А.Н.
Кот А.К.
Кочеткова Д.А.
Кубасов С.О.
Кузьмич Т.А.
Курец Т.П.
Лукашевич Н.А.
Макей Л.С.
Манько А.В.
Марчук Е.А.
Масловская С.П.
Маслякова Д.С.
Микулич А.Т.
Нефедова Д.И.
Николайчук В.В.
Носич В.А.
Остапов Ф.П.
Панасевич О.Ф.
Парфинович В.К.
Пеньковский В.Р.
Плетнев М.Э.
Романчук Н.В.
Рухлевич Е.Н.
Салалайка А.Н.
Севрук М.А.
Семашко И.А.
Стасюкевич В.Р.
Сувало А.А.
Ткаченко А.В.
Тодорович О.А.
Урбанович А.В.
Усманова Д.Б.
Халесик О.А.
Хвесюк И.Я.
Шавлюга Е.Д.
Щепелев В.Ю.
Элин А.И.

Подставка под чайный пакетик

Барилко И.Н.
Беспалова М.В.
Будник Е.В.
Будровская Е.С.
Буслаев А.С.
Бык А.В.
Васильева Г.А.
Волкова М.А.
Детченя О.С.
Дятлова Е.О.
Журавлев А.В.
Зайко Г.В.
Зиньков С.Н.
Иванцов С.И.
Калмыкова Ю.К.
Карловская Т.В.
Карпейчик С.В.
Карпук А.А.
Козлова С.Ю.
Корытко В.И.
Куликовский А.О.
Леонова И.Ф.
Лис С.Н.
Лукьяненко А.А.
Максимович В.Б.
Нефедова Д.И.
Обухович П.И.
Пучило Н.Н.
Редько В.В.
Романчук С.Н.
Салалайка А.Н.
Саранчукова И.В.
Севашко А.А.
Сезеневская А.Г.
Семинский Н.Н.
Суковило С.В.
Тумель Е.И.
Шагун А.К.
Шайтор Д.Ф.
Шведко М. В.
Юрчук О.А.
Якута В.Б.
Ярошевич Т.С.

г. БОБРУЙСК

Салфетка

Альцыванович В.К.
Барисова Е.Е.
Березкина Е.Г.
Болтушкина И.С.
Бочаров В.Ю.
Будник Н.Г.
Голодник А.Ю.
Горошко В.С.
Гульченко Н.Г.
Дубин Д.Л.
Дударь В.В.
Круглов О.В.
Кузнецов Д.А.
Макарова К.В.
Макеева О.Г.
Маханько С.И.
Митрахович О.И.
Млынарчик Е.Ф.
Мосцик Ю.Ф.
Нимказ Ю.И.
Одинец А.В.
Панакович Т.И.
Пантюх С.С.
Пинчук Д.А.
Писарка А.Ю.
Рак Е.Ю.
Рекиш В.В.
Савченко Л.М.
Савченко Л.Н.
Тимченко О.В.
Чочиева М.С.
Шаева С.В.
Шивкова О.В.
Юшкевич Е.Н.
Янкова И.М.

Кружка

Артемьева К.В.
Артюшевичя Н.Г.
Багавудинова Н.М.
Белоусова Я.И.
Вербицкая С.С.
Давыдова О.П.
Зенько С.П.
Курилло Т.В.
Марченко Е.В.
Нашук Т.В.
Попов В.А.
Рогожкина Г.Ф.
Серебрякова Л.П.
Силич Н.А.
Слюньков И.В.
Тычина Г.П.
Черкас О.А.
Яковлев Д.Л.
Яковлева Н.П.
Яцук Т.Н.

Подставка под чайный пакетик

Архипенко А.Г.
Барковская А.М.
Белоусова Я.И.
Бычков А.А.
Воронко Г.А.
Ганысенко М.С.
Горшков В.В.
Гребень Н.П.
Гуринович О.М.
Дергач Д.В.
Дзячук Е.Г.
Жевняк И.Н.
Зенько С.П.
Колесникович О.В.
Костко А.Л.
Лагук А.А.
Лаптина И.С.
Лисица П.Н.
Маруденко М.Н.
Морозова А.И.
Мурашко В.Е.
Павловская А.А.
Перова Т.Н.
Просветова В.И.
Римовова А.И.
Савченко Н.А.
Сахарова Г.В.
Селезнев И.В.
Серцепя Н.И.
Чистякова А.А.
Чочиева М.С.
Шестакович К.С.
Шило О.А.
Эдалева Е.Б.
Яковлева Н.П.

г. ВИТЕБСК

Салфетка

Александрова М.Ф.
Васильева Л.К.
Веремерева А.Ю.
Воронина Р.Ф.
Воронов И.С.
Гетманова П.А.
Голосова С.И.
Горовая Ю.Ф.
Денисов В.В.
Евдокимов Н.Н.
Евдокимова Ю.П.
Ермакова А.В.
Кандерская Н.В.
Колегова О.В.
Кондерская Н.В.
Кондратюк Н.В.
Лазакович И.В.
Лоханов А.А.
Матросова А.А.
Мишук В.И.
Пуховская К.В.
Савицкий А.Д.
Сляская В.О.
Сляская В.О.
Сохрамная Л.В.
Целуйко Д.В.
Юхимук Д.В.

Кружка

Башлакова А.Г.
Бирюк О.В.
Бобрик О.Н.
Бочевар Ю.С.
Бычковская Е.Ю.
Гаврилеенко Л.Д.
Говорухин В.Н.
Дервоед Л.Ю.
Домилова З.И.
Дорожкин С.А.
Егорова Т.А.
Ермашкевич Д.В.
Званцова Т.В.
Иванов И.М.
Калиновский П.Н.
Картавая Е.А.
Конюхова А.С.
Корнев К.С.
Крупень Ю.Н.
Крылова К.А.
Крышевич Л.И.
Максимов В.В.
Малах А.О.
Малиновская М.И.
Масловская К.А.
Медлошо Н.Н.
Морозенко Н.Ф.
Нагорская Ю.К.
Наханькова С.А.
Панамаренко Л.И.
Силицкая Ю.М.
Стригалева Е.Н.
Туржанская Л.А.
Шестопалова Н.В.
Шибутович Е.Е.

Подставка под чайный пакетик

Богданова Е.К.
Варша И.М.
Дежурко Л.Г.
Егоров А.П.
Еловой Я.М.
Ильина З.В.
Ильюшенко А.В.
Ильюшенко А.Е.
Ильюшенко Д.А.
Ильюшенко Д.А.
Казаченко А.В.
Канцедал О.В.
Кондерская А.П.
Коновалюк В.В.
Коновалюк В.В.
Коновалюк В.И.
Коновалюк Г.И.
Конюхова Н.В.
Костюченко А.А.
Крупень Ю.Н.
Кугач М.К.
Кудьма Е.М.
Любочка В.А.
Малах А.О.
Малах М.Н.
Пропольский Д.А.
Рута Ю.А.
Сакивич В.Н.
Сляская З.И.
Сляский О.И.
Смолова С.В.
Соколова А.И.
Степанец Л.Н.
Федоров А.Н.
Федорова И.П.

г. ГОМЕЛЬ

Салфетка

Белогуб Е.Н.
Васьков А.Ю.
Вить С.А.
Драпеза Ю.А.
Дюбинкова А.Д.
Евменова О.В.
Елисеева Е.И.
Климович Г.Е.
Колесник Е.Г.
Лапин А.С.
Струговец А.С.
Шкрабов С.В.
Якутович О.В.

Кружка

Аникеенко А.И.
Арещенко Е.В.
Атрощенко В.Г.
Гавриков И.А.
Гец И.Е.
Говриленко А.В.
Горская Н.П.
Диканкова М.Н.
Елисеева Е.И.
Карасеева О.Л.
Коленчук П.В.
Короедова Л.Е
Кравченко А.С.
Михальков И.А.
Михалькова Л.М.
Москалёва С.А.
Мурзина Г.М.
Одарченко Л.Ф.
Павлушкина Е.А.
Падуто С.И.
Пузиков П.А.
Радченко Д.А.
Разюкова О.А.
Скачок И.С.
Слиян О.И.
Старавойтова З.Я.
Щербакова В.С.
Юрченко О.В
Яковцова И.В.

Подставка под чайный пакетик

Антоненко Г.К.
Атрощенко Г.Н.
Бобрук Т.Г.
Гончарова И.С.
Гордиенко Е.В.
Гутник Т.В.
Ковалёва Е.В.
Кочукова Н.И.
Крохин Ю.Н.
Крючкова И.О.
Лабушева О.И.
Москалёв Л.А.
Павлецова Н.Н.
Послуянова Г.П.
Разюкова О.А.
Рогалевич И.С.
Сергеенко Ю.Ю.
Шишканова Ю.И.
Шляхтенко А.Н.

г. ПОЛОЦК/ НОВОПОЛОЦК

Салфетка

Александрович Д.А.
Афанасьева К.В.
Готовец Н.П.
Давидовская Е.Л.
Зарецкий И.В.
Иванова Л.Д.
Кирякова Т.В.
Козловская М.Н.
Костылева И.И.
Овдеенко А.А.
Огородников И.М.
Рсецкий В.П.
Савицкая Е.М.
Сушков А.В.
Урбанович А.Ф.
Фридрих Н.В.
Шевлова Т.А.

Кружка

Афанасьева К.В.
Глыцких В.М.
Горбатенко В.В.
Делидович И.Г.
Иванов И.И.
Карпова С.В.
Клепец А.В.
Федоренко И.Н.
Шпаков В.П.

Подставка под чайный пакетик

Аксенова О.В.
Аксюто С.Е.
Александров С.С.
Афанасьева Ю.Н.
Булавкина Т.И.
Войлох И.Л.
Гайкова Н.Н.
Глыцких В.М.
Горохов А.А.
Жегун Е.В.
Кручинина Т.В.
Крюк В.И.
Куканова Е.А.
Кухаренко О.В.
Лебедева А.М.
Лееов С.М.
Милюк О.А.
Петров С.В.
Петровская В.И.
Путова Л.М.
Пухальская И.Д.
Рудницкая Я.Ф.
Сердюк Н.В.
Синович А.С.
Соранена Л.В.
Спириденок Д.В.
Стебрецова Т.В.
Федоренко И.Н.
Харлан И.Ю.
Хлебущев Е.Е.
Хлопов А.Н.
Цуганис И.П.
Чернова П.М.
Якбенко И.П.
Яковлева О.В.

Телефон «горячей линии»
8 (029) 322-42-52

Купляй, але правярай

ЯК ПЕРААБУЦЦА, КАБ НЕ ЗАСТАЦЦА З НОСАМ?

Вы ўжо, напэўна, зразумелі, што сёння гаворка пойдзе пра абутак. Пачнём з гісторыі, якую паведаміла нам Таццяна (прозвішча папрасіла не называць, маўляў, «каму трэба, той пазнае, а за папулярнасцю я не ганюся») з Мінска.

Яшчэ ў верасні маладая маці набыла для сына на Камароўскім рынку зімовыя чаравікі. Абышліся яны ёй у 130 тысяч беларускіх рублёў. Праз некалькі дзён нашэння на адным з іх пачало разыходзіцца шво. Жанчына папрасіла індывідуальнага прадпрымальніка вярнуць грошы. У адказ пачула: «Вы не маеце права патрабаваць грошы, бо дэфект абутку незначны». І прапанавала правесці рамонт бясплатна.

— Калі я прыйшла забіраць чаравікі, то слядоў чаканага рамонту не ўбачыла, — распавядае Таццяна. — Ніткі былі проста ўпраўленыя, а падэшву ніхто дадаткова не прашываў. У адказ на сваё абурэнне няякасным рамонтам пачула: «Разыдуцца ніткі яшчэ раз, не перажывайце, памяняем без гарантыі».

Больш верыць на словы Таццяна не рызыкнула. Адразу ж напісала заяву з просьбай вярнуць грошы. У той жа дзень прадпрымальнік патэлефанавала і сказала, што едзе на экспертызу.

— Маўляў, калі хочаце, таксама можаце пад'ехаць. Я ёй патлумачыла, што жыву далёка, не ў цэнтры Мінска. Больш за тое, у мяне маленькае дзіця, таму я не магу

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ў любы момант сарвацца і прыехаць. Праз нейкі час яна, задаволеная, тэлефануе зноў і кажа, што эксперт пацвердзіў, праўда, вусна, што з абуткам усё ў парадку. Мне аддалі чаравікі і сказалі заплаціць сорак тысяч рублёў за экспертызу (на чэку значылася сумнеўнае: «ахвяраванні на развіццё арганізацыі»).

Таццяна вырашыла ісці да канца. Неадкладна пракансультавалася ў юрыста, які і дапамог напісаць прэтэнзію ў адрас індывідуальнага прадпрымальніка. Пасля звярнулася ў экспертную арганізацыю: у выніку экспертызы было выяўлена ажно тры (!) дэфекты. Калі ўсе доказы былі на руках, жанчына падала іск на індывідуальнага прадпрымальніка ў суд. Ужо на другім дасудовым пасяджэнні заключылі міравое пагадненне, па якім былі задаволены ўсе патрабаванні спажыўца. У выніку чаравікі, якія каштавалі 130 тысяч, абышліся прадпрымальніку больш як у 500 тысяч рублёў. І то толькі таму, што пацярпелая адмовілася ад маральнай кампенсацыі, бо паездкі па судах, якія цягнуліся больш як 2 месяцы, ужо косткай сядзелі ў горле.

Парада ад Таццяны:

— Калі вы набываеце абутак, асабліва ў індывідуальных прадпрымальнікаў, абавязкова патрабуйце касавы чэк з рэквізітамі прадаўца. Я сама ледзь не трапіла ў гэту пастку. Дзякуй Богу, на выхадзе агледзелася, што замест чэка ў пачак з чаравікамі мне паклалі паперку з правіламі эксплуатацыі абутку. Самае дзіўнае, што прадавец яшчэ некалькі хвілін пераконваў мяне, што гэта і ёсць чэк. Цяпер разумею, што ўжо тады трэба было адмовіцца ад пакупкі. На ўласным прыкладзе пераканалася, што большасць з нас, спажыўцоў, не ведае сваіх правоў. У прыватнасці тое, што мы маем права вярнуць няякасны ношаны абутак на працягу двух гадоў. Адным словам, даражэнькія, няхай Закон аб абароне правоў спажыўцоў папоўніць стос вашых настольных кніг.

Каментарый начальніка юрыдычнага аддзела ГА «Спажывец» Аляксандра КАЖАМЯЧОНКА:

— Сітуацыя, у якую трапіла Таццяна, яшчэ раз нагадвае спажыўцам прапісную ісціну — давярай, але правярай. Жанчыну, якая дагэтуль была недастаткова юрыдычна падкаваная, увялі ў зман не адзін раз. Спачатку, калі сказалі, што яна не мае права патрабаваць вяртання грошай, заплачаных за няякасны тавар. **Насамрэч, наяўнасць любога, нават нязначнага недахопу, з'яўляецца падставай у тым ліку і для вяртання грошай.** Пасля схлусілі, сказаўшы, што правялі экспертызу. **Спажывец павінен ведаць, што ў адпаведнасці з патрабаваннямі заканадаўства заключэнне эксперта робіцца толькі пісьмова. Такога ж паняцця, як вусная экспертыза, наогул няма. Можа быць толькі вусная кансультацыя. Аб даце, месцы і часе экспертызы спажывец павінен быць праінфармаваны напярэдадні, і таксама ў пісьмовай форме.**

У большасці выпадкаў, адзначыў Аляксандр Кажамячонак, прадаўцы добрасумленна выконваюць свае абавязкі, своечасова задавальняюць правамерныя патрабаванні спажыўца. І зразумела, гэта ж таксама людзі, якія, выходзячы з-за прылаўка, таксама ідуць па пакупкі. Але, самі бачыце, бываюць выключэнні... Няхай гэтых выключэнняў будзе як мага менш. Прыемных вам пакупак і... чакаю новых гісторый.

Надзея ДРЫЛА.

І яшчэ некалькі момантаў спажыўцу для занатоўкі!

1. Калі ў абутку ўзнік дэфект, то неадкладна звярніцеся да прадаўца. Менавіта ён нясе адказнасць за недахопы, якія ўзніклі падчас гарантыйнага тэрміну.

2. Спажывец мае права заяўляць свае патрабаванні адносна абутку і пасля сканчэння гарантыйнага тэрміну на працягу двух гадоў. Калі экспертыза пакажа, што недахоп вытворчы і ўзнік да перадачы тавару спажыўцу, то правы заяўніка будуць адноўленыя. І ў гэтым выпадку ініцыятарам экспертызы таксама давядзецца выступаць прадаўцу.

3. Спажывец можа заявіць толькі адно патрабаванне з усіх пералічаных у артыкуле 20 Закона аб абароне правоў спажыўцоў. Не паўтарайце памылак заяўніцы, якая спачатку парамантавала абцас у майстэрні, а пасля пачала патрабаваць ад прадаўца адначасова і кампенсацыю выдаткаў, звязаных з ліквідацыяй недахопу, і вяртання грошай за ўсю пакупку. Гэта незаконна.

4. Адсутнасць чэка не з'яўляецца падставай для адмовы ў задавальненні патрабавання спажыўца. У гэтым выпадку доказам можа служыць пачак, ярлычкі, маркіроўка, налепкі, паказанні сведак.

5. Што датычыцца абутку належнай якасці, то яго можна вярнуць ці замяніць, калі ён не выкарыстоўваўся, на працягу 14 дзён.

ПА НЯСВІЖЫ МЕРКАВАЦЬ ПРА БЕЛАРУСЬ...

Наш рэпартаж з Нясвіжскага раёна

15 студзеня пройдуць урачыстасці ў слаўным беларускім горадзе Нясвіжы — горадзе, які набыў сваю добрую славу не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі, — тут будуць адзначаць 70-годдзе з дня ўтварэння Нясвіжскага раёна. Напярэдадні гэтай падзеі карэспандэнты «Звязды» пабывалі ў Нясвіжы, дзе сустрэліся з кіраўніцтвам раённага выканаўчага камітэта, а таксама прадстаўнікамі асобных працоўных калектываў. Агульнае ўражанне ад гэтых сустрэч — нясвіжцы вельмі любяць свой горад, сваю зямлю, шануюць сваю цікавую гістарычную спадчыну і робяць усё для таго, каб прымножыць славу і гонар свайго роднага краю яшчэ болей, каб ужо непасрэдна сваімі, уласнымі справамі адкрыць новую старонку ў гэтым агульным летапісе пра нясвіжскую зямлю.

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Старшыня Нясвіжскага райвыканкама Ігар МАКАР.

Аднак напачатку пра тое, што мы ўбачылі ў вячэрнім святочным калядна-навагоднім Нясвіжы, пра гэта нельга не сказаць тут хоць колькі слоў. А святочны Нясвіж проста не мог не прыцягнуць да сябе ўвагі, і найперш за ўсё вабіў ён да сябе разнастайнымі кампазіцыямі святочных упрыгажэнняў у дамах і на прыватных падворках яго жыхароў («У нас праводзіцца спецыяльны конкурс на такое вось навагоднее афармленне горада; адзначаюцца тыя, хто пашчыраваў лепш за ўсё», — расказалі потым тут). Але, безумоўна, прыгажэй за ўсё глядзелася цэнтральная плошча горада, або, як называюць яе тут, — Ратушная. Увогуле, яна зусім не падобная на галоўныя плошчы многіх іншых раённых цэнтраў, даволі часта сціснутыя ўвогуле малавыразнымі па сваім вонкавым абліччы (за рэдкім выключэннем) пабудовамі і з абавязковымі на іх аднатыпнымі фігурамі правадыра. Нясвіжскую Ратушную плошчу абрамляе своеасаблівы архітэктурны ансамбль, які складаецца з вежы гарадской ратушы з вялікім гадзіннікам на ёй, са строгага (насупраць) і велічнага будынка райвыканкама і ўжо больш сціплага будынка гарадской гасцініцы. Пры гэтым, як мы тое ўбачылі, плошча зяла электрычнасцю, дыхала свабодай і прасторай. А ў цэнтры ўсяго гэтага ансамбля пералівалася рознакаляровымі агнямі высокая навагодняя ёлка, вакол якой кружыў на каньках шумны карагод. «Гэтак жа прыгожа, як і ў сталіцы, а, можа, нават і лепей», — прыйшлі да агульнай высновы мы з фотакарэспандэнтам.

— Ну, гэты архітэктурны ансамбль нашай Ратушнай плошчы яшчэ далёка не закончаны, — удакладніў старшыня Нясвіжскага райвыканкама Ігар Макар. — Сёння, нягледзячы на тую ж вечную бягучую цякучку, мы працуем і над праграмай далейшага паэтапнага развіцця як раёна, так і горада, прычым што датычыцца непасрэдна горада, улічваем, што ён, па сутнасці, з'яўляецца турыстычным цэнтрам нашай краіны. Дык вось, згодна з гэтай праграмай, ужо распрацаваны праект рэканструкцыі нашай старой гасцініцы, якая і выходзіць сваім фасадам на плошчу. Рэканструюем, надбудуем мансарды, вось тады і атрымаем сапраўдны архітэктурны ансамбль плошчы, і сапраўды закончаны. І ён надасць зусім іншае аблічча цэнтру Нясвіжа. Словам, цэнтр павінен быць цэнтрам — прыгожым, прывабным. Як для жыхароў горада, так і для яго гасцей, а ў нас гасцей, розных замежных дэлегацый бывае вельмі шмат. Увогуле, нашы госці па Нясвіжы павінны меркаваць у цэлым пра Беларусь. Наша задача — зрабіць горад такім, каб уражанне ад яго наведвання, уражанне ад наведвання ў цэлым нашага нясвіжскага краю засталося найлепшым. Такая вось даволі амбіцыйная задача, такая мэта...

Аднак пра перспектывы развіцця раёна і горада Ігар Макар расказаў напрыканцы гутаркі, а напачатку яму было зададзена пытанне, вядома ж, наконт вынікаў толькі што прайшоўшага года. Рацей кажучы, з якім настроем сустракаюць у раёне яго юбілейную дату? Вось што адказаў на гэта пытанне старшыня Нясвіжскага райвыканкама:

— Наш раён адносіцца да раёнаў сельскагаспадарчай скіраванасці і, вядома, у першую чаргу трэба гаварыць пра вынікі яго сельскагаспадарчай дзейнасці. (Дзеля справядлівасці зазначым: Нясвіжчына няблага прадстаўлена і прамысловасцю, і ў першую чаргу такімі добра вядомымі прадпрыемствамі, як Гарадзейскі цукровы камбінат, завод медпрэпаратаў і іншымі). Дык вось, усе тыя паказчыкі, якія планаваліся, выкананыя. Адзінае, у сувязі з асабліва неспрыяльнымі для раёна леташнімі ўмовамі надвор'я (па нясвіжскай зямлі прайшлі два ўраганы, у нас цэлы месяц амаль няспынна лілі дажджы) недабралі збожжавых: планавалі сабраць па 68,5 цэнтнера з гектара — атрымалі па 53.

ДЛЯ ДАВЕДКІ. У найбольш ураджайным, рэкордным 2008 годзе ў раёне сабралі збожжавых па 68,4 цэнтнера з гектара, а, напрыклад, у такіх жа гаспадарках, як агракамбінат «Сноў», — па 93,7, СВК «Грыцкевічы» — па 89,8 цэнтнера.
У цэлым у раёне намалацілі больш за 155 тысяч тон збожжа.
І вернемся крыху ў не такое ўжо далёкае мінулае:
на пачатку 70-х гадоў мінулага стагоддзя ў раёне сабралі збожжавых у сярэднім па 22 цэнтнеры з гектара,
па 227 цэнтнераў цукровых буракоў (цукровыя буракі — таксама адна з асноўных культур у раёне) — у мінулым жа годзе цукровых буракоў сабралі па 598 цэнтнераў з гектара, прычым гэта ў сярэднім, а асобныя гаспадаркі мелі па 700 цэнтнераў і болей. Словам, цяперашнія і ранейшыя паказчыкі — проста непараўнальныя.

Як далей расказаў Ігар Мікалаевіч, асабліва важкіх поспехаў дабіліся сельскагаспадарчыя працаўнікі раёна ў жывёлагадоўлі. Летась яны ўпершыню надаілі ад кожнай каровы больш за 7 тысяч кілаграмаў малака, ці, дакладней, — па 7023. Агульны вал малака перавысіў 100 тысяч тон. Гэта — лепшы вынік у краіне. Дарэчы, і малочны статак у раёне немалы. У цэлым шчыльнасць буйной рагатай жывёлы на 100 га сельскагаспадарчых угоддзяў складае амаль 95 галоў (плюс да гэтага 135 свіней), прычым у раёне ставіцца задача выйсці на наступную шчыльнасць буйной рагатай жывёлы: мець на 100 га не менш за 100 галоў. І выкананне гэтай задачы няўхільна набліжаецца. Атрымліваюць у гаспадарках раёна не толькі выдатнае малако (прычым гэта малако — вышэйшай якасці, малако, якое ў пераважнай колькасці накіроўваецца на дзіцячае харчаванне), але і добрае мяса.

Жывёлагадоўля і атрыманне жывёлагадоўчай прадукцыі сталі ў раёне асноўным кірункам сельскагаспадарчай вытворчасці. Як падкрэсліваў ужо першы наменік старшыні райвыканкама, начальнік упраўлення сельскай гаспадаркі Анатоль Коршун, менавіта на жывёлагадоўлю «працуе» каля 86 працэнтаў усёй зямлі раёна. Гэты кірунак намечана пераважна развіваць і надалей. Добрым сведчаннем гэтага з'яўляецца ўзяты ў раёне курс на ўзвядзенне сучасных, з самай перадавой тэхналогіяй утрымання жывёлы, фермаў. Восенню давялося пабываць на адной з такіх фермаў, якую толькі што ўвялі ў строй дзейных, у СВК «Грыцкевічы». Гэта, можна так сказаць, сапраўдны палац для жывёлы з дэталёва распрацаванымі ўмовамі для яе паўнейшага камфорту. І нават з музыкай Моцарта падчас яе даення. Зразумела, што той жа дасягнуты ў раёне рубеж у 7000 кілаграмаў малака ад каровы за год з'яўляецца для працаўнікоў гэтай фермы ў «Грыцкевічах», па сутнасці, стартавым. Сучасная МТФ з'явілася і ў гаспадарцы «1 Мая», якую, дарэчы, раней немалы час узначальваў цяперашні старшыня райвыканкама. У раёне вядзецца (а таксама плануецца) будаўніцтва яшчэ некалькіх такіх жа сучасных малочнатаварных фермаў. Прычым варта зазначыць: у раёне, як падкрэслівалі тут, і са старых жывёлагадоўчых памяшканняў не пустуе ніводнае.

ДЛЯ ДАВЕДКІ. І яшчэ раз звернемся да леташніх рэкордных надояў нясвіжскіх жывёлаводаў, якія перасягнулі рубеж у 7 тысяч кілаграмаў малака. І таксама параўнаем: некалі, напрыканцы 50-х гадоў мінулага стагоддзя, на Нясвіжчыне ўшаноўвалі адну з даярак, якая надаіла за год ад кожнай з замацаваных за ёй кароў больш за 2 тысячы кілаграмаў малака.
І ўжо такі факт: цяпер на адной з сучасных фермаў агракамбіната «Сноў» надойваюць за год па 10,6 тысячы кілаграмаў.
Як жа далёка рушылі працаўнікі сельскагаспадарчай Нясвіжчыны ў сваім бясконцым руху наперад.

Прычым сельскія працаўнікі раёна рушылі не толькі ў вытворчасці. Гэтак жа істотна змяніліся іх дабрабыт, уласная абуладкаванасць. Трэба паглядзець, якія аграгарадкі створаны на Нясвіжчыне, якія індывідуальныя дамы-катэджы ўзведзены ў вёсках Грыцкевічы, Аношкі, Салтанаўшчына і шмат якіх іншых, прычым з усімі гарадскімі бытавымі выгодамі — газам, гарачай вадой з-пад крана і г.д. Штогод кожная гаспадарка раёна ўзводзіць па 5 і болей такіх дамоў-катэджаў...

У цэлым і будаўнічая сфера раёна, як таксама падкрэсліваў кіраўнік райвыканкама, развіваецца не менш дынамічна; у раёне мэтанакіравана працуюць над выкананнем спецыяльных праграм «Сацыяльнае жыллё» і «Старое жыллё». Прычым, як асабліва падкрэсліваў кіраўнік райвыканкама, калі ў наступным годзе захаваюцца такія ж тэмпы будаўніцтва жылля, у горадзе практычна будзе ліквідавана чарга на яго.

— Добра папрацавалі нашы будаўнікі на рэканструкцыі і рэстаўрацыі Палацава-паркавага ансамбля князёў Радзівілаў, на рамонце і будаўніцтве бальніцы, амбулаторый, школ і дзіцячых садкоў, на ўзвядзенні спартыўных аб'ектаў, — падкрэсліваў Ігар Макар. — Асабліва хачу адзначыць такія аб'екты сацыяльнай сферы, якія былі здадзены або пачалі дзейнічаць у мінулым годзе — гэта гарадскі фізкультурна-аздараўленчы цэнтр «Замкавы», ліцэй для асабліва адораных дзяцей, дзе яны будуць вучыцца па паглыбленай праграме, будынак новай раённай бібліятэкі, сэрвісны цэнтр Белтэлекама.

— Ігар Мікалаевіч, Нясвіж часам называюць, і пра гэта ўжо крыху ўзгадвалася, свайго роду турыстычным цэнтрам Беларусі. Што вы збіраецеся прапанаваць турыстам, гасцям горада і раёна ў якасці адпаведных аб'ектаў для турызму і адпачынку, акрамя, вядома, і без таго знакамітага ансамбля князёў Радзівілаў?

— А мы ўжо прапаноўваем. Так, у мінулым годзе ўзведзены база аграэкатурызму «Завітая» ў вёсцы з гэткай жа назвай, турыстычна-гасцінічны комплекс «Бярозавы гай», яшчэ адна база аграэкатурызму «Пляшэвічы» ў вёсцы Пляшэвічы, іншыя зоны адпачынку. Нагадаю таксама, што ўжо даволі хутка, у 2011 годзе павінен расчыніць свае дзверы цалкам адноўлены Палацава-паркавы ансамбль князёў Радзівілаў. Тут закончаны ўсе вонкавыя работы, пададзена цяпло ва ўнутраныя памяшканні, робіцца іх апрацоўка.

Увогуле, развіццём нашай фізкультурна-аздараўленчай і спартыўнай базы (толькі адзін пералік нашых адпаведных найсучаснейшых аб'ектаў заняў бы шмат месца), а апошнім часам — і турыстычнай, прычым як у горадзе, так і ў раёне, нясвіжцы могуць ганарыцца не меней, чым сваімі вытворчымі дасягненнямі. Словам, хто ўмее добра працаваць, той павінен і добра адпачываць...

* * *

НЕАБХОДНАЕ АДСТУПЛЕННЕ,

якое датычыцца тых жа вытворчых дасягненняў нясвіжцаў, і ў першую чаргу ў галіне сельскай гаспадаркі. Мяркуюць, вельмі выдатная тут зямля, усё на ёй добра расце, што толькі ні кінь у яе, што ні пасей. І сапраўды, на сваю зямлю нясвіжцы не скардзяцца, ці, дакладней, не прывыклі скардзіцца. Затое яны падкрэсліваюць: а паглядзіце, якое насенне «кідаем» мы ў гэту зямлю — пераважна элітнае; а паглядзіце, якая тэхніка працуе на нашых палях — самая сучасная, самая прадукцыйная: камбінаваныя пасяўныя агрэгаты, «лексіёны», «ньюхоланды», «джон-дзіры», камбайны «Кляйнэ» (пры гэтым і сваёй, айчыннай, тэхнікі нясвіжцы не цураюцца, калі яна паказвае менавіта высокую прадукцыйнасць); а палічыце, колькі запрашаем мы на нашы палі і фермы навукоўцаў... А яшчэ пры ўсім гэтым на Нясвіжчыне абавязкова падкрэсляць: у нас не проста зямля асаблівая — людзі ў нас асаблівыя, асаблівы «інтэлект гэтых людзей, які стваральі дзесяцігоддзямі, асаблівая гаспадарлівасць іх»...

Не варта з усім гэтым спрачацца, бо ўсё тут менавіта так і ёсць. Нам хіба застаецца пацвердзіць усе гэтыя словы наступным характэрным прыкладам: на нясвіжскіх палях вы не знойдзеце ніводнага пустога кавалачка зямлі, нават самага маленькага, нават «сотачкі». Нават на закінутых сялянскіх сядзібах, калі яны раптам засталіся без гаспадароў. Тут, напрыклад, летам можна ўбачыць такую цікавую карціну: вясковыя хаты сярод кукурузы. Гэта значыць, што гаспадарка спецыяльна зайшла з той жа кукурузай на кожны з такіх закінутых зямельных клінкоў, хоць гэта і вельмі нязручна рабіць з цяперашняй магутнай тэхнікай. Зайшла на гэтыя клінкі, каб зямля не пуставала... Прыгадваецца, з якой скрухай расказваў кіраўнік адной з нясвіжскіх гаспадарак пра тое, што ён убачыў у адным з іншых раёнаў іншай вобласці. А ўбачыў ён там каля фермы зарослую пустазеллем зямлю. «Ну як жа можна так? Гэта ж наша зямля, наша карміліца; як можна так з ёю абыходзіцца»... Напэўна, гэтыя яго перажыванні найлепшым чынам сведчаць пра характар нясвіжскіх людзей, характар нясвіжскіх працаўнікоў, і пра той жа іх інтэлект.

* * *

І на заканчэнне ўсяго, што было сказана вышэй, наступная даведка, якую далі ва ўпраўленні сельскай гаспадаркі Нясвіжскага райвыканкама. **Па сваёй плошчы зямля Нясвіжчыны займае ў Мінскай вобласці толькі 3,7 працэнта.** Але пры гэтым па асобных асноўных відах прадукцыі доля нясвіжскіх сельскіх працаўнікоў складае: **па малацэ — каля 7 працэнтаў, па вале збожжавых — каля 7,5, а па цукровых бураках — каля 20 працэнтаў;** у асобныя гады **на мясакамбінаты краіны з вобласці паступае кожная дзясятая тона менавіта нясвіжскага мяса**... Па аб'ёмах валавой сельскагаспадарчай прадукцыі **Нясвіжскі раён яшчэ каля двух з паловай гадоў таму пераўзышоў найбольш паказальны 1990 год**.

— Ігар Мікалаевіч, пытанне, хутчэй, рытарычнае, але нельга не задаць яго: цяжка «хадзіць» у лідарах?

— Неймаверна цяжка. Любы збой у нашай рабоце быў бы надзвычайным здарэннем не толькі для нашага раёна. Нам пры гэтым ніяк нельга апускацца ніжэй той планкі, якую мы ўзялі. Мы пры ўсім гэтым яшчэ так шмат хочам зрабіць — як у той жа сельскай гаспадарцы, так і ў далейшым развіцці горада. Трэба пабудаваць сучасны раддом, узвесці іншыя аб'екты, трэба яшчэ лепей добраўпарадкаваць горад, яго вуліцы. Ён павінен стаць узорна-паказальным — такая стаіць перад намі мэта, і мы яе даб'ёмся. І няхай іншыя, гледзячы на ўсё гэта, падцягваюцца да нас. Ад гэтага ўсе мы толькі выйграем.

— І яшчэ такое пытанне, і, напэўна, таксама, хутчэй, рытарычнае: якія будуць вашы галоўныя словы на тых жа ўрачыстасцях?

— Ну вядома ж, гэта ў першую чаргу будуць словы ўдзячнасці ўсім працаўнікам раёна за іх выдатную працу. Дарэчы, на гэтыя ўрачыстасці мы запрасілі прадстаўнікоў з нашых гарадоў-пабрацімаў у іншых краінах (а такіх гарадоў у нас 16), былых кіраўнікоў раёна, а таксама добра вядомых у краіне людзей — выхадцаў з Нясвіжскага раёна — напрыклад, алімпійскага чэмпіёна Рамуальда Кліма. Ну а хто не патрапіць да нас цяпер, могуць прыехаць пазней. Запрашаем на нашы турыстычныя аб'екты, запрашаем на сёлетні, таксама юбілейны, міжнародны фестываль камернай музыкі «Музы Нясвіжа» (ён пройдзе ў нас у 15-ы раз). Калі вы ні разу не былі на гэтым фестывалі, можна лічыць, вы шмат страцілі. Яшчэ раз падкрэслю: у нас шмат цікавага, у нас ёсць шмат чаго паглядзець.

Іван БАРАНОЎСКІ.

НА ЗАКЛЮЧЭННЕ

Некалі нясвіжцы, калі пачыналі ўздымаць сваю сельскагаспадарчую вытворчасць да цяперашніх вышыняў, нямала ездзілі ў еўрапейскія краіны — па элітнае насенне, па тэхніку, а большай часткай — каб павучыцца, набрацца адпаведнага вопыту. Цяпер, як падкрэслівае першы наменік Нясвіжскага райвыканкама Анатоль Коршун, нясвіжцам, нашым іншым сельгаспадарнікам не трэба ездзіць па «еўропах» — нясвіжцы запрашаюць да сябе. Ім цяпер ёсць што паказаць і ёсць чаму павучыць.

Да канца 2010 года чарга на ўсталяванне тэлефона будзе ліквідаваная

НАПРЫКАНЦЫ 2009 года колькасць стацыянарных тэлефонных апаратаў, што дзейнічаюць у сетках РУП «Белтэлекам», наблізілася да 4 мільёнаў, такім чынам на кожныя 100 жыхароў нашай краіны прыпадае ўжо 41 стацыянарны тэлефонны апарат. Прырост асноўных тэлефонных нумароў склаў за год 220 тысяч: 120 тысяч абанентаў былі падключаны на гарадскіх тэлефонных сетках і 100 тысяч — на сельскіх, з іх 70 тысяч — па тэхналогіі WLL.

— Наша задача — забяспечыць даступнай сувяззю жыхароў абсалютна ўсіх рэгіёнаў нашай краіны, — паведаміў на сустрэчы з **журналістамі генеральны дырэктар РУП «Белтэлекам» Канстанцін ЦІКАР**, — таму мы будзем і далей тэлефанізаваць тыя населеныя пункты, куды па розных аб'ектыўных прычынах тэлефонная сувязь яшчэ не дайшла. Такіх месцаў засталося ўжо няшмат, а беларусаў, якія стаялі б у чарзе на ўсталяванне тэлефона пяць гадоў і болей, у нас ужо не засталося. У шмат якіх рэгіёнах людзі чакаюць усталявання тэлефона не больш як 2 гады. А ў 2010 годзе мы спадзяёмся цалкам ліквідаваць такую чаргу. Задача максімум для нас — ліквідаваць усе «белыя плямы» на тэлекамунікацыйнай карце Беларусі. Да таго ж, не варта забываць, што дзякуючы звычайнай тэлефоннай сувязі нашым абанентам становяцца даступныя і інтэрнэт, і інтэрактыўнае тэлебачанне.

Канстанцін ЦІКАР: «Задача максімум для нас — ліквідаваць усе «белыя» плямы на тэлекамунікацыйнай карце Беларусі»

За 11 месяцаў 2009 года спецыялістамі «Белтэлекама» было пракладзена больш як 1,8 тысячы кіламетраў валаконна-аптычных ліній сувязі, у тым ліку больш як 900 кіламетраў — да аграгарадкоў і больш як 600 кіламетраў ліній сельскай сувязі. Што датычыцца шырокапаласнога доступу ў інтэрнэт, то на снежань абаненцкая база byfly перавысіла ўжо 400 тысяч карыстальнікаў. Знешні інтэрнэт-шлюз быў пашыраны за год з 5,2 Гбіт/с да 22 Гбіт/с: «ільвіную» долю займае расійскі напрамак — 20 Гбіт/с , а заходні напрамак — толькі 2 Гбіт/с.

— Зніжэнне тарыфаў на інтэрнэт стала не проста традыцыяй, а правілам, якое робіць інтэрнэт даступным для ўсіх, — падкрэсліў Канстанцін Цікар. — У 2009 годзе мы некалькі разоў зніжалі кошт інтэрнэт-паслуг як для аператараў сувязі, так і для сваіх абанентаў. Сёння наш брэнд byfly займае самыя трывалыя пазіцыі на гэтым рынку, і мы не збіраемся адмаўляцца ад стратэгіі хуткай «інтэрнэтызацыі» і ў новым годзе. Згодна з нашымі папярэднімі планамі, на канец 2010 года колькасць абанентаў byfly павінна павялічыцца да 1 мільёна. А што датычыцца далейшага пашырэння інтэрнэт-шлюза, то ў нас ёсць магчымасць хоць сёння павялічыць яго да 400 Гбіт/с, але гэта будзе неэфектыўным укладаннем інвестыцый. Пашырэнне шлюзу заўсёды прывязваецца да патрэбы, і калі загрузка шлюза дасягае 70 працэнтаў, мы робім чарговае яго пашырэнне.

У верасні мінулага года ў Беларусі з'явіўся новы і пакуль што адзіны беларускамоўны IT-брэнд: пад гандлёвай маркай ZALA «Белтэлекам» пачаў прасоўваць на рынак інтэрактыўнае тэлебачанне. На сёння абаненцкая база ZALA перавысіла ўжо больш як 60 тысяч карыстальнікаў. Цікава, што больш як 80 працэнтаў гледачоў інтэрактыўнага тэлебачання пражываюць у сельскай мясцовасці — там, дзе няма ні кабельнага, ні спадарожнікавага тэлебачання, але ёсць стацыянарная тэлефонная сувязь (хоць можна быць адначасова абанентам і кабельнага, і інтэрактыўнага тэлебачання).

— Зразумела, што ў сталіцы ці абласных цэнтрах, жыхары якіх элементарна разбэшчаныя шматлікімі прапановамі ад кабельных аператараў, інтэрактыўнаму тэлебачанню цяжка знайсці сваю нішу, а за межамі гарадоў попыт на яго нават перавышае пакуль нашы тэхнічныя магчымасці, — прызнаўся генеральны дырэктар «Белтэлекама».

Галоўная адметнасць інтэрактыўнага тэлебачання — гэта магчымасць кожнаму з гледачоў кіраваць тэлеэфірам і ладзіць яго пад сябе. ZALA дазваляе абанентам выбіраць пакеты тэлеканалаў, складаць свой расклад тэлепередач, устанаўліваць бацькоўскі пароль на доступ да асобных перадач і тэлеканалаў, запісваць будучыя тэлепередачы, а затым праглядаць іх у любы зручны момант. Акрамя прагляду тэлепередач, так бы мовіць, у «жывым» эфіры, абанентам даступная дадатковыя сэрвісы адкладзенага прагляду: пастаноўка тэлепередачы на паўзу з магчымасцю аднаўлення прагляду, а таксама прагляд тэлепередач, якія трансляваліся ў эфіры на працягу апошніх 48 гадзін. Сёння абанентам ZALA даступныя больш як 40 тэлеканалаў з інтэрактыўнымі функцыямі, 2 асноўныя пакеты, 3 тэматычныя пакеты, у тым ліку пакет для юрыдычных асобаў, а таксама паслуга «Віртуальная кіназала» і ўласны інфаканал «Белтэлекама». Канстанцін Цікар паведаміў, што ў найбліжэйшы час у абанентаў ZALA з'явіцца магчымасць убачыць малавядомыя работы беларускіх кінематаграфістаў і драматургаў, у прыватнасці, цікавыя дыпломныя работы выпускнікоў творчых ВНУ. «Белтэлекам» заключыў дагаворы з Акадэміяй мастацтваў, Нацыянальным драматычным тэатрам імя Горкага і кінастудыяй «Беларусьфільм». Напаўненне паслугі «відэа па запыце» плануецца істотна пашырыць. У планах на гэты год — таксама пашырэнне музычнага і фільмавага рэпертуару інтэрактыўнага тэлебачання.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ФАКТ

БЫВАЙ, ЗОЛАТА

Супрацоўнікі аддзела па барацьбе з карупцыяй і эканамічнай злачыннасцю зрабілі кантрольны закуп залатых вырабаў у жыхаркі Баранавічаў. За залатыя завушніцы яны заплацілі і зрабілі вобыск у доме спекулянткі.

Там міліцыянеры знайшлі 31 ювелірны выраб — золата пацягнула на 15 млн рублёў.

У вырабаў не было пробнага кляйма.

СЦЯЖЫНКІ ПРЫВЯЛІ

Зімой гарэлку на прыродзе гоняць рэдка, але нехта з в. Дзівін (Кобрынскі раён), нягледзячы на мароз, наладзіў у лесе міні-завод і пачаў вырабляць самагон.

Нарад міліцыі пайшоў пратаптанымі ў снезе сцежкамі і выйшаў на той заводзік. Гарэлка і 600 літраў брагі, як і абсталяванне, былі знішчаны. Гаспадара шукаюць.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Погляд

Хлеб надзённы ўчора, сёння і...

УЗРОВЕНЬ жыцця насельніцтва краіны вызначаецца колькасцю збожжа ў засеках. І калі ў гаспадара хлеба было ўдосталь, то ён лічыўся заможным. Так было заўсёды.

Але за ўсю гісторыю чалавецтва народныя масы не мелі хлеба ў дастатку. І толькі ў XX стагоддзі, калі адбыўся навукова-тэхнічны пад'ём, праблема хлеба была знятая з парадку дня ў краінах Еўропы і Паўночнай Амерыкі.

У Беларусі цану хлебу ведалі спрадвеку.

— Калі сям'я садзілася за стол абедаць, — любіў прыказваць Барыс Асаўцоў, былы старшыня Ганцавіцкага райсавета, — то дзед сачыў, каб мы, дзеці, тры разы зачэрпалі лыжкай поліўкі і адзін раз адкусілі хлеба. А калі нехта парушаў гэтае правіла, то атрымліваў лыжкай па лбе.

Жыццёвы эпізод даволі банальны, і мне не даводзілася такое бачыць, хоць у дзяцінстве назіраў, як дарослыя беражліва ставіліся да хлеба. А раскідвацца ім пачалі пазней, у часы Хрушчова. На цаліне збіралі небывалы ўраджай, і тады ў сталоўках хлеб зрабілі бясплатным, а ў краме бохан хлеба каштаваў 14—18 капеек. Вясковы народ купляў хлеб мяхамі і карміў свіней, бо мукі, як і камбікармоў, у тыя часы асабліва і не было.

Так доўга працягвацца не магло, бо ў танным хлебе было больш палітыкі, чым эканомікі. Неўзабаве белы хлеб знік з прылаўкаў, а затым пшаніцу пачалі закупляць у ЗША, Канадзе, Аўстраліі...

Хлеб, як і ўсялякая прадукцыя, павінен мець рэальную цану, а інакш ім можна карміць жывёлу ці кідацца, як у школьнай сталоўцы некалі.

Для чалавека ў нейкай экстрэмальнай сітуацыі акраец хлеба можа пераважыць усё золата свету. Калі штогод у час жніва нам на самым высокім узроўні нагадваюць, што сабраныя мільёны тон збожжа з'яўляюцца гарантыяй нашай эканамічнай бяспекі, то гэта сапраўды так. Забяспечваць сябе хлебам — гэта найважнейшая задача для кожнай краіны.

На збожжы завязаны ўвесь аграпрамысловы комплекс Беларусі. Сельгаскаператывы, камбінаты хлебапрадуктаў, хлебазаводы, птушкафабрыкі, жывёлагадоўчыя комплексы знаходзяцца сёння ў адной звязцы. Але сувязным звяном у гэтай сістэме з'яўляюцца камбінаты хлебапрадуктаў.

Збожжа з палёў паступае сюды, тут яно перапрацоўваецца, галоўным чынам, на муку ці камбікорм і прадаецца спажыўцам.

Ад сабранага ўраджаю да хлеба на прылаўках даволі доўгі ланцужок, і кожнае звяно ў ім сканцэнтроўвае ўвагу на цане — усе хочуць купіць сыравіну па нізкім кошце, а сваю прадукцыю прадаць па больш высокім. Ад рэнтабельнасці залежыць дабрабыт кожнага прадпрыемства. Прапісная ісціна.

Сёння беларускі аграпрамысловы

Закон Рэспублікі Беларусь

АБ СТАТУСЕ ВАЕННАСЛУЖАЧЫХ

Прыняты Палатай прадстаўнікоў
Ухвалены Саветам Рэспублікі

11 снежня 2009 года
17 снежня 2009 года

(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 13 студзеня.)

Артыкул 9. Свабода веравызнання

Ваеннаслужачыя маюць права прызнаваць любую рэлігію або не прызнаваць ніякай.

Ваеннаслужачыя не маюць права адмаўляцца ад выканання абавязкаў ваеннай службы па матывах стаўлення да рэлігіі або выкарыстоўваць свае службовыя паўнамоцтвы для яе прапаганды.

Выкананне рэлігійных абрадаў можа ажыццяўляцца ваеннаслужачымі ў вольны ад выканання абавязкаў ваеннай службы час.

Дзяржава не нясе абавязкаў па задавальненні патрэбаў ваеннаслужачых, якія вынікаюць з іх рэлігійных перакананняў.

Рэлігійная сімволіка, літаратура і прадметы культу выкарыстоўваюцца ваеннаслужачымі самастойна і ў асабістых мэтах.

Стварэнне рэлігійных арганізацый у вайсковых часцях не дапускаецца. Рэлігійныя абрады на тэрыторыі вайсковай часці могуць праводзіцца, як правіла, па просьбе ваеннаслужачых за кошт іх уласных сродкаў з дазволу камандзіра (начальніка) вайсковай часці.

Рэлігійная дзейнасць замежных свяшчэннаслужыцеляў (асобаў, якія маюць духоўны сан), а таксама дзейнасць рэлігійных арганізацый, не зарэгістраваных у вызначаным парадку, у вайсковых часцях не дапускаюцца.

Артыкул 10. Права на працу

Права на працу рэалізоўваецца ваеннаслужачымі шляхам праходжання імі ваеннай службы па кантракце ў парадку, вызначаным заканадаўствам.

Час знаходжання грамадзян на ваеннай службе залічваецца ў стаж працы, стаж працы па спецыяльнасці (у галіне) і стаж дзяржаўнай службы на ўмовах і ў парадку, вызначаных заканадаўствам.

У выпадках, устаноўленых Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, працягласць ваеннай службы вызначаецца ў ільготным вылічэнні.

Прыцягненне ваеннаслужачых у перыяд праходжання ваеннай службы да работ або выканання іншых абавязкаў, не абумоўленых ваеннай службай, дапускаецца ў выпадках, установленых заканадаўчымі актамі.

Ваеннаслужачыя, якія праходзяць ваенную службу па кантракце, маюць права на:

прызначэнне на вышэйшыя пасады ў адпаведнасці з атрыманай кваліфікацыяй, дасягнутымі ў службовай дзейнасці вынікамі і ў выпадках, устаноўленых заканадаўчымі актамі, на конкурснай аснове;

своечасовае прысваенне чарговых воінскіх званняў, за выключэннем выпадкаў, устаноўленых заканадаўчымі актамі;

павышэнне кваліфікацыі з улікам інтарэсаў ваеннай службы і іх уласнага выбару;

перавод для далейшага праходжання ваеннай службы з аднаго вайсковага фарміравання ў іншае з захаваннем за імі воінскіх званняў і выслугі гадоў;

перавод для праходжання службы ў ваенізаваных арганізацыі з прысваенне ім спецыяльных званняў, якія адпавядаюць іх воінскім званням, і захоўваннем выслугі гадоў.

Ваеннаслужачым забараняецца займацца іншай аплатнай працай (дзейнасцю), акрамя выкладчыцкай, навуковай, культурнай, творчай дзейнасці, медыцынскай практыкі, якія ажыццяўляюцца па ўзгадненні з камандзірам (начальнікам) вайсковай часці, у якой ваеннаслужачы праходзіць ваенную службу, а ў дачыненні да камандзіра (начальніка) вайсковай часці — па ўзгадненні з яго непасрэдным камандзірам (начальнікам).

Артыкул 11. Грашовае забеспячэнне

Ваеннаслужачыя ў залежнасці ад пасады, якую яны займаюць, воінскага звання, кваліфікацыі, працягласці і ўмоў ваеннай службы, якасці і вынікаў службовай дзейнасці з улікам асаблівасцяў ваеннай службы забяспечваюцца грашовым забеспячэннем за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту.

Грашовае забеспячэнне ваеннаслужачых складаецца з асноўных і дадатковых відаў. Асноўныя віды грашовага забеспячэння ўключаюць у сябе службовы аклад у адпаведнасці з займаемай пасадай і аклад па воінскім званні ў адпаведнасці з прысвоеным воінскім званнем, якія складаюць аклад грашовага забеспячэння ваеннаслужачых. Дадатковыя віды грашовага забеспячэння складаюцца са штомесячных і аднаразовых (разавых) выплат.

Памеры службовых акладаў, акладаў па воінскіх званнях і дадатковых відах грашовага забеспячэння ваеннаслужачых устанаўліваюцца заканадаўствам.

Парадак забеспячэння ваеннаслужачых грашовым забеспячэннем устанаўліваецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь або па яго даручэнні Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь, дзяржаўнымі органамі, у якіх прадугледжана ваенная служба.

Ваеннаслужачым за перыяды часовай непрацаздольнасці, знаходжання на лячэнні, у водпусках, службовых камандзіроўках захоўваецца выплата асноўных і дадатковых відаў грашовага забеспячэння. Кампенсацыя ваеннаслужачым камандзіровачных расходаў ажыццяўляецца ў памерах і парадку, вызначаных заканадаўствам.

Парадак забеспячэння грашовым забеспячэннем і іншымі выплатамі ваеннаслужачых, якія праходзяць ваенную службу ў дзяржаўных органах, у якіх прадугледжана ваенная служба, непасрэдна падпарадкаваных Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, устанаўліваецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь або па яго даручэнні адпаведнымі дзяржаўнымі органамі.

Артыкул 12. Харчовае і рэчавае забеспячэнне

Харчовае забеспячэнне ваеннаслужачых ажыццяўляецца па нормах, устаноўленых Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь або па яго даручэнні дзяржаўнымі оганамі, у якіх прадугледжана ваенная служба, у форме:

выдзялення харчавання;

выдачы харчовага пайка;

выплаты грашовай кампенсацыі ўзамен харчовага пайка (харчавання);

выплаты харчова-дарожных грашовых сродкаў.

Парадак харчовага забеспячэння ваеннаслужачых устанаўліваецца дзяржаўным органам, у якім прадугледжана ваенная служба.

Рэчавае забеспячэнне ваеннаслужачых ажыццяўляецца ў залежнасці ад умоў праходжання ваеннай службы па нормах, устаноўленых Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь або па яго даручэнні дзяржаўнымі органамі, у якіх прадугледжана ваенная служба.

Ваеннаслужачыя, якія праходзяць ваенную службу па кантракце, замест належных па нормах забеспячэння прадметаў рэчавай маёмасці маюць права на атрыманне грашовай кампенсацыі ў памеры іх кошту.

Парадак забеспячэння ваеннаслужачых прадметамі рэчавай маёмасці і выплаты ўзамен іх грашовай кампенсацыі ўстанаўліваецца дзяржаўным органам, у якім прадугледжана ваенная служба.

Парадак і нормы харчовага і рэчавага забеспячэння ваеннаслужачых, якія праходзяць ваенную службу ў дзяржаўных органах, у якіх прадугледжана ваенная служба, непасрэдна падпарадкаваных Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, устанаўліваюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь або па яго даручэнні адпаведнымі дзяржаўнымі органамі.

Артыкул 13. Службовы час і права на адпачынак

Працягласць і размеркаванне службовага часу для ваеннаслужачых вызначаюцца распарадкам дня вайсковай часці і рэгламентам службовага часу, якія вызначаюцца камандзірам (начальнікам) вайсковай часці ў адпаведнасці з патрабаваннямі статутаў Узброеных Сілаў. Пры гэтым агульная працягласць штотыднёвага службовага часу для ваеннаслужачых, якія праходзяць ваенную службу па кантракце і ваенную службу афіцэраў па прызыве, не павінна перавышаць 40 гадзін. Прыцягненне ваеннаслужачых (за выключэннем ваеннаслужачых, якія праходзяць тэрміновую ваенную службу, рэзервістаў пры знаходжанні на занятках або вучэбных зборах і ваеннаабавязаных пры знаходжанні на ваенных або спецыяльных зборах) да выканання абавязкаў ваеннай службы звыш устаноўленай працягласці штотыднёвага службовага часу кампенсуецца адпачынкам адпаведнай працягласці ў іншыя дні тыдня.

Вучэнні, баявая стральба і іншыя мерапрыемствы, пералік якіх вызначаецца кіраўніком дзяржаўнага органа, у якім прадугледжана ваенная служба, праводзяцца ў любыя дні тыдня без абмежавання агульнай працягласці штотыднёвага службовага часу.

Для ваеннаслужачых, якія праходзяць тэрміновую ваенную службу, рэзервістаў пры знаходжанні на занятках або вучэбных зборах, ваеннаабавязаных пры знаходжанні на ваенных або спецыяльных зборах, слухачоў і курсантаў ваенных навучальных устаноў і іншых устаноў адукацыі ўстанаўліваецца шасцідзённы службовы тыдзень з адным выхадным днём.

Для ваеннаслужачых, якія праходзяць ваенную службу па кантракце і ваенную службу афіцэраў па прызыве, устанаўліваецца пяцідзённы службовы тыдзень з двума выхаднымі днямі.

Ваеннаслужачым (за выключэннем ваеннаслужачых, якія праходзяць тэрміновую ваенную службу), рэзервістам пры знаходжанні на занятках або вучэбных зборах віды водпускаў, іх працягласць і парадак дазволу ўстанаўліваюцца заканадаўчымі актамі.

Ваеннаслужачым, якія праходзяць тэрміновую ваенную службу, за ўвесь перыяд ваеннай службы дазваляецца водпуск:

якія праходзяць тэрміновую ваенную службу 18 месяцаў: салдатам і матросам — 10 сутак, сяржантам і старшынам — 15 сутак;

якія праходзяць тэрміновую ваенную службу 12 месяцаў: салдатам і матросам — 5 сутак, сяржантам і старшынам — 10 сутак.

Ваеннаслужачым, якія праходзяць тэрміновую ваенную службу і не выкарысталі водпуск за ўвесь перыяд ваеннай службы, пры паступленні на ваенную службу па кантракце дазваляецца водпуск працягласцю, устаноўленай часткай шостай гэтага артыкула.

Працягласць водпуску за ўвесь перыяд ваеннай службы ваеннаслужачым, якія праходзяць тэрміновую ваенную службу, можа быць павялічаная (у выглядзе заахвочвання) на тэрмін да 10 сутак у парадку, вызначаным Дысцыплінарным статутам Узброеных Сілаў Рэспублікі Беларусь, які зацвярджаецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь (далей — Дысцыплінарны статут Узброеных Сілаў).

За ўчыненне дысцыплінарных правіннасцяў на ваеннаслужачых, якія праходзяць тэрміновую ваенную службу, у парадку, вызначаным Дысцыплінарным статутам Узброеных Сілаў, можа быць накладзена дысцыплінарнае спагнанне ў выглядзе змяншэння працягласці водпуску за ўвесь перыяд тэрміновай ваеннай службы на тэрмін:

якія праходзяць тэрміновую ваенную службу 18 месяцаў: салдатам і матросам — да 5 сутак, сяржантам і старшынам — да 8 сутак;

якія праходзяць тэрміновую ваенную службу 12 месяцаў: салдатам і матросам — да 2 сутак, сяржантам і старшынам — да 5 сутак.

Ваеннаслужачым, якія праходзяць тэрміновую ваенную службу 6 месяцаў, водпуск не дазваляецца.

Ваеннаслужачым, якія праходзяць тэрміновую ваенную службу, даецца водпуск па хваробе і па ўважлівых прычынах асабістага і сямейнага характару.

Водпуск па хваробе даецца на падставе заключэння ваенна-ўрачэбнай камісіі ваеннаслужачым, якія праходзяць тэрміновую ваенную службу, якія пасля заканчэння стацыянарнага лячэння і правядзення рэабілітацыі яшчэ не могуць па стане здароўя выконваць абавязкі ваеннай службы. Парадак дазволу водпуску па хваробе і яго працягласць устанаўліваюцца заканадаўствам.

Водпуск па ўважлівых прычынах асабістага і сямейнага характару да 10 сутак даецца ваеннаслужачаму, які праходзіць тэрміновую ваенную службу, у выпадку:

уступлення ў шлюб;

цяжкай хваробы або смерці (гібелі) яго бацькі, маці, жонкі, дзяцей, уключаючы ўсыноўленых (удачароных), родных братоў і сясцёр, дзеда, бабкі;

пажару або іншага стыхійнага бедства, якое напаткала гэтага ваеннаслужачага або асобаў, названых у абзацы трэцім гэтай часткі;

калі прысутнасць ваеннаслужачага, які праходзіць тэрміновую ваенную службу, у сям'і неабходная.

Абставіны, у сувязі з якімі ваеннаслужачаму, які праходзіць тэрміновую ваенную службу, даецца водпуск па ўважлівых прычынах асабістага і сямейнага характару, павінны быць, як правіла, дакументальна пацверджаныя.

Артыкул 14. Права на ахову здароўя

Ахова здароўя ваеннаслужачых забяспечваецца стварэннем камандзірамі (начальнікамі) вайсковых часцей ва ўзаемадзеянні з дзяржаўнымі органамі (арганізацыямі) спрыяльных умоў ваеннай службы, быту і сістэмы мераў па абмежаванні ўздзеяння шкодных або небяспечных фактараў ваеннай службы.

Ваеннаслужачыя, суворыцы, выхаванцы вайсковых часцей маюць права на атрыманне медыцынскай дапамогі ў арганізацыях аховы здароўя, падпарадкаваных дзяржаўным органам, у якіх прадугледжана ваенная служба (далей — ваенныя арганізацыі аховы здароўя), у адпаведнасці з заканадаўствам.

Ваеннаслужачым пры адсутнасці па месцы ваеннай службы, месцы іх жыхарства (месцы знаходжання) ваенных арганізацый аховы здароўя, а таксама пры неабходнасці аказання хуткай (неадкладнай) медыцынскай дапамогі медыцынская дапамога аказваецца ў адпаведнасці з заканадаўствам у іншых дзяржаўных арганізацыях аховы здароўя (далей — цывільныя арганізацыі аховы здароўя).

Члены сем'яў ваеннаслужачых пры немагчымасці атрымаць медыцынскую дапамогу ў цывільных арганізацыях аховы здароўя забяспечваюцца медыцынскай дапамогай у адпаведных ваенных арганізацыях аховы здароўя нароўні з ваеннаслужачымі.

Грамадзяне, якія звольненыя з вайсковай службы па хваробе (стане здароўя) і маюць выслугу 20 гадоў і больш (у тым ліку ў ільготным вылічэнні), асобы старэйшага і вышэйшага афіцэрскага складу, звольненыя з ваеннай службы па ўзросце, па хваробе (стане здароўя) або арганізацыйна-штатных мерапрыемстваў (скарачэнні штатаў), і члены іх сем'яў (акрамя членаў сем'яў, названых у абзацы шостым часткі другой артыкула 3 гэтага Закона) маюць права на бясплатную медыцынскую дапамогу ў ваенных і цывільных арганізацыях аховы здароўя.

Прадугледжанае часткай пятай гэтага артыкула права на медыцынскую дапамогу даецца таксама звольненым з ваеннай службы грамадзянам, якія сталі інвалідамі па прычыне ранення (кантузіі), траўмы або калецтва, атрыманых пры абароне Рэспублікі Беларусь, пры выкананні воінскага абавязку ў дзяржавах, дзе вялося баявыя дзеянні, або іншых абавязкаў ваеннай службы, або захворвання, звязанага са знаходжаннем на ваеннай службе, незалежна ад выслугі гадоў.

Забеспячэнне лекавымі сродкамі ваеннаслужачых, якія атрымалі раненне (кантузію), траўму, калецтва або захворванне пры выкананні абавязкаў ваеннай службы, у перыяд іх амбулаторнага лячэння ў сувязі з гэтымі раненнямі (кантузіяй), траўмай, калецтвам або захворваннем ажыццяўляецца ў межах пераліку асноўных лекавых сродкаў, які зацвярджаецца Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, за кошт сродкаў адпаведных дзяржаўных органаў, у якіх прадугледжана ваенная служба.

Ваеннаслужачыя маюць права на санаторна-курортнае лячэнне і аздараўленне на ўмовах і ў парадку, вызначаных заканадаўствам.

Артыкул 15. Страхаванне ваеннаслужачых, ваеннаабавязаных на час праходжання ваенных і спецыяльных зборах, рэзервістаў пры знаходжанні на занятках і вучэбных зборах

Жыццё і здароўе ваеннаслужачых, ваеннаабавязаных на час праходжання ваенных або спецыяльных зборах, а таксама рэзервістаў пры знаходжанні на занятках і вучэбных зборах (далей — застрахаваныя асобы) падлягаюць абавязковаму дзяржаўнаму страхаванню за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту.

У выпадку гібелі (смерці) застрахаванай асобы, якая надышла па прычыне нанясення шкоды яе жыццю або здароўю ў сувязі з выкананнем ёю абавязкаў ваеннай службы, членам сям'і загінулай (памерлай) застрахаванай асобы (яе спадчыннікам) выплачваецца аднаразовая страхавая сума ў памеры 10-гадовай сумы акладу грашовага забеспячэння і надбаўкі за выслугу гадоў застрахаванай асобы. Гэтая страхавая сума выплачваецца па названых падставах таксама ў выпадку смерці застрахаванай асобы, якая надышла на працягу аднаго года пасля звальнення з ваеннай службы (заканчэння ваенных, спецыяльных, вучэбных збораў або заняткаў), інваліднасці па прычыне нанясення шкоды яе жыццю або здароўю ў сувязі з выкананнем ёю абавязкаў ваеннай службы, пацвержданай медыцынскім заключэннем, выплачваецца аднаразовая страхавая сума ў памеры двухгадовай або паўгадавой сумы акладу грашовага забеспячэння і надбаўкі за выслугу гадоў.

У выпадку гібелі (смерці) застрахаванай асобы або ўстанаўлення інваліднасці, якая надышла ў выніку ранення (кантузіі), траўмы, калецтва, захворвання, або атрымання ёю цяжкага або менш цяжкага цялеснага пашкоджання, якое не выклікала інваліднасці, лёгкага цялеснага пашкоджання пры выкананні ёю абавязкаў ваеннай службы, пацвержданых медыцынскім заключэннем, акрамя выпадкаў, прадугледжаных часткамі другой — чацвёртай гэтага артыкула, выплачваецца аднаразовая страхавая сума ў памеры:

250 базавых велічыняў — членам сям'і загінулай (памерлай) застрахаванай асобы (яе спадчыннікам);

100 базавых велічыняў — інваліду I групы;

75 базавых велічыняў — інваліду II групы;

50 базавых велічыняў — інваліду III групы;

10 базавых велічыняў — застрахаванай асобе, якая атрымала цяжкае цялеснае пашкоджанне, якое не выклікала інваліднасці;

7 базавых велічыняў — застрахаванай асобе, якая атрымала менш цяжкае цялеснае пашкоджанне, якое не выклікала інваліднасці;

5 базавых велічыняў — застрахаванай асобе, якая атрымала лёгкае цялеснае пашкоджанне.

Ваеннаслужачым, якія праходзяць тэрміновую ваенную службу, курсантам, ваеннаабавязаным на час праходжання ваенных або спецыяльных зборах, рэзервістам пры знаходжанні на занятках і вучэбных зборах пры надыходзе выпадкаў, прадугледжаных часткамі другой — чацвёртай гэтага артыкула, выплачваецца страхавая сума ў памерах, прадугледжаных для ваеннаслужачых, якія праходзяць ваенную службу па кантракце на пасадах, якія падлягаюць замяшчэнню салдатамі і сяржантамі.

Выплата страхавой сумы па адным і тым жа страхавым выпадку ажыццяўляецца за вылікам раней атрыманых страхавых сум.

У выпадку знішчэння або пашкоджання маёмасці, якая належыць застрахаванай асобе або яе блізкім, у сувязі з выкананнем ёю абавязкаў ваеннай службы застрахаванай асобе або яе блізкім выплачваецца страхавая кампенсацыя ў памеры нанесенага ўрону, але не вышэй за сапраўдны кошт знішчанай або пашкоджанай маёмасці на дзень прыняцця рашэння аб выплаце.

У выпадку калі жыццё, здароўе і маёмасць застрахаваных асобаў падлягаюць абавязковаму дзяржаўнаму страхаванню таксама ў адпаведнасці з іншымі заканадаўчымі актамі, то застрахаваным асобам, а ў выпадку іх гібелі (смерці) — іх спадчыннікам страхавыя сумы выплачваюцца па іх выбары толькі па адной падставе.

Пры ўстанаўленні асобаў, вінаватых у гібелі (смерці) застрахаванай асобы, нанесенні шкоды яе здароўю, маёмаснага ўрону застрахаванай асобе або яе блізкім, выплачаныя страхавыя сумы падлягаюць спагнанню з вінаватых асобаў.

Парадак і ўмовы выплаты страхавых сум па абавязковым дзяржаўным страхаванні застрахаваным асобам устанаўліваюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 16. Права на жыллё

Ваеннаслужачыя маюць права на забеспячэнне жылымі памяшканнямі ў парадку, вызначаным заканадаўчымі актамі.

Артыкул 17. Права на адукацыю

Ваеннаслужачыя, якія праходзяць ваенную службу па кантракце, могуць навучацца ў грамадзянскіх установах, што забяспечваюць атрыманне сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай, паслявузаўскай адукацыі, толькі ў завочнай форме атрымання адукацыі і з дазволу камандзіра (начальніка) вайсковай часці. У перыяд вучобы за імі, а таксама за афіцэрамі ў перыяд іх навучання ў дзяржаўных установах, што забяспечваюць павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўку кадраў, захоўваюцца грашовая плата і іншыя гарантыі, устаноўленыя заканадаўствам.

Ваеннаслужачыя, за выключэннем ваеннаслужачых, якія праходзяць тэрміновую ваенную службу, з дазволу камандзіра (начальніка) вайсковай часці могуць праходзіць падрыхтоўку на падрыхтоўчых курсах, падрыхтоўчых аддзяленнях, факультэтах даваўзаўскай падрыхтоўкі для паступлення ва ўстановы, што забяспечваюць атрыманне сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі.

Навучанне ў грамадзянскіх установах, што забяспечваюць атрыманне сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай і паслявузаўскай адукацыі, ваеннаслужачым, якія праходзяць тэрміновую ваенную службу, забараняецца.

Пры паступленні ва ўстановы адукацыі ваеннаслужачыя, грамадзяне, звольненыя з ваеннай службы, выпускнікі ўстановы адукацыі «Мінскае сувораўскае ваеннае вучылішча» і дзеці ваеннаслужачых маюць права на льготы ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі.

Артыкул 18. Праезд на транспарце. Паштовыя адпраўленні

Сацыяльныя гарантыі ваеннаслужачым, членам іх сем'яў, грамадзянам, звольненым з ваеннай службы, і членам іх сем'яў, суворыцам і выхаванцам вайсковых часцей па праездзе і перавозцы ўласнай маёмасці транспартам, сацыяльныя гарантыі ваеннаслужачым, якія праходзяць тэрміновую ваенную службу, звязаныя з бясплатнай перасылкай паштовых адпраўленняў, устанаўліваюцца заканадаўчымі актамі.

Артыкул 19. Звальненне ваеннаслужачых з ваеннай службы і права на працаўладкаванне

Ваеннаслужачыя маюць права на звальненне з ваеннай службы па падставах і ў парадку, вызначаным заканадаўчымі актамі.

Ваеннаслужачым пры звальненні з ваеннай службы выплачваецца выхадная дапамога ў выпадках і ў памерах, устаноўленых Палажэннем аб парадку праходжання ваеннай службы.

Пры нязгодзе ваеннаслужачых са звальненнем або падставамі іх звальнення з ваеннай службы яны маюць права на абскарджанне вышэйшаму камандаванню і зварот у суд на працягу трох месяцаў з дня, які наступае за днём заканчэння знаходжання на ваеннай службе.

У выпадку незаконнага звальнення ваеннаслужачых з ваеннай службы нанесены ім у сувязі з гэтым урон падлягае кампенсацыі ў поўным аб'ёме з улікам выплачанай выхаднай дапамогі. Пры гэтым яны аднаўляюцца на ваеннай службе ў ранейшай або роўнай пасадзе ў той жа вайсковай часці, а пры іх згодзе — у іншай вайсковай часці і забяспечваюцца ўсімі відамі забеспячэння. Ваеннаслужачым, аднаўленым на ваеннай службе, час з дня іх звальнення да даты, названай у загадзе аб аднаўленні на ваеннай службе, залічваецца ў выслугу гадоў для прысваення чарговага воінскага звання, налічэння грашовай платы і прызначэння пенсіі.

Аднаўленне ваеннаслужачых на ваеннай службе ажыццяўляецца па рашэнні вышэйшага камандавання або суда ў парадку, вызначаным заканадаўчымі актамі.

Пакрыццё ваеннаслужачым урону, у тым ліку маральнага, нанесенага незаконным звальненнем з ваеннай службы, ажыццяўляецца па рашэнні суда ў парадку, вызначаным заканадаўчымі актамі.

Грамадзянам, звольненым з ваеннай службы, устанаўліваюцца наступныя дадатковыя гарантыі:

захаванне на працягу трох месяцаў з дня, які наступае за днём заканчэння знаходжання на ваеннай службе, за грамадзянамі, якія працавалі да прызыву на ваенную службу ў дзяржаўных арганізацыях, права паступлення на працу да таго ж наймальніка на пасаду, раўнацэнную займаемай да прызыву на ваенную службу;

выдзяленне грамадзянам, звольненым пасля праходжання тэрміновай ваеннай службы і прынятым на ранейшае месца працы, аднаразовай матэрыяльнай дапамогі ў памеры не менш за адну мінімальную заработную плату;

выдзяленне грамадзянам, звольненым пасля праходжання тэрміновай ваеннай службы, першага працоўнага месца ў адпаведнасці з заканадаўствам аб працы.

Органы дзяржаўнай службы занятасці насельніцтва сумесна з дзяржаўнымі органамі, у якіх прадугледжана ваенная служба, прымаюць меры па працаўладкаванні, прафесійнай падрыхтоўцы, перападрыхтоўцы і павышэнні кваліфікацыі грамадзян, звольненых з ваеннай службы, і членаў іх сем'яў.

Артыкул 20. Права на пенсійнае забеспячэнне

Грамадзяне, звольненыя з ваеннай службы, і члены іх сем'яў маюць права на пенсійнае забеспячэнне ў парадку, вызначаным заканадаўствам.

Артыкул 21. Звароты ваеннаслужачых

Ваеннаслужачыя маюць права накіроўваць звароты ў дзяржаўныя органы і іншыя арганізацыі ў парадку, вызначаным заканадаўчымі актамі.

Артыкул 22. Абскарджанне дзеянняў (бяздзейнасці) службовых асобаў вайсковай часці

Дзеянні (бяздзейнасць) службовых асобаў вайсковай часці могуць быць абскарджаныя ў вышэйшы орган (вышэйшай службовай асобе) і (або) у суд у парадку, вызначаным заканадаўствам.

ГЛАВА 3
АБАВЯЗКІ І АДКАЗНАСЦЬ ВАЕННАСЛУЖАЧЫХ

Артыкул 23. Агульныя абавязкі ваеннаслужачых

Ваеннаслужачы абавязаны:

беспярэчна выконваць свой вайсковы абавязак, быць верным Ваеннай прысязе, беззаветна служыць свайму народу, мужна, умела, не шкадуючы сваіх сілаў і самога жыцця, абараняць суверэнітэт і тэрытарыяльную цэласнасць Рэспублікі Беларусь;

выконваць Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь і іншыя заканадаўчыя акты, у тым ліку выконваць патрабаванні статутаў Узброеных Сілаў;

выконваць загады камандзіраў (начальнікаў) беспярэчна, дакладна і ў тэрмін;

стойка пераносіць цяжкасці ваеннай службы;

пастаянна авалодваць ваеннымі прафесійнымі ведамі, удасканальваць сваю вывучку і воінскае майстэрства;

ведаць і трымаць у пастаяннай гатоўнасці да прымянення даверараныя яму ўзбраенне і ваенную тэхніку, берагчы ваенную маёмасць;

быць сумленным, дысцыплінаваным, храбрым, пры выкананні воінскага абавязку праяўляць разумную ініцыятыву;

беспярэчна падпарадкоўвацца камандзірам (начальнікам) і абараняць іх у баі, аберагаць Баявы Сцяг вайсковай часці;

даражыць вайсковай таварыскасцю, не шкадуючы свайго жыцця выручаць таварышаў з небяспекі, дапамагаць ім словам і справай, паважаць гонар і годнасць кожнага, не дапускаць у дачыненні да сябе і іншых ваеннаслужачых грубасці і здзекаў, утрымліваць іх ад недастойных учынкаў;

захоўваць правілы вайсковай ветлівасці, паводзіны і выкананне воінскага прывітання, заўсёды быць па форме, чыста і акуратна апранутым;

быць пільным, строга захоўваць дзяржаўную і службовую тайну;

выконваць іншыя абавязкі, устаноўленыя статутамі Узброеных Сілаў і іншымі заканадаўчымі актамі.

Артыкул 24. Службовыя і спецыяльныя абавязкі ваеннаслужачых

Службовыя абавязкі ваеннаслужачых вызначаюцца статутамі Узброеных Сілаў і іншымі заканадаўчымі актамі.

Ваеннаслужачыя пры нясенні службы на баявым дзяжурстве, у сутачным і каравульным нарадах, а таксама пры ліквідацыі наступстваў надзвычайных сітуацый прыроднага і тэхнагеннага характару і іншых абставінах выконваюць спецыяльныя абавязкі, устаноўленыя заканадаўчымі актамі, у тым ліку статутамі Узброеных Сілаў. Для выканання спецыяльных абавязкаў ваеннаслужачыя могуць надзяляцца дадатковымі правамі, устаноўленымі іншымі заканадаўчымі актамі.

Артыкул 25. Адказнасць ваеннаслужачых

Ваеннаслужачыя ў залежнасці ад характару і цяжкасці ўчыненых імі правапарушэнняў прыцягваюцца да дысцыплінарнай, адміністрацыйнай, матэрыяльнай, грамадзянска-прававой, крымінальнай адказнасці ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі.

ГЛАВА 4
ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

Артыкул 26. Прызнанне страціўшымі сілу некаторых заканадаўчых актаў і іх асобных палажэнняў

Прызнаць страціўшымі сілу:

1. Закон Рэспублікі Беларусь ад 13 лістапада 1992 года «Аб статусе ваеннаслужачых» (Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1992 г., № 28, ст. 497).

2. Закон Рэспублікі Беларусь ад 25 сакавіка 1993 года «Аб унясенні змянення ў Закон Рэспублікі Беларусь «Аб статусе ваеннаслужачых» (Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1993 г., № 14, ст. 137).

3. Пункт 2 раздзела I Закона Рэспублікі Беларусь ад 22 лютага 1995 года «Аб унясенні змяненняў у некаторыя заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь у сувязі з прыняццем Закона Рэспублікі Беларусь «Аб палітычных партыях» (Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1995 г., № 17, ст. 182).

4. Закон Рэспублікі Беларусь ад 22 сакавіка 1995 года «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб статусе ваеннаслужачых» (Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1995 г., № 19, ст. 232).

5. Закон Рэспублікі Беларусь ад 6 студзеня 1998 года «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь» (Ведамасці Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, 1998 г., № 2, ст. 12).

6. Артыкул 3 Закона Рэспублікі Беларусь ад 31 снежня 1999 года «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2000 г., № 5, 2/126).

7. Пункт 7 артыкула 29 Закона Рэспублікі Беларусь ад 15 чэрвеня 2006 года «Аб занятасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2006 г., № 94, 2/1222).

8. Пункт 7 артыкула 20 Закона Рэспублікі Беларусь ад 14 чэрвеня 2007 года «Аб дзяржаўных сацыяльных ільготах, правах і гарантыях для асобных катэгорый грамадзян» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2007 г., № 147, 2/1336).

9. Закон Рэспублікі Беларусь ад 16 ліпеня 2007 года «Аб унясенні змянення ў Закон Рэспублікі Беларусь «Аб статусе ваеннаслужачых» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2007 г., № 172, 2/1355).

10. Артыкул 5 Закона Рэспублікі Беларусь ад 26 снежня 2007 года «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь і прызнанні страціўшымі сілу некаторых заканадаўчых актаў Рэспублікі Беларусь і асобных палажэнняў законаў Рэспублікі Беларусь у сувязі з прыняццем Закона Рэспублікі Беларусь «Аб пытаннях страхавання» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2007 г., № 305, 2/1397).

11. Артыкул 2 Закона Рэспублікі Беларусь ад 5 студзеня 2008 года «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь і прызнанні страціўшай сілу Пастановы Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь па пытаннях грамадзянскай абароны» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 14, 2/1416).

12. Артыкул 3 Закона Рэспублікі Беларусь ад 15 ліпеня 2008 года «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь і прызнанні страціўшымі сілу некаторых заканадаўчых актаў Рэспублікі Беларусь і іх асобных палажэнняў па пытаннях жыллёвых адносінаў» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 184, 2/1505).

13. Пастанову Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 13 лістапада 1992 года «Аб увядзенні ў дзеянне Закона Рэспублікі Беларусь «Аб статусе ваеннаслужачых» (Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1992 г., № 28, ст. 498).

Артыкул 27. Меры па рэалізацыі палажэнняў гэтага Закона

Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь у шасцімесячны тэрмін:

прывесці рашэнні Урада Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з гэтым Законам;

забяспечыць прывядзенне рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, падпарадкаванымі Ураду Рэспублікі Беларусь, іх нарматыўных прававых актаў у адпаведнасць з гэтым Законам;

прыняць іншыя меры, неабходныя для рэалізацыі палажэнняў гэтага Закона.

Да прывядзення актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з гэтым Законам яны прымяняюцца ў той частцы, у якой не супярэчаць гэтаму Закону, калі іншае не ўстаноўлена Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 28. Уваходжанне ў сілу гэтага Закона

Гэты Закон уваходзіць у сілу праз дзесяць дзён пасля яго афіцыйнага апублікавання.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь
А. ЛУКАШЭНКА

4 студзеня 2010 года, г. Мінск.
№ 100 — З

КДУП ПО ОКАЗАНИЮ УСЛУГ «ЭКСПЕРТ-УСЛУГА» (организатор аукциона)
извещает о проведении 25 февраля 2010 года открытого аукциона с условиями по продаже имущества (лигнин и целлолигнин гидролизные в 10.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-18

Лот №	Наименование объекта	Краткая характеристика объекта	Начальная цена продажи (без НДС), руб.	Задаток (без НДС), руб.
1	Лигнин и целлолиг

Рыштаванні Бацькаўшчыны

ЛЕБЯДЗІНАЯ ПЕСНЯ Марыі Магдалены

Што аб'яднала Кухцічы і Вялікі кітайскі мур?

Я дакладна ведаю, што яшчэ сто гадоў таму ўсё тут было інакш. Аднак нават тое, што засталося да сённяшняга часу, дазваляе адчуць: умелі людзі жыць. Паколькі ўсё зроблена з неверагодным густам і разуменнем справы. У старадаўнім парку і цяпер дыхаецца неяк інакш, а сэрца настройваецца на іншы манер, у галаве быццам самі сабой з'яўляюцца выкшталцоныя думкі. Містыка ды і толькі! Толькі ўсё гэта, скажу я вам, зусім не містыка. Праехаўшы дзясяткі старажытных сядзіб, у большасці з іх (зразумела, у кожнай — па-рознаму) я адчуваў падобнае вечнае вяртанне да спадчыны (на жаль, у многіх выпадках страчанай). Не сталі выключэннем і Кухцічы, куды завітаў у пошуках аднаго з... цудаў свету.

Ад колішняй сядзібы засталіся напаўразбураныя флігелі.

БРАТЫ МАЦЕЙ І ГЕКТАР

Кухцічы (цяперашні пасёлак Першамайск, што на Уздзеншчыне) даволі старажытнае паселішча. Як заўжды бывае з адметнымі мясцінамі, адлік іх гісторыі звычайна вядзецца ад першых пісьмовых сведчанняў. Паводле меркаванняў розных крыніц, Кухцічы ўзгадваюцца ў дакументах з XVI стагоддзя. Першым у мястэчку пачаў абуладкоўвацца вядомы шляхецкі род Кавячынскіх. Адзін з найвядомейшых яго прадстаўнікоў — кнігавыдавец, перакладчык, рэфармацыйны дзеяч Мацей Кавячынскі. Ён вучыўся ў Вітэнбергскім універсітэце, а з канца 1550-х гадоў жыў на тэрыторыі цяперашняй Беларусі.

Быў спраўцам усіх замкаў і двароў Радзівіла Чорнага. Заснаваў порт на рэчцы Уздзе, а таксама паперню ў Нясвіжы. Актыўна ўдзельнічаў у кальвінісцкім, а пазней арыянскім руху. Разам з Сымонам Будным заснаваў у Нясвіжы вядомую друкарню, дзе выйшлі першыя на нашай зямлі выданні на беларускай мове — «Катэхізіс» і «Пра апраўданне грэшнага чалавека перад Богам». Асобныя даследчыкі сцвярджаюць: Кавячынскі перавёз з Вільні ў Нясвіж кірыліцкія шрыфты Францыска Скарыны.

А яшчэ існуе вельмі цікавая версія, якая, праўда, дакументальна не пацвярджаная. Магчыма, што вядомая Нясвіжская Біблія была выдадзена менавіта ў Кухцічах — шляхецкім гняздзе Кавячынскіх. Пасля смерці Мацея ў мястэчку гаспадарыў ягоны брат Гектар, які пасля быў старостам Радзівілаў на Валыні. Праз колькі часу тут уладкаваўся сын Мацея Энах. Яго дзеці — апошнія з роду Кавячынскіх. Пры Крыштофе (які, між іншым, быў падкаморым менскім) Кухціцкі кальвінскі збор пераўтвораны ў капліцу. Дарэчы, тады заснаваны Уздзенскі касцёл і тутэйшая каталіцкая парафія.

У другой палове XVII стагоддзя Кухцічы пераходзяць ва ўласнасць аднаго з найстаражытнейшых беларускіх родаў — Завішаў. Яны гаспадарылі тут больш чым 200 гадоў і зрабілі для гэтых мясцін нямала. Зразумела, пераўтварылі на свой густ сядзібу. Але кальвінскі збор, вядома ж, не чапалі і клапатліва захоўвалі.

Завішы не адракаліся ад гістарычнай спадчыны і стараннa яе вывучалі. Мабыць, так ужо было наканавана, што мястэчка стане вядомым таксама і праз прадстаўнікоў гэтага слыннага роду. Тут гаспадарылі шмат якія знакамітыя асобы. Напрыклад, захаваліся сведчанні аб знаходжанні ў Кухцічах Пятра I. Крыштоф Завіша (якога, праўда, у той час у маёнтку не было) запіша ў свой дзённік са словаў жонкі, што цар быў у гуморы, піў і танцаваў, выказваў задавальненне добрым прыёмам і гаворкай. Па ўсім відаць, спадабаўся Раманаву гэты маёнтак.

ДЗІЎНЫЯ ПАНЫ

Гаспадары Кухцічаў заўсёды нечым адрозніваліся ад іншых магнатаў. Так, у сярэдзіне пазамінулага стагоддзя мястэчка было ва ўласнасці Яна Казіміра Завішы. Ён атрымаў выдатную адукацыю і імкнуўся развіваць навукі. У прыватнасці, археалогію. Ян Казімір рэгулярна наладжваў навуковыя экспедыцыі, падчас якіх праводзіў раскопкі. Археалагічныя помнікі наносіў на спецыяльную карту. А даследаваць у гэтых мясцінах насамрэч было што — курганы, могільнікі, гарадзішчы, стаянкі старажытных людзей. Завіша адсочваў, як праходзіла засяленне ўзбярэжжа Нёмана (вядома, што менавіта на цяперашняй Уздзеншчыне вытокі гэтай вялікай ракі), а таксама Віліі і Дняпра.

— Вядома ж, па-за ўвагай рупліўцы не заставаліся і гандлёвыя сувязі праз «рачныя шляхі» і моры, — адзначае галоўны захавальнік фондаў Уздзенскага краязнаўчага музея Ірына Віяленцій. — Ян Казімір вывучаў тэму даволі сур'ёзна і выходзіў на ўзаемадзеянне славянскіх плямёнаў са старажытнымі Грэцыяй і Рымам. Ён стаў пачынальнікам вывучэння эпохі каменнага веку на тэрыторыі Беларусі і выступаў з цікавымі дакладамі на шэрагу навуковых міжнародных канферэнцый. Так што гэтае імя было добра вядомае ў многіх краінах. Ян Казімір таксама быў і выдатным этнографам, імкнуўся даследаваць і захаваць для нашчадкаў культурныя здабыткі продкаў.

Кажуць, што ў стасунках з вясковцамі не цураўся простай мовы — з задавальненнем размаўляў па-беларуску. Што і казаць — дзіўны пан, дзеянні якога, між іншым, выклікалі і выклікаюць вялікую павагу. Любоў да роднай зямлі і людзей, якія там жывуць, Ян Казімір імкнуўся данесці да сваіх дзяцей. Праўда, яго жонка даверыла выхаванне дачок французскім і англійскім гувернанткам. Вынік такога спалучэння атрымаўся даволі нечаканы...

Княгіня Марыя Ева Магдалена-Іосіфа Эльджбета Апалонія Катажына з'явілася на свет 8 ліпеня 1861 года. Атрымала выдатную адукацыю, шмат падарожнічала па Еўропе і разам з бацькамі жыла ў Варшаве. Аднак бацькоўскія ўрокі не прайшлі задарма — дзяўчыну вельмі цягнула ў радавыя маёнткі на беларускіх землях, у тым ліку ў Кухцічы. Разам з сястрой яны часта сюды прыязджалі. Тут, здаецца, і наваколле больш прыгожае, і кветкі ў сядзібнай аранжарэі больш духмяныя, і, пэўна, галоўнае, — людзі з чыстымі сэрцамі і яснымі вачыма.

Марыя Магдалена пераўтварылася ў сапраўдную прыгажуню, на яе заглядаліся лепшыя вяліка-свецкія жаніхі, якія лічылі за гонар стварыць сям'ю з такой жанчынай. Пашанцавала графу Людвіку Красінскаму. Гэта быў няроўны шлюб — муж быў амаль на трыццаць гадоў старэйшы за жонку. Між тым, Людвіка Красінскага многія лічылі адметнай асобай. Перш за ўсё з-за таго, што ён быў моцным і прагрэсіўным гаспадаром. У яго ўладаннях працавала сучасная тэхніка, а конезавод Красінскага лічыўся ўзорным. Захапляўся граф і мастацтвам, меў прыстойную калекцыю антыкварыяту. Праз колькі часу пасля вяселля Марыя Магдалена нарадзіла дачку, якую назвалі Людвікай. Аднак шчасце было азмрочана смерцю любімага бацькі, які праз год пасля нараджэння ўнучкі пайшоў з жыцця. У спадчыну да Марыі Магдалены перайшлі маёнткі Кухцічы і Жорнаўка, а таксама некалькі сядзібаў у Польшчы.

«ЛІЧУ СЯБЕ БЕЛАРУСКАЙ»

Пасля смерці мужа Марыя Магдалена разам з дачкой з'язджаюць у Кухцічы і Жорнаўку. Гаспадарку жанчына трымала не горш іншых магнатаў, а можа нават і лепш. Паколькі заўжды імкнулася дапамагчы сялянам у вырашэнні іх надзённых пытанняў — выплачвала пенсіі, дапамогі на навучанне і г.д. Карацей кажучы, была прагрэсіўнай. Актыўна пачала займацца і філантрапічнай дзейнасцю. Адчыніла шэраг прытулкаў для дзяцей-сірот, фундавала будаўніцтва касцёла ў Варшаве, а таксама прыстанішча Маўрыцыя Чарноцкага і шпіталя таварыства дабрачыннасці ў Мінску.

Разам з дачкой шмат падарожнічала па Еўропе — наведала Італію, Францыю. Падчас вандроўкі ў «туманны Альбіён» пазнаёмілася з князем Мікалаем Радзівілам. Сапраўды сустрэла свой лёс. Мікалай Вацлаў быццам нарадзіўся не ў той час — сучаснікі адзначалі, што з яго б атрымаўся выдатны першаадкрывальнік ці заваёўнік. Казалі, што князь быццам бы сышоў з партрэта XVI стагоддзя. Капітан рэзерву 52-га драгунскага палка ўзяў удзел ва ўсіх значных баталіях свайго часу — англа-бурскай і руска-японскай войнах, змагаўся і на Балканах. Так што Радзівіл быў ва ўсіх адносінах неардынарнай асобай. Іх знаёмства з Марыяй Магдаленай перарасло ў гарачае каханне. Не стала перашкодай нават тое, што Мікалай быў маладзейшы на 19(!) гадоў. Хутка яны павянчаліся ў каралеўскай Баварскай капліцы ў Лондане.

Пасля пасяліліся ў Кухцічах, прычым Радзівілу гэтыя выдатныя мясціны дужа спадабаліся. Князь захапіўся збіраннем фальклору — ён з захапленнем запісваў народныя песні, паданні, абрады. Марыя Магдалена не адставала ад мужа: адчыніла ў сваіх вёсках беларускія школы, утварыла таварыствы цвярозасці.

— Яна аказвала дапамогу студэнтам Віленскага і іншых універсітэтаў. Зрабіла яшчэ шмат чаго адметнага, — заўважае Ірына Віяленцій. — Дарэчы, сярод усяго іншага вызначылася і падтрымкай перыядычных беларускамоўных выданняў: выдавецтва «Загляне сонца і ў наша аконца» ў Пецярбургу і Беларускага выдавецкага таварыства ў Вільні, газеты «Наша ніва», часопіса «Belarus» і г.д. Аказвала дапамогу падчас выдання першых кніг Максіма Багдановіча, Канстанцыі Буйло, Ядвігіна Ш.

У знак удзячнасці кнігавыдаўцы змясцілі на тытульным аркушы гэтых знакавых для кожнага беларуса кніг выяву герба роду Завішаў «Лебедзь». Пагадзіцеся, атрымалася вельмі сімвалічна. Тым больш, што гэта была прынцыповая пазіцыя Марыі Магдалены, якая на жыцці лічыла сябе менавіта беларускай (аб чым, дарэчы, публічна заявіла ў 1912 годзе на старонках газеты «Мінскае рускае слова»). Праўда, яе сямейнае шчасце перакрэсліла Першая сусветная вайна — Мікалай Радзівіл, вядома, не мог застацца ў баку ад гэтых падзей. Ён уступіў у войска і напрыканцы 1914 года загінуў ва Усходняй Прусіі. Спачуванні Марыі Магдалене выказалі многія вядомыя асобы таго часу (быў вянок і ад Цёткі). Фундатарская дзейнасць (якую я сімвалічна назваў бы лебядзінай (узгадваючы родавы герб) песняй) працягвалася і да, і пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Як заўважыла Ірына Віяленцій, у 1918 годзе з глыбокім смуткаваннем пакідала Марыя Магдалена сваю кухціцкую сядзібу. Пераехала ў Варшаву, а пасля ў Коўна (дзе, дарэчы, атрымала «Вялікі крыж Гедыміна»), у 1932 годзе перабралася ў Швейцарыю. Там у кляштары дамініканак, што ў горадзе Фрыбургу, 65 гадоў таму (6 студзеня 1945-га) Марыя Магдалена памерла...

Магдалена Радзівіл (на карціне невядомага мастака разам з дачкой Людвікай) заўжды адчувала сябе беларускай.

P.S. ***Ці ўдасца захаваць скарбы Кухцічаў?***

Ад палацава-паркавага комплексу ў Кухцічах цяпер, на жаль, мала што засталося. Сам палац, у якім, між іншым, ужо ў 1909 годзе быў тэлефон, не захаваўся. У напаўразбураным стане два флігелі ды старажытны парк, які даглядаюць навучэнцы ліцэя, які размясціўся на месцы колішняй сядзібы. Вось, пэўна, і ўсе гістарычныя каштоўнасці. Хоць не, зусім забыўся пра галоўную адметнасць — старажытны кальвінскі збор, дзе, дарэчы, быў пахаваны і Мікалай Радзівіл.

— Будынак уключаны ў каталог міжнароднага фонду «Помнікі свету», — кажа Ірына Віяленцій. — Тут узгадваюцца 100 аб'ектаў гістарычнай спадчыны, якія магчыма беспаваротна страціць, калі не прыняць належных мераў па іх захаванні. Разам з кальвінскім зборам у пасёлку Першамайск — легендарны Вялікі кітайскі мур і егіпецкая даліна фараонаў. Можа такім чынам удасца прыцягнуць увагу да ўнікальнага месца — Кухцічаў, каб зберагчы тутэйшыя скарбы для нашых нашчадкаў?

Такім чынам, праблемнае пытанне дасюль не знайшло адпаведнага вырашэння. Застаецца спадзявацца, што сітуацыя ўсё ж зменіцца да лепшага.

Мікалай ЛІТВІНАЎ,
Уздзенскі раён.
Фота аўтара і з архіва.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.21	16.17	7.56
Віцебск —	8.17	16.00	7.43
Магілёў —	8.11	16.07	7.56
Гомель —	8.01	16.09	8.08
Гродна —	8.35	16.33	7.58
Брэст —	8.29	16.41	8.12

Месяц

Маладзік 15 студзеня.
Месяц у сузор'і Казярога.

Імяніны

Пр. *АБРЭЗАННЕ ГАСПОДНЯЕ, Аляксандра, Васіля, Вячаслава, Івана, Мікалая, Міхаіла.*

К. *Марыны, Ніны, Гіляра, Фелікса.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



14 студзеня

1885 год — 125 гадоў таму нарадзіўся Юрый Тарыч, беларускі і расійскі кінарэжысёр, сцэнарыст. Заснавальнік беларускага кіно. У 1905 годзе за рэвалюцыйную дзейнасць высланы ў Табольскую губерню, дзе працаваў акцёрам правінцыйных тэатраў. З 1918 года — акцёр і рэжысёр маскоўскіх тэатраў, пазней стаў выступаць як сцэнарыст і рэжысёр кіно. У 1926 годзе зняў першы беларускі мастацкі фільм «Лясная быль».

1878 год — вынаходнік Аляксандр Бел прадэманстраваў першы тэлефон англійскай каралеве Вікторыі.

«Зайздроснікі паміраюць, але зайздрасць — ніколі».
Жан Мальер (1622—1673), французскі камедыёграф, тэатральны дзеяч, акцёр.

СВЯТОЕ ВАСІЛЛЕ НОВЫ ГОД РАСПАЧЫНАЕ

Адначасова са святкаваннем другой куцці 14 студзеня Праваслаўная Царква адзначае святое Васілле — дзень смерці аднаго з заснавальнікаў хрысціянскага руху, стваральніка шматлікіх манастыроў Васіля Вялікага Кесарыйскага. У народнай свядомасці склалася так, што святы Васіль пачаў лічыцца ахоўнікам свіней. У сувязі з гэтым свята атрымала назву «свінога», а традыцыя патрабавала прынесці ў гэты дзень святому ахоўніку ахвяру — «кесарыйскае» парася. Яно і было самым галоўным кампанентам абрадавай ежы першага дня старога Новага года. Акрамя таго гаспадыні выпякалі ў гэты дзень печыва ў выглядзе фігурак кароў, свіней і авечак.

● Свінагадоўля сярод беларусаў займала хоць і не вядучае, але і далёка не апошняе месца ў гаспадарчай дзейнасці. Пра гэта сведчыць цэлая сістэма спецыяльных ведаў, якая ахоплівае разнастайныя спектры жывёлагадоўлі.

● Пра тое, якой будзе гаспадарка, клапаціліся яшчэ да таго моманту, як купляць маладняк. У народным асяродку існавала меркаванне, што дабрабыт падворка цалкам залежыць ад важнага касмічнага фактара — фазы Месяца, падчас якой адбывалася закладка хлява. Спрыяльным лічыўся растучы Месяц («маладзік») і асабліва час напярэдадні поўнага Месяца. Першы вянец новабудоўлі вязалі менавіта ў гэтыя дні, каб у хляве заўсёды было шмат свойскай жывёлы.

● Існавала павер'е: калі хоць бы ў адзін вянец хлява пакласці бервяно са старога млына, то свінні будуць весціся пастаянна.

● Каб у гаспадарцы добра вялася жывёла, неабходна было задобрыць гаспадара падворка і хлява — хлеўніка. На тым месцы, дзе будуць дзверы, абавязкова закопвалі ахвяраванні: рогі, капыты, косткі свойскай жывёлы. У Столінскім раёне хлеўніку ў якасці ахвяры рабілі незвычайны падарунак — чарапаху.

● Каб свойская жывёла добра набірала вагу, гаспадыні імкнуліся на ўсе каляндарныя і сямейныя святы наразаць сала, каўбасы і смажаніну вялікімі кавалкамі.

● Знаўцы жывёлагадоўлі раяць для працягу племені пакідаць таго парсюка, у якога хвост трымаецца уверх, а вось для развядзення парсюкоў у хатніх умовах абіралі свінню з васьмю саскамі.

● Вельмі непажаданым лічыўся продаж тых парсючкоў, якія з'явіліся на свет у першым прыплодзе.

● У першыя тры дні ні ў якім разе нельга пералічваць народжаных парсючкоў, паказваючы на іх пальцам. У адваротным выпадку яны ўсе памруць.

● У этнаграфічнай літаратуры можна знайсці парады, якія датычацца вызначэння найбольш прыдатнага часу для забівання свіней. Калі свінню рэзаць на новы Месяц, сала будзе белым, калі ж на «стары», яно пажоўкне.

● Ні ў якім выпадку нельга забіваць свіней у той дзень, на які прыпадалі апошнія Пакровы.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнемся!

11 студзеня самыя буйныя натоўпы людзей, як правіла, назіраліся каля банкаматаў.

☺

Дзеці — кветкі жыцця :)

Унук дзеліцца сваімі планамі з мамай:

— Пайду разбуджу бабулю, спытаюся, калі яна прачнецца.

☺

Нядаўна ў джунглях Амазонкі было выяўлена племя, мужчыны якога здольныя развіваць хуткасць да 60 жанчын у гадзіну. Гэта ўсё, што паспела паведаміць наш карэспандэнт Алена Салаўёва!

☺

— Што такое даць па карку?

— Гэта спосаб перадачы інфармацыі ад аднаго пакалення іншаму.

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Крынічка

Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81 № 1 (333)

Экзотыка ў агародзе

Апошнім часам у наш ужытак увайшлі не толькі іншамоўныя словы, але і расліны, якія былі, відаць, у калекцыі хіба што Батанічнага саду. Але зараз сярод нашых чытачоў ёсць аматары заакіянскіх раслін, якія знаходзяць агульныя інтарэсы ў садова-агароднай справе і абменьваюцца навінкамі адзін з адным, часам ведаючы пра калегу толькі па тэлефонных званках і, натуральна, па пасылках гэтай экзотыкі.

Вось і наш чытач з Карэліцкага раёна Мікалай ІВАНОЎ просіць расказаць больш падрабязна пра расліну сараха, якую яму прыслаў яго калега з Віцебскай вобласці.

Сараха ядомая ці агароднінная пакуль яшчэ мала распаўсюджаная культура паслёнавых. Родам з Паўднёвай Амерыкі. Знешне нагадвае ўсім вядомы паслён чорны. Куст вышынёй да 30 см, раскідзісты, пакрыты пушком. Галінкі растуць як у перцу ці фізалісу. Кветкі даволі своеасаблівыя, рэдка такія можа сустрэць у гэтай сям'і: да 1 см у дыяметры, жоўта-зялёныя. Спелыя ягады чорныя з блакітным васковым налётам, па памеры, форме, колеры і смаку нагадваюць чарніцы. Пры выспяванні асыпаюцца з куста. Няспелыя плады есці не варта, яны нясмачныя. Калі ў перыяд выспявання стаіць дажджлівае і пахмурнае надвор'е, то ягады атрымліваюцца прэснымі. Насенне дробнае, менавіта яно надае ягадзе прыемны арэхавы смак, таму ягады сарахі лепш ужываць у свежым выглядзе. Вельмі прыемна, калі на працягу другой паловы лета ёсць ягада, якая замяняе чарніцы. Напрыклад, вырасціць на ўчастку чарніцы ці садовыя буйнаплодныя буякі — справа даволі клапатлівая: патрабуецца спецыяльная кіслая тарфяная глеба, чарніцы і буякі балотныя — малаўраджайныя. А вось сараха да самых замаразкаў цвіце і пладаносіць, даючы да 1 кг пладоў з квадратнага метра.

Гэта культура адкрытага грунту, але калі яе пасадзіць у цяпліцу (любую), то ў халоднае дажджлівае лета там спеюць больш салодкія і смачныя плады. Вырошчваецца расадай, высяваць трэба ў сярэдзіне сакавіка. Перыяд ад усходаў да спелых пладоў, у залежнасці ад надвор'я, — 100—120 дзён. Расада вырошчваецца як у тамата. Пры пікіроўцы, перасадцы, пасадцы на пастаяннае месца сцябло заглыбляецца да ніжняга ліста, паколькі вельмі лёгка ўтвараецца прыдаткавая каранёвая сістэма. Пасля пасадкі раслін на пастаяннае месца апора не патрэбная, але для зручнасці збору ягад можна падвязаць галоўнае сцябло да шпалеры.

Для паскарэння выспявання пладоў лепш выдаляць усе бакавыя парасткі, якія размешчаны ніжэй за першую развілку, а ў пачатку жніўня прышчыкнуць усе кропкі росту. Сараха слаба пашкоджваецца фітафтарозам.

Пра тое, якая карысць ад гэтай расліны, чытайце ў найбліжэйшых выпусках рубрыкі.

Абрыкос па-беларуску (працяг)

Абрыкос у Беларусі вядомы з XVIII стагоддзя. Тым не менш распаўсюджаны ён пераважна ў садаводаў-аматараў і не толькі ў паўднёвых раёнах.

Расліна валодае генетычна абумоўленай высокай марозаўстойлівасцю і лёгка пераносіць паступовае зніжэнне тэмпературы да мінус 30 градусаў. Самая згубная з'ява — рэзкія перапады тэмпературы. Перыяд глыбокага пакою ў абрыкоса кароткі і заканчваецца ён у снежні-студзені. Пры дастатковай суме дадатных тэмператур ён можа зацвісці ў лютым, што і адбываецца ў самых паўднёвых рэгіёнах яго вырошчвання. Вось чаму набухлыя кветкавыя пупышкі, самі кветкі і маладыя завязі так часта пакутуюць ад вяртання веснавых замаразкаў. У нашым рэгіёне заўчаснае развіццё стрымліваецца нізкай тэмпературай, і вясной у час цвіцення (у канцы красавіка—пачатку мая) расліны амаль не пашкоджваюцца. Аднак зімовыя адлігі правакуюць пачатак біяхімічных працэсаў і нават структурных зменаў у тканках. Рэзкае зніжэнне тэмпературы адразу за адлігай прыводзіць да пашкоджання ў першую чаргу кветкавых пупышак як найбольш слабых органаў. Ступень урону залежыць ад велічыні і хуткасці перападу тэмпературы. Такім чынам, частковая або поўная гібель кветкавых пупышак адбываецца менавіта на працягу зімы, што і з'яўляецца адной з галоўных прычын нерэгулярнасці плоданашэння. Асабліва баяцца перазімоўкі маладыя расліны ў першыя гады жыцця: яны вызначаюцца моцным і працяглым ростам, не паспяваюць ператварыцца ў дрэвы да надыходу маразоў, і ў выніку не адраўнелыя парасткі вымярзаюць.

Для Беларусі, асабліва для паўднёвых раёнаў, вучоныя раяць беларускія гатункі абрыкосу Знаходка і Спадчына. Аматарам-садаводам у цэнтральных і паўночных раёнах яны раяць размнажаць лепшыя мясцовыя формы альбо завозіць з Прыбалтыкі. Паўднёвыя гатункі і іх сеянцы гінуць або моцна пашкоджваюцца ў першую ж суровую зіму. Трэба сказаць, што беларускія вучоныя праводзяць селекцыйную работу па вывядзенні новых гатункаў абрыкосу не толькі для паўднёвых раёнаў.

У Беларусі абрыкос лепш за ўсё ўдаецца на лёгкіх, урадлівых, даволі вільготных глебах. Тарфяна-балотныя, цяжкія гліністыя, з лішняй вільготнасцю глебы непрыдатныя. На прысядзібным участку выбіраюць цёплае, абаронене ад халодных вятроў, сонечнае месца.

Як і іншыя костачкавыя пароды, абрыкос размнажаюць вегетатыўным шляхам і насеннем. Лепшы падвой — сеянцы абрыкосу. З мясцовымі формамі алычы дрэнная сумяшчальнасць. Для пасадкі выкарыстоўваюць аднагадовыя прышчэпленыя саджанцы або двух-,трохгадовыя саджанцы. Лепшы час пасадкі — ранняя вясна. Адлегласць паміж дрэвамі 3—5 м. Фарміруюць дрэва так, як і сліву, але вышыня штамба не больш як 50 см. У перыяд плоданашэння варта абмежавацца санітарнай абрэзкай, а ў астатнім догляд раслін звычайны.

Для нармальнага росту і паўнацэннага развіцця абрыкос мае патрэбу ў рэгулярных палівах. Абавязкова паліваюць у час пасадкі, потым у маі, калі гэты месяц выдасца сухім, а ў абрыкосу ў гэты час адбываецца інтэнсіўны рост. Абавязковыя палівы за 2—3 тыдні да выспявання пладоў, гэта дае магчымасць атрымаць больш буйныя плады. У другой палове лета палівы моцна скарачаюць, а пры дажджлівым надвор'і іх спыняюць зусім, каб не справакаваць непатрэбны рост парасткаў.

На зіму да ствалоў прывязваюць лапнік іголкамі ўніз — гэта засцеражэ дрэвы ад зайцоў. Непажадана закрываць дрэвы руберойдам, поліэтыленам, капронавымі панчохамі ці іншым матэрыялам, які перашкаджае паветраабмену (можа выправаць кара). Вельмі карысна позна ўвосень, калі пройдуць усе восеньскія дажджы, пабяліць ствалы і буйныя галіны садовай пабелкай. Гэта засцеражэ дрэвы ад сонечных апёкаў, якія звычайна бываюць у сакавіку, але могуць здарыцца і ў лютым, нават у студзені. Карысна дабавіць у пабелку крыху меднага купарвасу.

Практыка паказвае, што цёплае і сухое лета садзейнічае добрай закладцы пладовых пупышак будучага ўраджаю, але садавод павінен зрабіць усё магчымае, каб атрымаць гэты ўраджай. Пасля дажджлівага і халаднаватага лета трэба падумаць аб тым, як захаваць дрэвы здаровымі, як забяспечыць ім умовы для паспяховай зімоўкі. Пры працяглай і цёплай восені ў абрыкосавых дрэў назіраецца рост парасткаў. Нават пры мяккай зіме ў гэтым выпадку існуе верагоднасць падмярзання дрэнна выспелых парасткаў, кветкавых пупышак і драўніны. Каб гэтага пазбегнуць, са жніўня пачаць паліваць дрэвы растворам попелу, які будзе садзейнічаць спыненню росту парасткаў і іх больш хуткаму выспяванню. Пад маладыя дрэвы не трэба ўносіць шмат азотных угнаенняў, асабліва ў другой палове лета.

«Градка» ў кватэры

Многія аматары зяленіва ўжо да Новага года маюць агародніну з хатняй градкі, размешчанай на падваконні. Для гэтага выкарыстоўваюць дашчаныя скрынкі рознай формы, пластмасавыя ванначкі, а таксама розныя кветкавыя вазоны, у тым ліку папяровыя. Вышыня іх павінна быць не менш за 10 см.

Для зімовай выганкі прыдатныя цыбуля-рэпка, пятрушка, сельдэрэй, кроп. У лютым можна пачынаць выганку сталовых буракоў, сеяць ліставую салату, у сакавіку — салодкія і вострыя перцы, насенне памідораў на расаду.

Для хатняга «агарода» рэкамендуецца выбраць найбольш светлыя месцы каля акна, якое выходзіць на поўдзень і ўсход, аднак для ценевынослівых культур — цыбулі, пятрушкі, сельдэрэю, а таксама пры позніх тэрмінах пасадкі падыходзіць заходні і нават паўночны бок.

У склад глебавай сумесі могуць уваходзіць нізінны або вярховы торф, перагной або агародная зямля, пілавінне або буйназярністы пясок. Пры адсутнасці торфу сумесь можна скласці інакш: адна частка дзярновай зямлі, адна перагною з дабаўленнем 1/5 рачнога пяску ці драўніннага пілавіння.

На кожнае вядро глебавай сумесі рэкамендуецца ўнесці 2/3 запалкавага пачка мачавіны, па два пачкі суперфасфату і сернакіслага або адзін пачак хлорыстага калію. Пачак драўніннага попелу забяспечвае расліны мікраэлементамі.

Прасцей за ўсё вырасціць зялёную цыбулю. Каб вывесці цыбуліны са стану спакою, трэба адрэзаць шыйку і трымаць іх суткі ў цёплай вадзе (35—40 градусаў). Мэтазгодна саджаць у грунт шчыльна адна да адной.

Затым яе злёгку прысыпаць зямлёй і паліваць вадой, нагрэтай да 40 градусаў. Першыя 10 дзён святло цыбулі не патрэбна — было б цёплае месца. А потым скрынку паставіць на падваконне і паліваць цёплай вадой 3 разы на тыдзень.

Можна выганяць цыбулю і ў талерках, зрабіўшы кардонныя кружкі для цыбулін. У гэтым выпадку зямля не патрабуецца, патрэбна толькі вада.

Агава — лекарка

Агаву амерыканскую нярэдка можна сустрэць на вокнах аматараў кветак. Многія нават не здагадваюцца, які доктар знаходзіцца ў іх дома. Спрактыкаваныя лекары лічылі, што агавай можна лячыцца наступным чынам.

Вараны настой ліста ачышчае страўнік і кішкі. Парашок з лістоў расліны (на кончыку нажа) дапамагае пры хваробах печані і страўніка.

Агава, завараная разам з палыном, як казалі некалі лекары, выганяе вадзяністы дрэнныя сокі, ад якіх можа ўтварыцца вадзянка. Гэты настой паляпшае страваванне.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 159. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12